НАЧНЫЯ ЗАРНІЦЫ

Аповесць другая

I

Саша расплюшчыла вочы, прыслухалася, і ўсмешка заіскрылася ў яе вялікіх, крыху стомленых вачах. Болю не было. Упершыню пасля родаў яна адчула сябе здаровай і бадзёрай. Як бы не верачы свайму адчуванню, яна пацягнулася, сціснуўшы кулакі, закінула рукі за галаву. Зноў са страхам прыслухалася. Ад гэтай маленькай зарадкі адчула сябе яшчэ лепш. Яна ажно засмяялася. Але ўспомніла пра суседак па палаце, што бестурботна спалі, схамянулася і ўжо прыслухалася не да сябе, а да навакольнага. За акном весела шчабяталі ластаўкі. Яны таксама толькі што прачнуліся і недзе на вышках, пад страхой, пакінулі свае цёплыя гнёзды і сваіх маленькіх. Чуваць, як яны пішчаць... А ці не плача за сцяной, у дзіцячай, яе дачка, яе маленькая Алёнка? Уявіла яе, малюсенькую, з ружовенькім тварыкам, у якім, аднак, угадваліся Пецевы рысы (Аня, прыйшоўшы ў бальніцу, сказала: «Уся ў тату»), і сэрца забілася часта-часта, дзіўнае, незнаёмае дагэтуль хваляванне ахапіла маладую маці. Вельмі хацелася ўстаць і пайсці паглядзець на Алёнку. Але людзі яшчэ спяць. Адны ластаўкі прачнуліся... Не, і людзі не спяць. Недзе далёка, на краі мястэчка, меладычна заспявала труба пастуха. Аднак у бальніцы яшчэ цішыня, нават не чуваць, каб хадзіла дзяжурная сястра.

Саша зноў закінула рукі за галаву, ухапілася за ложак, прыўзнялася, напружваючы мышцы жывата. Раз, другі... Прыслухалася. Не, болю няма. Яна зусім здаровая і сёння ж папросіць Марыю Сяргееўну выпісаць яе, каб не выпісвацца

заўтра, бо кажуць, што панядзелак — нешчаслівы дзень. А сёння — нядзеля, сёння абавязкова прыйдзе Аня, і яны разам пойдуць дадому па знаёмай палявой дарозе, паўз высокае жыта, якое ўжо, напэўна, налілося.

Раптам яна ўбачыла на белай сталі сонечны прамень — маленькую ружовенькую палоску ў самым куце. Узыходзіла сонца.

«А Пеця пісаў у апошнім пісьме, што ў іх там, у Мурманску, сонца ўжо не заходзіць. Дзень і дзень,— успомніла яна і ўсміхнулася.— А гэта нецікава. Сумна. Калі ўзыходзіць сонца — гэта так хораша».

Прамень на сталі шырыўся, бляднеў, паласа святла спаўзла на сцяну. Саша заварожана глядзела на яе і ўспамінала мужа. «Пеця, любы мой... Слаўны ты мой.— Ніколі ў вочы не называла яна яго так ласкава, так пяшчотна.— Калі ж ты прыедзеш? Калі ўбачыш сваю дачку? Прыязджай хутчэй, Пеця! Ты прыедзеш, праўда?»

Калі пасля родаў яна кепска сябе адчувала, добрая Марыя Сяргееўна хацела даць яму тэлеграму. Але Саша не захацела. Не, яна хоча сустрэць яго здаровай. З дачкой на руках яна выйдзе на тую ж дарогу, і на тым месцы, дзе развіталіся, яны сустрэнуцца.

На бледна-сіняй сцяне, на белых дзвярах палаты ўжо вялікі сонечны квадрат з адбіткамі рамы. Сонца ўзышло.

Саша не вытрывала, скінула лёгкую коўдру, устала і, гладзячы свае набрынялыя грудзі, падышла да акна. Якое сіняе, яснае неба! І Дняпро які спакойны, павольны! Бальніца стаіць на высокім беразе, над самай кручай, і Дняпро — вось ён, унізе, да сярэдзіны ў цені зарэчнага лесу, а бліжэй — у іскрах сонца.

Глянуўшы на лес, Саша зноў успомніла Пятра. Успомніла, як аднойчы, калі яны не былі яшчэ жанатыя, ён прыраўнаваў яе да настаўніка Лялькевіча і, узлаваны, пайшоў праз гэты лес проці ночы.

«Дурненькі мой... Ніхто мне не трэба, акрамя цябе. Цябе чакаю... Цікава, што ты робіш у гэты час? Спіш? Сёння я дам табе тэлеграму, што выпісалася з бальніцы... Парадуйся разам з намі».

Прачнулася адна з суседак па палаце, таксама маладая жанчына. Працерла кулакамі вочы.

— Вы не спіце? Баліць? — спытала яна ў Сашы.

Ад моцнага адчування шчасця Сашы захацелася каго-небудзь прыласкаць. Яна пагладзіла ўскудлачаныя за ноч валасы жанчыны.

— Не, не баліць, Клава. Мне хораша.

— А калі хораша, то спіце. Яшчэ рана.— І суседка, пазяхнуўшы, павярнулася на другі бок, тварам да сцяны.

Саша з усмешкай паправіла ёй коўдру. Яна дастала з тумбачкі грэбень і пачала прычэсвацца. Развязала стужку, якой валасы былі перавязаны на ноч, і яны рассыпаліся па плячах, упалі на грудзі. Саша, любуючыся, перабірала іх рукамі. Яшчэ год назад яна падстрыглася. Але калі выйшла замуж, Аня сказала, што цяпер хадзіць падстрыжанай непрыгожа, і Саша пачала адпускаць валасы. Цяпер яны ўжо доўгія і вельмі падабаюцца ёй.

Труба пастуха заспявала ўжо зусім блізка. Замукалі каровы. Вясёлае, гарэзлівае, з рознымі адценнямі — то ласкава-запрашальнае, то пагрозліва-загаднае — «выга-аня-яй!» палохала ластавак. Яны з крыкам кідаліся ад бальніцы ў бок Дняпра і лёталі нізка над вадой, адчуваючы, відаць, сябе там у большай бяспецы.

«Вось жа дзярэ горла,— з бяскрыўднай няўхвалай падумала Саша пра пастуха.— Дзяцей пабудзіць...»

А на самай справе ёй хацелася, каб Ленка прачнулася. Тады яна пайшла б у дзіцячую, узяла б яе на рукі, пачала карміць, а то ад малака ажно баляць грудзі.

На вуліцы галасы жанчын: суседкі, выгнаўшы жывёлу, перакідваюцца першымі словамі. Вось і голас Марыі Сяргееўны — яна таксама выгнала сваю карову. Дзіўная жанчына! Трымае карову, даглядае, турбуецца, а ўсё малако аддае ў бальніцу, для хворых. Саша ганарыцца сваёй дружбай з Марыяй Сяргееўнай. Дружба гэтая пачалася два гады назад, як толькі Саша прыехала сюды на працу. Галоўурачу куставой бальніцы з першых дзён спадабалася маладая фельчарыца, сціплая і працавітая. Але асабліва сардэчнай стала іх прыязнасць, калі Саша даведалася, што сын Марыі Сяргееўны служыць разам з Пятром, «у адным падраздзяленні», як яны пішуць, захоўваючы ваенную тайну. Калі яна спытала ў Пеці, той напісаў, што Сеня Пясоцкі — яго лепшы

друг, яны нават аднойчы пасля адбою атрымалі па нараду за размову. У сардэчных пісьмах яна пачала часцей, чым раней, прасіць яго, «свайго малога хлапчука», каб ён вёў сябе разумна і не рабіў глупстваў. Ёй вельмі хацелася, каб сваёй стараннасцю ён заслужыў права прыехаць у адпачынак, няхай у самы кароткі — на дзень, на два. Толькі б пабачыць яго! І каб ён пабачыў сваю дачку! Сваю Алёнку... А вось і яна... Нешта сёння яна прачнулася раней, чым звычайна. А можа, гэта не яна? Не, Саша з першага ж дня беспамылкова пазнавала яе крык і цяпер, напэўна, пазнала б сярод тысячнага хору дзіцячых галасоў. Саша нейкі момант з усмешкай слухае. Малая дзіўна крычыць: крыкне раз, два, паслухае — ці не ідуць, потым зноў... Так здаецца маладой маці, і яна пяшчотна шэпча: «Хітрунля ты мая! Але разбудзіш ты іншых дзяцей».

Саша накідвае халацік, ідзе ў дзіцячую. Бальніца спіць. Спіць дзяжурная сястра. І на вуліцы стала ціха: прайшоў статак, узняўшы пыл, і зноў запанавала цішыня летняй раніцы, калі не настаў яшчэ гарачы час уборкі і людзі даюць сабе адпачынак, асабліва ў нядзелю. Толькі працавітыя і неўпынёныя ластаўкі не адпачываюць, яны першыя сустрэлі дзень і цяпер старанна працуюць — ім няма як адпачываць, бо прачнуліся іх малыя дзеці...

Саша нахілілася над калыскай, і дзяўчынка адразу змоўкла, пачала вуснамі і язычком прасіць есці.

«Ластаўка ты мая мілая!»

Яна ўзяла малую на рукі, расшпіліла халат, і тая адразу ж знайшла ружовы тугі сасок, смешна зацмокала. Саша хвіліну пастаяла нерухома, заварожаная дзіўным пачуццём: нейкай незвычайнай фізічнай асалодай і лёгкасцю ва ўсім целе, нейкай, таксама невядомай дагэтуль, крышачку трывожнай, але ўсёабдымнай радасцю ў душы. Потым з малой на руках вярнулася ў палату і легла на ложак. Доўга з незадаволенай яшчэ цікавасцю назірала, як дачка смокча грудзі, і з пяшчотай разглядала кожную рыску на яе тварыку, яе чарнявую галоўку.

«Чаму ты такая чарнявая? Тата твой белы, і мама таксама... Дзіўна... А так ва ўсім як ты падобна на тату! І носік і вочкі. І нават гэтая плямка...»

Яшчэ тады, калі пакутавала ад болю, Саша засмяялася, убачыўшы ў дачкі на мочцы левага вуха якраз такую ж радзімую плямку, як у Пеці.

Дзіця заснула... І ўсе навокал спяць, хоць сонца паднялося над Дняпром ужо даволі высока і заліло палату цёплым святлом.

Саша доўга ляжала моўчкі, услухоўвалася, як шчабечуць за акном ластаўкі, і думала пра мужа — уяўляла, што ён можа рабіць у гэты час. Ці думае ён гэтак жа пра яе, як яна пра яго?

«Не, цяпер ён павінен думаць не пра адну мяне, ён павінен думаць пра нас...»

На нейкі міг думкі абарваліся, і яна непрыкметна заснула. Прачнулася ад страшнага сну. Што сніла — Саша пасля ніяк не магла ўспомніць, але добра помніла, што гэта было нешта сапраўды жудаснае, бо яна ажно спацела ўся. Яна адразу ж памацала рукой, ці побач дачка, і, не знайшоўшы дзіцяці, ледзь не закрычала ад страху. Не закрычала таму, што ўбачыла Марыю Сяргееўну, якая схілілася над ложкам, але выраз яе твару яшчэ больш спалохаў Сашу. Яна схапіла ўрача за рукі.

— Дзе Ленка? Што з ёй?!

— Супакойся. Яе занеслі ў дзіцячую. Нічога з ёй не здарылася.

Марыя Сяргееўна села на табурэт побач з ложкам і пагладзіла Сашыны валасы. Але Саша не магла адвесці позірку ад яе твару: звычайна асветлены добрай усмешкай, ён быў нейкі ажно счарнелы, з запалымі вачамі, з непрыгожымі складкамі каля рота, быццам Марыя Сяргееўна пастарэла раптам на многа-многа год.

— А што здарылася, Марыя Сяргееўна? — нясмела спытала Саша.

Рука ўрача пакінула гладзіць яе валасы і мацней прыціснулася да галавы.

— Няшчасце, Саша. Вялікае няшчасце.

— Для каго?

— Для ўсіх...

— Няшчасце для ўсіх? — не разумела Саша.

— Вайна, Саша.— Марыя Сяргееўна азірнулася: у палаце нікога не было, відаць, парадзіхі выйшлі гуляць.

Саша адчула, як страшэнна закалацілася яе сэрца, як закалола ў скроні і зноў разануў боль у жываце. Словы ўрача пачалі далятаць як бы здалёк.

— Я выгнала карову... вярнулася да сябе, уключыла прыёмнік... Звычайна так рана станцыі маўчаць. А тут... што робіцца ў эфіры! Усе нямецкія станцыі... Уся Еўропа! Выступаў Гітлер... Яны бамбяць Кіеў... Кіеў! Гэта зусім блізка ад нас... Зусім... Вось тут...— Яна паказала рукой, і Саша паглядзела на акно, за якім шумеў ясны летні ранак, чуліся дзіцячыя галасы, сігналы машын, рыпелі фурманкі і людзі мірна ехалі на рынак, яшчэ нічога не ведаючы. І на міг Сашы здалося, нібы ўсё, што яна пачула толькі што,— гэта працяг страшнага сну. А цяпер яна прачнулася і чуе зусім іншае. Вось нехта весела смяецца... Крычыць жанчына: «Пятро! Спыні каня! Гуска развязалася». Іншыя галасы: «Йкі сёння ў цане будуць... Дачнікаў наехала...» Ад гэтых мірных галасоў раўней пачало біцца сэрца.

Саша адарвалася ад акна, перавяла позірк на ўрача і зноў адчула моцны боль.

Не, гэта не сон...

Марыя Сяргееўна сядзіць побач з пакутлівым тварам і глядзіць некуды ў прастору, быццам хоча разглядзець некага ці нешта ўдалечыні.

Саша зноў-такі нясмела дакранулася да яе рукі.

— Што ж гэта будзе, Марыя Сяргееўна?

— Сеня...— прашаптала ў адказ жанчына.— Сеня... Ён такі слабы, хваравіты... Ён столькі перахварэў...

Тады да свядомасці Сашы дайшло з жудаснай яснасцю ўсё, што здарылася, і яна гэтак жа, як і ўрач, адразу ж падумала аб самым дарагім чалавеку, падумала, што Пеця — у найбольшай небяспецы і, магчыма, ужо цяпер, у гэтую хвіліну, ляжыць недзе на голых скалах Запаляр'я... І, можа, таму, што зноў быў прыступ фізічнага болю, Саша не прашаптала, як Марыя Сяргееўна, любае імя, а крыкнула:

— Пеця!

Урач сціснула яе рукі.

— Супакойся... Не трэба, Саша... Будзем мужнымі... Не палохай іншых. Нам трэба цяпер вялікая мужнасць, мой друг.

Яна нахілілася — Саша абняла яе, прыпала тварам да яе пляча і ціха заплакала.

У палату заглянулі іншыя парадзіхі, убачылі, што доктарка абнімаецца з іх маладой сяброўкай — фельчарыцай, зразумелі гэта па-свойму, весела падміргнулі адна адной і ціха зачынілі дзверы.

* * *

Марыя Сяргееўна хацела затрымаць яе ў бальніцы. Але Сашы было пакутліва цяжка ляжаць у адзіноце, бо іншыя парадзіхі адразу ж выпісаліся, як толькі пачулі пра вайну. Хацелася хутчэй да людзей, да працы. Можа, там, сярод людзей, яна вызваліцца ад сваіх жудасных думак і ўяўленняў.

Саша перадала Ані, каб тая забрала яе. Але гаспадыня прыехала толькі на другі дзень пад вечар.

— Каня ніяк не магла ўзяць, Шурачка. На вайну праводзілі,— растлумачыла яна сваё спазненне.

— Страшна гэта, Аня,— праводзіць на вайну? — спытала Саша, калі яны выехалі з бальніцы на пыльную дарогу, што вяла паміж высокага жыта ў той бок, дзе за ўзгоркам віднеліся вяршаліны бяроз.

— Галосяць бабы,— коратка і проста адказала Аня і, падумаўшы, дадала: — Мужчынам што — ускінуў мяшок за плечы ды і пайшоў сабе... А жанкі!.. Ой, зазнаюць яны гора!

— Што гэта вы, Аня! — запярэчыла Саша.— Дзіўна вы разважаеце... Гэта ж не ў заробкі пайшоў. Гэта ж на вайну... Кожны дзень смерці ў вочы глядзець.

— Смерць — яна адна, Шурачка, і кароткая... Ад яе нідзе не схаваешся. А жыццё доўгае, ды і не адно яно ў жанчыны. Калі ў якой куча дзяцей, дык ёй трэба пяць жыццяў пражыць. За сябе і за іх... Я помню тую вайну, калі бацьку нашага забілі... Атрымала маці пахавальную, а нас пяцёра каля яе... А ў полі бульба замярзае, трэба капаць... Стане мама ў разоры на каленях, пагалосіць, і мы разам з ёй, ды зноў за

працу. Жыць трэба... Я, Шурачка, свае слёзы выплакала па бацьку ды па мужу...

Саша мацней прытуліла да сябе дачку: зноў падумала пра яе бацьку. Думкі пра мужа не пакідалі ні на хвіліну. Але часам удавалася пазбавіцца страшных уяўленняў і ўбачыць яго жывым, вясёлым. Размова ж гэтая з гаспадыняй зноў нагадала карціну, якая вось ужо два дні ледзяніць яе сэрца: Пеця ляжыць на голых каменнях. Жывы ён ці мёртвы? Сашы чамусьці здавалася, што там, у Запаляр'і, усё голае — ні збажыны ніякай, ні дрэўцаў, ні кусцікаў. Ад гэтага ёй рабілася страшна. Яна думала, што, каб Пеця быў недзе тут недалёка, у родным краі, і ваяваў сярод гэтага высокага жыта, у якім так лёгка схавацца, ці вунь у тым лесе, што відзён за Дняпром, на душы ў яе было б куды спакайней.

А Аня прадаўжала выказваць думкі аб жаночым лёсе:

— Жыта вунь якое вырасла! Кажуць, перад вайной заўсёды добры ўраджай. Хутка жніво... А ў калгаса ніводнага мужчыны, акрамя самых старых ды малых, не астанецца. Нашымі, бабскімі, рукамі трэба будзе ўсё падняць... Каб і арміі хлеба было, і дзеці з голаду не пухлі. Цяжка нам будзе, Шурачка.

Саша, захопленая сваімі ўласнымі думкамі, слухала няўважліва. Яны ўз'ехалі на ўзгорак, і позірку адкрылася ўся іх вёска ў зяляніне садоў. Наперадзе — зноў лагчына. Конь фыркнуў і пабег трушком. Сады і хаты пачалі апускацца і нарэшце зніклі зусім, а бярозы на могілках усё былі відаць. Саша глядзела на іх і думала: схаваюцца яны ці не? Ёй чамусьці захацелася, каб хоць з аднаго месца не было відаць могілак. Бярозы не схаваліся, і яна сказала:

— Нашы могілкі адусюль відаць. Як гэта нядобра. Нічога не відно, адны могілкі...

Аня здзіўлена паглядзела на яе.

Саша думала, што ў вёсцы ў гэты вечар будзе вельмі шумна, бо нават тады, калі ішоў звычайны мірны прызыў і ў армію ішлі бязвусыя юнакі, заўсёды напярэдадні было нямала п'яных, многа песень і крыкаў. А цяпер жа ідуць людзі ўсіх узростаў, ідуць на вайну, магчыма, многія на смерць. Але, на здзіўленне ёй, у вёсцы было ціха. Яна падумала, што, можа, гэта таму, што многія пайшлі ўжо, не чакаючы

позваў ваенкамата. Аднак яе ўразіла гэтая цішыня і яшчэ тое, што знешне ўсё аставалася такім жа, як звычайна. Павольна згасаў летні дзень, толькі захад здаўся ёй занадта пунсова-крывавым, але гэта, мабыць, ад уяўлення, што недзе ў той старане сапраўды льецца кроў.

Лініва прайшоў статак, як заўсёды, каровы неслі свае цяжкія, налітыя малаком вымі, рыкалі каля двароў. Гаспадыні заганялі іх у хлявы, бразгалі дайніцамі. Потым Саша адчула, што цішыня гэтая незвычайная, а таму страшная. Яна не адразу зразумела, што робіць цішыню такой напружанай, страшнай. Толькі калі выйшла на вуліцу, тады зразумела: няма вясёлага гоману дзяцей. Звычайна ў такі ясны летні вечар усюды — на кожнай вуліцы, на выгане, каля сажалкі, на калгасным стадыёне — гуляюць дзеці, усюды іх смех, крыкі, гоман. У гэты ж вечар дзяцей нідзе не было, і ад гэтага рабілася жудасна; Саша адчула страшны подых вайны. Якое ж гэта вялікае гора, калі яго зразумелі, адчулі нават дзеці, самыя маленькія нават! Яна прайшла па вуліцы. Не, не ўсе яшчэ пайшлі на вайну. У многіх хатах свяціліся вокны (звычайна ж лямпы сярод лета ніхто не запальвае). Дзе-нідзе сядзелі за сталамі, пілі, але гаманілі не па-п'янаму крыкліва, а ціха і разважліва, спявалі таксама ціха і сумна. Дзе-нідзе гэтак жа ціха плакалі жанчыны...

Раніцой разам з усімі Саша праводзіла мужчын у ваенкамат. Машыны з Рэчыцы не вярнуліся, і другая партыя прызыўнікоў ехала на фурманках. Па пыльнай палявой дарозе, паміж жытоў, павольна рухаўся абоз. Але на вазах сядзелі толькі ездавыя-хлапчукі ды на адным — крыху п'янаваты гарманіст. Усе іншыя ішлі следам: самі заўтрашнія воіны, іх маці, жонкі, дзеці — даволі вялікі натоўп. Амаль усе трымаліся сем'ямі, і паміж імі ішла Саша з дзіцем на руках.

Старая жанчына, якая праводзіла адразу двух сыноў, клапатліва сказала:

— Вы не ішлі б, доктарка, так далёка, цяжка вам яшчэ.— І, адхінуўшы марлечку, заглянула ў тварык малой.— Ды і ёй шкодна — вунь якую пылюку паднялі.

— Я трохі прайду,— вінавата сказала Саша.

Яе цягнула правесці гэтых людзей, з якімі яна за два гады працы вельмі зблізілася. Цягнула яшчэ таму, што яны ідуць на дапамогу яе Пецю, што яны стануць побач з ім і будуць абараняць яе, Ленку, усіх дзяцей, жанчын ад страшнага ворага. А яшчэ яна ўспаміпала, як па гэтай жа дарозе менш за год назад яны ішлі з Пятром. Ад усяго гэтага хацелася плакаць. Але яна стрымлівалася, бо навокал не плакала ніводная жанчына. Многія, праўда, выціралі рагамі хустак слёзы, але ўголас не плакалі. Размаўлялі ціха, кожны пра сваё:

— Наташа, парсюка ты закалі, каб дзеці на нішчымніцы не сядзелі...

— Добра, Ваня, ты не клапаціся пра нас, ты сябе глядзі, асцярожны будзь.

— Тата! А ты забі гэтага Гітлера ды і вяртайся хутчэй.

— Добра, сынок. Я заб'ю яго, гада. А ты маму слухай, Любку пільнуй.

Можа, і абышліся б гэтыя праводзіны без гучнага плачу і галашэнняў, хіба толькі ў самую апошнюю хвіліну жанчыны не стрымаліся б, ды падвёў гарманіст. Ён доўга жартаўліва размаўляў з дзяўчатамі, што ішлі побач з ім, а потым неяк нечакана для ўсіх расцягнуў мяхі свайго гармоніка, зайграў і заспяваў старую-старую песню, якую кожны спяваў і чуў тысячу разоў. Але калі яе спявалі на мірнай бяседзе, то нікога яна асабліва не кранала — ці мала спяваецца ўсялякіх песень! А ў такі час...

После-е-едний но-о-не-шний дене-о-очек
Гуля-ю с ва-ми я, друзья-я...

Як яна разанула па сэрцах, гэтая песня! Адразу загаласілі жанчыны, заплакалі дзеці. А Саша адчула, як ёй стала вельмі цяжка дыхаць — так цяжка, што яна баялася, што ўпадзе, таму выйшла з натоўпу і села на абочыне дарогі на пыльную траву, якраз там, дзе канчалася жыта і пачынаўся лён, зялёнае мора льну, таксама надзіва высокага і густога. Каб неяк супакоіць сябе, яна дала малой грудзі...

«Ленка, дачушка ты мая родная! Як добра, што ты з'явілася на свет. Ты мая адзіная радасць у гэтыя чорныя дні».

Раптам Саша адчула, што нехта стаіць і глядзіць на яе. Яна інстынктыўна закрыла далоняй грудзі, узняла

вочы. На дарозе стаяў Уладзімір Іванавіч з мяшком за плячамі.

— Карміце, Аляксандра Фёдараўна. Не саромейцеся... Гэта — святое,— ціха сказаў ён, адводзячы позірк.

Саша адняла дзіця ад грудзей, зашпіліла кофтачку і хутка ўстала з зямлі. Яна адразу зразумела, што ён даганяе іншых прызыўнікоў, але чамусьці спытала:

— І вы?

— Мне няма яшчэ павесткі. Але я не магу чакаць, вы разумееце... Такі час! А я афіцэр запасу, лейтэнант... Камуніст...

— Я разумею,— уздыхнула Саша.— Але гэта так цяжка — праводзіць на вайну...

— Нічога, Аляксандра Фёдараўна,— бадзёра суцешыў яе настаўнік.— Хутка вы будзеце сустракаць нас з перамогай! Пры магутнасці нашай Чырвонай Арміі, я ж служыў, ведаю... дык мы гэтага Гітлера... Кажуць, што нашы пад Варшавай ужо.

Учора, калі Саша ад'язджала з бальніцы, Марыя Сяргееўна, у якой аставаўся яшчэ прыёмнік і якая разумела панямецку, сказала ёй па сакрэту зусім іншае, і Саша чамусьці паверыла ёй, хоць ніколі раней не сумнявалася ў магутнасці сваёй Радзімы. Яна нікому пра гэта не гаварыла. Але цяпер у размове з настаўнікам, якога лічыла разумным і паважала і які ішоў на вайну, не ўтрымалася і сказала нават жорстка:

— Ведаеце, Уладзімір Іванавіч, робіцца непрыемна, калі гавораць такія гучныя словы... Навошта? Вайна — не гульня. Вайна — смерць і гора.

Ён не запярэчыў, толькі як быццам збянтэжыўся і спытаў пра іншае:

— Дачка, сын?

— Дачка.

— Цяжка вам будзе.

— Я не скарджуся на свой лёс. Я радуюся, што яна з'явілася.

Уладзімір Іванавіч паглядзеў на гадзіннік.

— Трэба даганяць, а то прыйдзецца пехатой да Рэчыцы,— сказаў ён бадзёра, рухам плячэй папраўляючы мяшок.— У мяне маці занядужала... адна асталася... Пагглядзіце яе, калі ласка, Аляксандра Фёдараўна.— Голас яго задрыжаў.

— Я пагляджу... Вы не турбуйцеся,— паабяцала Саша і раптам адчула нейкую амаль мацярынскую пяшчоту да гэтага чалавека.

Ён працягнуў правую руку, яна ж правай трымала дзіця. Тады яна зрабіла крок да яго, абняла левай рукой за шыю і пацалавала ў лоб. Ён адступіў, здзіўлены, і Саша ўбачыла, як бліснулі слёзы ў яго вачах. Ён ціха сказаў:

— Дзякую вам,— і хутка закрочыў па пыльнай дарозе, а Саша пайшла ў бок вёскі і не азірнулася. Яна падумала пра тое, што гэта нядобра — цалаваць чалавека, які ідзе на вайну, у лоб. Як нябожчыка.

Яна ў той жа дзень наведалася да яго маці. Увогуле, ёй хацелася працаваць як мага больш, каб ні хвіліны не сядзець склаўшы рукі. Але ў амбулаторыю ніхто не прыходзіў, быццам усе яе хворыя адразу ачунялі. Спачатку яна здзіўлялася, потым зразумела: калі прыйшла такая бяда, людзям не да сваіх маленькіх хвароб; з драбязой сорамна ісці ў такі час, а сэрцы і галовы баляць ва ўсіх. Праўда, прыйшлі два чалавекі, якія атрымалі позвы з ваенкамата, і прасілі даведкі, што яны хворыя, не могуць з'явіцца на прызыўны пункт. Выгляд іх не гаварыў, што яны хворыя. Саша не стала іх слухаць і даведак не дала. Мужчыны прыгразілі. Гэта яе страшэнна ўразіла. Здаралася, што і раней яна не давала даведак, але ніхто ніколі не пагражаў ёй. Так прайшоў дзень, другі... Каб заняць чым час, Саша бясконца перамывала пялёнкі і шыла штонебудзь для дзіцяці, хоць усяго было нашыта яшчэ да родаў.

Вайна не далятала ў іх ціхі куток. Нават варожых самалётаў яны не бачылі ў першыя дні. Зрэдку праляталі на захад нашы самалёты, і гэта ўсіх радавала. Толькі на досвітку чацвёртага дня яны пачулі яе, вайну. Фашысцкія самалёты бамбілі рэчыцкія масты цераз Дняпро. Вяртаючыся з бамбёжкі, яны ішлі над самай вёскай, вельмі нізка над садамі і стрэхамі, ад іх гулу дрыжалі і тузаліся паветра і зямля. Пачуўшы выбухі, Саша схапіла Ленку, выскачыла на гарод і легла ў бульбянік. Ад ранішняй вільгаці і страху яе пачала біць ліхаманка. Вярнуўшыся ў хату, калі самалёты праляцелі, яна доўга не магла сагрэцца і супакоіцца.

У той жа дзень прыйшлі больш пэўныя весткі з фронту. Праз Рэчыцу прайшлі першыя эшалоны з раненымі, і многія

жанчыны хадзілі туды, за трыццаць кіламетраў, з надзеяй, якая заўсёды жыве ў жаночым сэрцы: «А можа, і мой там?»

«Нашы адступаюць!» — словы гэтыя ўскалыхнулі людзей і зрабілі большую паніку, чым сама вестка аб вайне. Саша паверыла Марыі Сяргееўне, якая сказала ёй на другі дзень, што немцы прарвалі пагранічныя ўмацаванні, але не спалохалася тады. Цяпер жа, калі кожная жанчына, кожная старая перадавала суседцы з вялікай трывогай: «Нашы адступаюць», Сашу ахапіла жудасць. «Куды адступаюць? Чаму адступаюць?»

Яна падумала пра Пятра. Куды адступіць ён? Знайшоўшы ў сына гаспадыні падручнік па геаграфіі, яна раскрыла карту, паглядзела на Кольскі паўвостраў і жахнулася яшчэ больш. Яна ніколі не ўяўляла, што ўваход на паўвостраў такі вузкі: ад фінскай мяжы да Кандалакшскай губы ўсяго некалькі міліметраў. А што, калі немцы і фіны прарвуцца там і перарэжуць чыгунку? Куды будуць адступаць тыя, хто ў Мурманску? Куды адступіць Пеця? Паўвостраў далёка цягнецца на ўсход, але які ён голы там — ніводнага кружочка! А за ім мора сіняе, суровае, сцюдзёнае нават на карце. У той жа дзень яна атрымала тры пісьмы ад Пятра, але ўсе яны былі напісаны за колькі дзён да вайны і былі поўныя радасці. А Сашы вельмі хацелася атрымаць пісьмо, якое было б напісана хаця б у першы дзень вайны, каб даведацца — а яна прачытала б гэта паміж радкоў,— як там пачалося ў іх, што ён думае і што ён робіць, што з ім? З нездаровай, пакутлівай нецярплівасцю пачала яна чакаць такога пісьма. У гэтым чаканні прайшоў тыдзень. Вайна падступала бліжэй: у вёсцы з'яўляліся раненыя аднавяскоўцы. Саша перавязвала ім раны і прагна распытвала: як там? Але расказвалі яны надзвычайна мала, лаялі немаведама каго і паводзілі сябе так, быццам былі вінаватыя ва ўсім, што здарылася. Аднак, нягледзячы на самыя панічныя чуткі, на самыя страшныя расказы, мала хто ў гэтым ціхім прыдняпроўскім раёне думаў, што немцы могуць дайсці і да іх. У Сашы ні разу не ўзнікала такой думкі. Наадварот, здавалася, што жыццё, парушанае ў першыя дні, цяпер перабудоўваецца па законах ваеннага часу. Ніякая вайна не можа спыніць жыцця!

Аднойчы Саша цэлы дзень працавала ў полі — памагала гаспадыні зграбаць і перавозіць канюшыну, якую Аня

атрымала з калгаса. Зморaная працай, Саша ўпершыню за дні вайны заснула рана і спала моцна. Яе разбудзіў настойлівы стук у акно. Прызвычаеная да такога стуку, яна адказала:

— Зараз іду,— і пачала адзявацца.

— Хто там? — спытала Аня.

— Відаць, на роды.

— Спытай хто,— параіла гаспадыня.— Не той час, каб так выходзіць.

Саша паглядзела ў вокны, але нікога не ўбачыла і палічыла, што яе чакаюць каля амбулаторыі. Яна выйшла на вуліцу і... спалохана адхіснулася: каля варот, у цені, стаяў чалавек са стрэльбай на плячы.

— Не бойцеся, Аляксандра Фёдараўна,— ціха сказаў ён, і здзіўленая Саша пазнала Уладзіміра Іванавіча.

— Вы? Вы тут?

Ён асцярожна ўзяў яе за локаць і адвёў ад хаты, трымаючыся, аднак, у цені ад клёнаў.

— Я тут. Райком стварыў групу самааховы. Час ваенны. Учора каля Дземяхоў мы парашутыстаў лавілі. Трох застрэлілі, двое здаліся. А сёння вось... маці адведаў... і вас захацеў пабачыць.

— А вось гэта неабавязкова,— непрыязна адказала Саша; прамільгнула думка: яна пацалавала гэтага чалавека, упэўненая, што ён ідзе на фронт, а ён тут туляецца, каля дому, у той час, калі ўсе іншыя і Пеця недзе пад кулямі.

Ён, мабыць, сумеўся, бо нейкі момант памаўчаў. Саша намагалася разгледзець яго твар — што на ім адбіта? Але было цёмна.

— Я лічыў сваім абавязкам папярэдзіць вас, Аляксандра Фёдараўна,— сказаў ён амаль шэптам.— Вы павінны ехаць адгэтуль, эвакуіравацца... Вам нельга тут аставацца... Вы камсамолка...

— Нікуды я не паеду! — узлавана адказала Саша і хмыкнула іранічна: — Добрая вы самаахова: ходзіце па начах, наганяеце страх, паніку. Каго вы ахоўваеце? Сябе?

Уладзімір Іванавіч зноў узяў яе за локаць, моцна сціснуў і горача зашаптаў:

— Шура, паверце мне, як вашаму другу, як... камуністу... Я не сябе ахоўваю. Але становішча вельмі складанае... Тры дні назад нашы пакінулі Мінск... Немцы пад Жлобінам...

— Здалі Мінск? — ледзь не крыкнула Саша.

— Цішэй. Не трэба панікі.

— А Мурманск?

— Пры чым тут Мурманск? — здзівіўся настаўнік.

— Там — мой муж.

— А-а...

— Няўжо праўда здалі Мінск? Не магу паверыць!

— Я ведаю напэўна... І таму прыйшоў да вас... З Рэчыцы эвакуіруюць сем'і...

Цяпер Саша паверыла яму, паверыла, што ён прыйшоў з самымі шчырымі намерамі, як добры друг, і адчула ўдзячнасць да гэтага чалавека. Не ведаючы, як выказаць яе, сваю ўдзячнасць, даверліва спытала:

— Што ж мне рабіць?

— Прыязджайце заўтра ў Рэчыцу. Я паклапачуся, каб вас пасадзілі ў эшалон для эвакуіраваных.

— Дзякую,— шчыра і проста сказала яна і насцярожана прыслухалася. У хаце заплакала дзіця. А недзе ўдалечыні пачуўся гул самалётаў. Забыўшыся развітацца, яна кінулася ў хату — да дзіцяці.

II

У Рэчыцу Саша не паехала. Яна разважыла інакш: недалёка за Дняпром і Сожам яе родная вёска, бацькоўская хата, а таму няма патрэбы ехаць некуды ў белы свет. Дома яна будзе ў поўнай бяспецы, бо калі нават ворагу ўдасца дайсці да Дняпра, то туды, за дзве вялікія ракі, яму ніколі не прарвацца. У гэтым яна ўпэўнена і таму яшчэ з тыдзень пасля размовы з Уладзімірам Іванавічам жыла і працавала тут. І толькі тады, калі ў наваколлі з'явіліся вайскоўцы і пачалі будаваць умацаванні, яна вырашыла ехаць. Ёй цяжка было развітвацца з мясцінай, дзе пачалося яе самастойнае жыццё і дзе кожная рэч напамінала пра Пецю і аб іх шчасці, кароткім, але яркім. Што чакае яе наперадзе?

Аня ўзяла ў калгасе каня і сама ехала за фурмана. Калі пагружаліся, Саша здзівілася, што ў яе набралася так многа рэчаў.

— Абжылася я тут у вас,— сказала яна Ані.

— Я мяшок жыта пакладу, Шура,— прапанавала Аня.

— Што вы, Аня! Навошта ён мне?

— Ой, усё спатрэбіцца. Не адна ты цяпер. Жыць трэба, дачку гадаваць. Бяры. А я твой шнур сажну.

Два дні назад, па ўказанню райкома, калгасныя пасевы раздалі калгаснікам, інтэлігенцыі — па колькасці едакоў. Сашы таксама далі сотак дваццаць. Гэта ўстрывожыла: дрэнная прыкмета. Уласна кажучы, не столькі вайскоўцы, колькі раздзел пасеваў прымусіў яе ўспомніць папярэджанне Уладзіміра Іванавіча і хутчэй ехаць за дзве вялікія ракі.

Нарэшце і мяшок з жытам пакладзены на воз. У хаце асталося самае дарагое — дачка. Саша пайшла па яе. Пярэдняя палавіна, дзе яна жыла, здалася цяпер залішне вялікай, пустой і ад гэтага няўтульнай.

Саша спавіла малую, пацалавала дзяцей гаспадыні. Узяла дачку на рукі і яшчэ раз агледзелася. Гаспадыня памалілася на абразы. Сашу неяк вельмі ўсхвалявала гэта. Захацелася плакаць.

— Аня, калі пісьмо ад Пеці прыйдзе, дык вы абавязкова перашліце мне. Як-небудзь,— яшчэ раз папрасіла яна, хоць аб гэтым прасіла неаднойчы.

— Перадам, Шурачка, сама прынясу. Тут жа недалёка. Дабягу.

«Аня таксама не верыць, што яны могуць дайсці сюды»,— з палёгкай падумала Саша.

На вуліцы колькі суседак выйшлі правесці яе. Абкружылі фурманку.

— Вось і вы, Шура, нас пакідаеце,— сказала адна з жанчын, цяжка ўздыхнуўшы.— Учора настаўніцы, каторыя не з нашых мясцін, выехалі. Адны мы астаёмся... Пуста, як пасля чумы.

У Сашы балюча сціснулася сэрца. Яна не ведала, што адказаць, як суцешыць гэтых добрых і гаротных жанчын. Яна як бы адчувала нейкую сваю віну перад імі. Але ў чым яна вінавата? Хіба лягчэйшы яе ўласны лёс? Хіба яна не такая ж салдатка? Але яна ўцякае ад вайны за дзве вялікія ракі, а яны астаюцца тут... Ці мае права яна рабіць гэта?..

— Дзіця захварэе — не будзе каму глянуць,— як бы дакорам ёй гучаць словы маладухі з дзіцем на руках.

Саша апускае вочы, мацней прыціскае да грудзей уласнае дзіця. Не, гэта не дакор, гэта — боль душы.

— Шчаслівай вам дарогі, Шурачка,— кажа тая ж жанчына з дзіцем ласкава і шчыра.— Абыдзецца ўсё добра — не забывайце нас, прыязджайце.

Саша радасна страпянулася, з удзячнасцю глянула на жанчын вачамі, поўнымі слёз.

— Я вярнуся... Я абавязкова вярнуся да вас... Родныя вы мае... добрыя!..

— Ну, хопіць вам!.. Цалуйцеся ды паедзем. Дарога няблізкая,— грубавата сказала Аня, па-мужчынску ўскочыўшы на воз і ўзяўшы лейцы ў рукі.

У мястэчку яны заехалі ў бальніцу — развітацца з Марыяй Сяргееўнай. Саша глянула на ўрача і жахнулася: як тая пастарэла за колькі дзён, схуднела, пасівела.

— Што з вамі, Марыя Сяргееўна?

— Са мной? Нічога, мой друг,— спакойна, але сумна адказала ўрач, правёўшы далоняй па скроні.— Што ў людзей — тое і ў мяне. Гора. Ад гора не маладзеюць... Вунь і ў цябе таксама цені пад вачамі. Не дае спаць? — Яна кіўнула на малую, што ляжала паміж імі на лаўцы ў цені маладых таполяў.

— Не, яна спакойная. Самой не спіцца. Вы ад Сені пісьма не палучалі? Каб пасля напісана было, калі пачалося...

— Я?

Гэтым кароткім запытаннем урач выдала сябе; Саша зразумела, што яна нешта мае, і ўся памкнулася да яе, схапіла, сціснула руку.

— Марыя Сяргееўна! Вы нічога не таіце ад мяне. Я ўсё хачу ведаць.

— Супакойся. Я нічога не таю. Сеня напісаў кароткую паштоўку на другі дзень... Ды вось яна пры мне.

Яна дастала пачак папер з нагруднай кішэні халата.

Саша амаль вырвала з яе рук пакамечаную паштоўку, прачытала ўголас:

— «Мая мілая, слаўная мама!

Я жывы і здаровы. У нас пакуль што ціха. Настрой у нас добры, вельмі добры. Будзем біць ворага. Мілая мама, я хачу, каб цябе нічога не страшыла, каб ты была мужнай. Але калі

табе, магчыма, скажуць што-небудзь дрэннае пра твайго сына, я прашу цябе: нікому не давай веры, мамачка. Я быў і заўсёды буду такі ж сумленны і праўдзівы, якім мяне выхавалі ты і тата. Я люблю сваю Радзіму гэтак жа, як цябе, мая родная мама. А яшчэ я люблю ісціну і праўду і ненавіджу невуцтва, ты ведаеш гэта. Я абдымаю цябе і цалую. *Твой Сеня*».

Саша не ўнікла ў сэнс паштоўкі, у дзіўныя словы сына Марыі Сяргееўны, не здагадалася, колькі болю і душэўных пакут прынеслі гэтыя словы жанчыне. Крыху заспакоеная, што там «пакуль што ціха», з крыўдай падумала: вось сын напісаў маці, а Пеця ёй, сваёй жонцы, не піша.

— Вы даўно гэта палучылі?

— Дні чатыры...

— Чаму ж не піша Пеця? Каб ён ведаў, як гэта цяжка — нічога не ведаць!

— Ім не лягчэй, друг мой,— уздыхнула Марыя Сяргееўна.— Яны таксама, напэўна, нічога не ведаюць. І пісаць яны, безумоўна, пішуць... І Пятро, і Сеня... Усе. Але ўсё парушана. Адны пісьмы прарваліся, а другія, можа, пад бомбы дзе трапілі.

— Калі я паеду, нічога не даведаюся больш... Як я там буду жыць? Мне не трэба ехаць... Трэба чакаць... Праўда?

Марыя Сяргееўна, не адказаўшы, узяла з лаўкі малую на рукі, адгарнула марлю, зазірнула ў тварык. Дзіця спала. На міг на твар урача быццам упаў нейкі асаблівы праменьчык сонца, бо ад сонечных блікаў, што прабіваліся праз лісце таполяў, твары жанчын не святлелі: цяжкія думкі ляжалі на іх чорным ценем.

Саша схілілася над дачкой і таксама ўсміхнулася:

— Яна ціхая... Спіць і спіць.

— Не, вам трэба ехаць,— рашуча сказала Марыя Сяргееўна, паднімаючыся і падаючы Сашы дзіця.— Вам нельга аставацца ніводнага дня больш. Сёння ўначы нехта спаліў паром...

— Як жа нам цяпер пераправіцца?

— Трэба ехаць на Лоеў. Можа, там цэлы.

— А вы, Марыя Сяргееўна?

— Я адна, мой друг. Адна, як у полі вярба. Я пайду з апошнім чырвонаармейцам.

Саша раптам адчула страх: калі і Марыя Сяргееўна думае, што ёй прыйдзецца некуды ісці, значыцца, сапраўды небяспека блізка. Хвілін колькі назад яна ціха і мірна сядзела на знаёмым бальнічным двары, любавалася з крутога берага Дняпра, і ёй зусім не хацелася ехаць далей. А цяпер заспяшалася, цяпер ёй хацелася як мага хутчэй апынуцца на тым беразе вялікай ракі, лугавым і лясістым, быццам немцы маглі прыйсці сюды праз якую гадзіну. Яна расхвалявалася, пакуль чакала Аню, якая хадзіла адведаць сваячку, і заплакала, калі Марыя Сяргееўна на развітанне абняла яе.

Калі выехалі за мястэчка, Саша раз-пораз прасіла:

— Хутчэй, Аня, хутчэй.

Аня, не шкадуючы, сцёбала пугай каня, але дарога была пясчаная, сонца стаяла высока і моцна пякло, конь стомлена матляў галавой і не хацеў бегчы. Хутка іх запынілі вайскоўцы і сказалі, што далей па беразе праезд закрыты. Можна аб'ехаць толькі па вёсках. Яны назвалі вёскі ўбаку ад Дняпра, паказалі на далёкія сады, што былі відаць за морам жыта. Але Сашы здалося страшным аддаляцца ад Дняпра на захад, і, не доўга думаючы, яна павярнула назад.

— Куды ж мы цяпер? — спытала Аня.

— Не ведаю, Аня,— бездапаможна адказала Саша.— Я нічога не ведаю. Можа, параімся з Марыяй Сяргееўнай...

— А чаго раіцца! Трэба ехаць на Рэчыцу. Там — мост.

— Масты бамбяць, Аня. Ці ёсць ён там, мост? Можа, яго даўно няма.

Нібы ў пацвярджэнне яе слоў далёка на поўначы пачуліся глухія выбухі. Саша скаланулася і зноў папрасіла:

— Хутчэй, Аня!

— А куды ж нам спяшацца? — адгукнулася жанчына.

— Я пераплыву на лодцы і пайду пехатой. Больш нікуды не паедзем.— Думка такая прыйшла неяк адразу і здалася такой простай і разумнай, што Саша здзівілася, як яна не здагадалася пра гэта раней. Навошта яна марнавала час на пошукі парома? Каб прыехаць дадому з набыткамі — з гэтымі трантамі і мяшком збожжа? А навошта яны, гэтыя набыткі? Каму яны патрэбны ў такі час? Як ёй не сорамна было думаць пра гэта, калі навокал такое робіцца!

— Адна пойдзеш? — спытала, памаўчаўшы, Аня.

— З Ленкай.

— З Ленкай! У тым і бяда, што з Ленкай. Каб адна — свет вялікі, ідзі, куды хочаш. А так...— Аня зноў памаўчала, падумала, потым ціха сказала: — Я пайду з табой. Правяду. Усё-такі не адной...

Пачуццё ґарачай удзячнасці да гаспадыні захлынула Сашу; расчуленая, яна нават не магла выказаць словамі гэтай удзячнасці і, праглынуўшы слёзы, сказала:

— Вас свае дзеці чакаюць, Аня.

— Пачакаюць. Не маленькія,— адказала жанчына і моцна тузанула лейцамі, ляснула пугай — пагнала каня наўскач.

У Анінай сваячкі, куды яны заехалі, каб пакінуць каня, Саша з ліхаманкавай паспешлівасцю выбрала з рэчаў самае неабходнае — пялёнкі, кашулькі, пару сваіх плацця̌ў.

— Гэта ўсяго? — здзівілася Аня, убачыўшы ў яе руках зусім невялічкі клунак.

— А што мне трэба, акрамя Ленкі!

— Табе не трэба, ёй трэба,— з гаспадарскай разважлівасцю запярэчыла Аня.— Ты, Шурачка, быццам жыць не думаеш. А ў жыцці ўсё спатрэбіцца.

Гаспадыня сама выбрала ўсё найлепшае, навязала ў настольнік даволі вялікі вузел, прыладзіла яго сабе за плечы.

Дарэмна Саша прасіла не браць так многа — яна і слухаць не стала, а яшчэ сама дакарала:

— Ідзеш у такую дарогу, а нават што есці не ўзяла. Святым духам ды малітвамі не пражывеш, Шурачка.

Яна дала Сашы клуначак з ежай, напхала сабе ў кішэні яшчэ нейкіх маленькіх пакункаў, бутэлечак.

Па вузкай крутой сцежцы яны спусціліся да Дняпра. Плынь ракі, як заўсёды, была спакойная і велічная. Прыемна пахла вадой і рыбай. І Саша на момант супакоілася, адагнала свой панічны страх. Але праз момант вайна і небяспека зноў напомнілі пра сябе. Напомнілі дзіўным чынам, нечакана і па-свойму жахліва. Стары панурры лодачнік з ускудлачанай барадой запрасіў у іх за перавоз цераз раку сто рублёў.

— Пабойся Бога, чалавеча! Ці пры сваім ты розуме? — накінулася на яго Аня.— За два рублі перавозілі...

— Я і па рублю перавозіў. А цяпер і за сто не хачу. Навошта яны мне, грошы? Што я за іх куплю? Пляшкі гарэлкі нідзе не дастанеш. Заўтра ім, можа, наогул ніякай цаны не будзе, грошам гэтым.

— Але ж май сумленне, стары чалавек! Жанчына з грудным дзіцем ад вайны ўцякае...

«Навошта яна так гаворыць — «уцякае»?» — спалохалася Саша. Слова гэтае непрыемна ўразіла яе, упершыню падумалася, што, магчыма, усе — жанчыны ў вёсцы, Марыя Сяргееўна і вось яна, Аня,— зразумелі яе ад'езд іменна так — уцякае.

— Я не ўцякаю. Я іду дадому, да сваіх. Кожнаму хочацца быць бліжэй да сваіх.— Саша выхапіла ■ кішэні хустачку з грашыма, развязала вузялок зубамі і працягнула старому грошы — усе, колькі там было. Але замест таго, каб узяць іх, стары груба вылаяўся:

— Што ты сунеш гэтулькі грошай? Што я табе, хапуга які? Не павязу!

Саша, пасаромленая, разгубленая, спалохалася яшчэ больш, са слязамі ў голасе папрасіла:

— Дзядуля, родненькі... Што ж нам рабіць цяпер? Назад ісці?

Ён адвярнуўся, чмыхнуў носам і сурова загадаў:

— Сядайце!

Калі адплылі, стары неяк адразу палагаднеў, спытаў, адкуль ідзе маладзіца і ці далёка ёй ісці. Саша назвала сваю вёску.

— Э, гэта недалёка! — быццам узрадаваўся стары.— Добры хадок да ночы дайшоў бы.

Іх, відаць, ён не лічыў добрымі хадакамі, а на Аню паглядаў даволі коса, і жанчына, каб не злаваць гэтага нараўістага старога, дыпламатычна маўчала, хітра пасміхаючыся.

— А чалавек дзе? — спытаў стары, кіўнуўшы на дзіця.

— На вайне, дзядуля.

— Правільна, такой маладой з дзіцёнкам лепш каля роднай маткі быць. Свякруха — не маці.— Відаць, Аню ён палічыў за свякруху і хацеў дапячы ёй.

Саша не сказала, што маці ў яе няма, але адчула, як балюча сціснулася сэрца ад такога напамінку. Што яе чакае дома, хто яе стрэне там?

Яны былі на сярэдзіне ракі, калі пачулі гул самалётаў. Ён хутка мацнеў, набліжаючыся аднекуль з поўдня.

— Яны,— сказаў лодачнік і пачаў вельмі шпарка грэбці, стукаючы вяслом аб лодку і пырскаючы. Човен, які дагэтуль ішоў роўна і проста, пачаў віляць. Саша бачыла, што ў старога трасуцца рукі.— Учора ў Чапліне паромшчыка забілі, душагубы.

Пачуўшы гэта, Саша адразу зразумела небяспеку, якая пагражае ім.

«Няўжо гэта канец? Дачушка мая родная!»

Яна заплюшчыла вочы. Каб заткнуць вушы! Каб не чуць гэтага страшнага гулу, што, здаецца, тузае і гойдае ўсё навокал: паветра, раку, човен, яе рукі, яе мозг. Гул пераходзіць у нейкі прарэзлівы звон і свіст. Не, трэба глядзець на гэта, трэба ўсё бачыць. Ад смерці не схаваешся. Саша расплюшчвае вочы. Над самай кручай, над белым будынкам бальніцы, над таполямі, пад якімі яны сядзелі раніцой, ляцяць доўгія самалёты.

«Трэба было сказаць Марыі Сяргееўне, каб яна чырвоны крыж выкладала, каб відаць было, што гэта бальніца».

На сядзібе МТС узляцелі ў паветра слупы агню, дыму, пылу, дошак, бляхі. Адгэтуль, з ракі, усё відно на фоне яснага летняга неба, як на блакітным экране.

Калі самалёты адляцелі, стары падняў весла і выцер рукавом пот з ілба.

— Усё лепшае бамбяць, паразіты, усё знішчаюць. Сілу паказваюць, каб запалохаць.

— Добра, што не ў бальніцу, там хворыя,— выказала Саша сваю трывогу.

— Дойдзе чарга і да бальніцы. Не пацэлілі,— сурова прабурчаў стары і чамусьці зноў узлаваўся: — Хворыя! А здаровыя жыць не хочуць? Маліся Богу, што нас не ўбачылі... Яны перапраўшчыкаў не любяць. А ты мне сотняй папракаеш! — накінуўся ён на Аню, хоць тая і маўчала.— Дура-баба! У мяне душа гарыць! Можа, я за гэтую сотню залью яе, душу сваю. А ты сотні шкадуеш! Багацець хочаш?

Толькі вылазячы з чоўна, Саша адчула, які перажыла страх, калі ўбачыла самалёты,— ногі былі як чужыя, млелі і не згіналіся ў каленях. Але яна не спынілася, каб адпачыць.

Яна рвалася хутчэй наперад, нібы там, яшчэ за адной ракой, не лётаюць варожыя самалёты і няма ніякай небяспекі.

Па-рознаму ў тыя жудасныя дні людзі ўцякалі ад вайны. Ішлі групамі і па адным, па магістральных дарогах і па глухіх сцежках; адны ведалі, дзе іх прыпынак, другія ішлі «ў белы свет». Але, напэўна, ва ўсіх было такое ж адчуванне, як у Сашы, адно імкненне — хутчэй наперад, як мага далей ад таго, што асталося ззаду. Пакуль чалавек сядзеў на месцы ў звыклых абставінах, у сваім калектыве, працаваў, займаўся справамі — яго нішто не палохала: ні блізкасць канапады, ні бамбёжкі, але як толькі зрываўся з месца, рабіўся бежанцам — страх і паніка гналі яго наперад няспынна.

Саша, звычайна чулая і ўважлівая да людзей, не бачыла, што Аня абліваецца потам, бо клунак, які тая несла, быў даволі-такі цяжкі. У яе самой млелі рукі — нялёгка з самай раніцы трымаць дзіця, несці перад сабой, бегчы з ім. Басаножкі націралі ногі. Але ўся яе воля, усе сілы былі скіраваны на адно — ісці. Цяпер яна разумела, што ўцякае, але не саромелася гэтага слова, якое яшчэ там, каля Дняпра, здалося ёй ганебным. Не ўласная баязлівасць гоніць яе, а страх за дачку, за гэтую нявінную істоту, што пражыла на свеце ўсяго адзін месяц і нічога яшчэ не разумее, не ведае. І толькі тады, калі гэтае немаўлятка падало свой голас, нечага патрабуючы, Саша схамянулася:

— Яна есці хоча. Трэба пакарміць яе.

— Ды і нам пара адпачыць,— адгукнулася Аня, якая дагэтуль пакорліва ішла моўчкі.— Запарыла ты мяне, Шурачка: сарочка — хоць выкручвай.

Яна з палёгкаю скінула з плеч свой клунак і села на зямлю.

Сашы стала сорамна.

— Трэба нам гэта раздзяліць, каб я палавіну несла. Вам цяжка, Аня.

— Што гэта ты, Шура! Цяжка... Табе таксама нялёгка...

Яны спыніліся ў лесе, у тым месцы, дзе дарогу перасякала квартальная прасека — «лінія», як яе называюць людзі тых мясцін. Па адзін бок прасекі ўзвышаўся стары бор: стромкія прыгажуні сосны з лысінамі падсочкі, нібы смяротнымі знакамі, паміж сосен — дубкі і бярозы, а ўнізе — рэдкі арэшнік.

З другога боку лес быў высечаны колькі год назад, і цяпер уся доўгая, на квартал, лесасека зарасла непралазным гушчаром — беразняком, асіннікам, арэшнікам.

Мясціна была ўтульная. Увогуле такія лясныя скрыжаванні заўсёды вабяць пешахода — хораша адпачыць каля іх!

Жанчыны селі ў цені пад соснамі. Было гадзіны тры — самы гарачы час ліпеньскага дня, і ў лесе стаяла духмяная спякота і такая цішыня, што нават на маладых асінках не дрыжала лісце. Толькі авадні звінелі навокал.

Саша расшпіліла кофтачку, і малая прагна прыпала да грудзей, смешна зацмокала. Маці з замілаваннем глядзела на яе тварык.

— Падарожніца ты мая гаротная!

Аня развязала клуначак з ежай, дастала хлеб, яйкі, соль, расклала ўсё гэта на белай хусцінцы.

— Во і мы перакусім. Лягчэй нагам будзе.

— А мне дык і есці не хочацца. Я перадрыжала на рацэ... Вам страшна было, Аня?

— А каму не было б страшна, Шура! Стары вунь які буркала і той спалохаўся. А я і ў добры час вады баюся. А тут — такое страхоцце...

— Няўжо б яны кінулі на нас, каб убачылі?

— А што ім, душагубам! Вунь расказваюць, што яны робяць на шашы: у бежанцаў з кулямётаў страляюць, бомбы кідаюць...

— Ці так мы ідзём, Аня? Не заблудзімся?

— Так. Я сюды па дровы зімой ездзіла. Зараз вёска будзе. Там распытаем дарогу далей. Цяпер няма чаго баяцца. Бачыш, цішыня якая! Не верыцца, што вайна...

Аня аблупіла яйка, памакнула ў соль і падала Сашы:

— На, з'еш, Шурачка.

У гэты момант насупраць іх зашамацелі кусты і з гушчару вылез чалавек у чырвонаармейскай форме, са знакамі малодшага камандзіра на пятліцах. Ён быў зусім юны, бледнатвары, з вялікімі блакітнымі вачамі і зусім мірны на выгляд. Але Саша чамусьці скаланулася і хутка прыкрыла грудзі і тварык дачкі марляй.

— Хто вы ёсць? — неяк дзіўна, не па-руску, спытаў вайсковец.

— Людзі мы ёсць,— у тон яму адказала Аня, смела і проста.— Не бачыш хіба? Бежанцы. Ад вайны ўцякаем, ад немца... А ты чаму кусты выціраеш? На фронт ішоў бы.

Ён кісла ўсміхнуўся і, наблізіўшыся да Сашы, працягнуў руку да дзіцяці.

— Што гэта?

Саша адхіснулася.

— Маленькі шпіён,— пажартавала яна без усмешкі.

— Што? — Вайсковец нахмурыўся.

Аня засмяялася. А «маленькі шпіён», адарваны ад ежы, галасна закрычаў, парушыўшы лясную цішыню.

— Адкуль ідзяце?

— З-за ракі ідзём,— сур'ёзна пачала тлумачыць Аня.— Гэта наша фельчарыца, працавала ў нас два гады. А цяпер ідзе дадому да бацькі... Хто ведае, дзе спыняць супастата? Можа, ён і да нас дойдзе... Дык нам усё адно, мы тут век жылі, а ёй навошта аставацца? Маладая, з дзіцем... У яе дакументы ёсць...

Саша паднялася, гушкаючы дачку, каб супакоіць, і раптам убачыла, што збоку, крокаў за дзесяць ад іх, на прасецы стаяць яшчэ двое. Гэтыя былі ў форме радавых, з вінтоўкамі ў руках. Стаялі яны плячо ў плячо, як на парадзе, маўклівыя і суровыя. Позіркі іх былі страшныя: ні цікаўнасці ў вачах, ні цеплыні, ні ўсмешкі...

«Чаму гэта яны такія?» — са страхам падумала Саша.

І раптам адзін з двух спытаў:

— Вэр зінд зі?

Саша аслупянела. Што гэта? Чаму ён гаворыць не па-руску? На якой мове ён гаворыць? Хто ён, гэты чалавек?

«Вэр зінд зі?» — «Хто такія?» — успамінала яна пераклад гэтай простай фразы. Божа мой! Гэта ж па-нямецку... Што гэта яны, жартуюць? Які недарэчны жарт! А можа, гэта не па-нямецку, можа, гэта байцы з нацыянальнай часці? У нас многа розных народаў... Не... той, што падышоў першы, таксама пачаў гаварыць па-нямецку. Саша са сваім веданнем мовы ловіць асобныя словы... Флюс — рака, унтэрарц — фельчар. Бацька... Немцы...

А дзіця крычыць усё мацней. Саша гушкае яго, просіць, моліць, быццам малая можа зразумець:

— Дачушка мая, сціхні, родная, не плач, зараз я пакармлю цябе,— а сама напружана прыслухоўваецца і — дзіўна — думае пра тое, што зусім не ведае нямецкай мовы і што каб прыйшлося паступаць у інстытут, то яна, напэўна, правалілася б на экзаменах.

«Гер лейтэнант...» Гэты звяртаецца да аднаго з тых двух, як да камандзіра:

«Пан лейтэнант... Пан!..»

«Гер лейтэнант» набліжаецца і гаворыць нешта злосным голасам, звяртаючыся да Сашы.

— Там, на той бок ракі, многа рускіх салдат? — хутка перакладае той, што падышоў першы.— Дзе на Дняпры робіцца пераправа?

Аня хутка збірае ежу, кладзе яйкі і соль у кішэню і адказвае за Сашу:

— Многа салдат... Усюды салдаты, танкі, пушкі, ад Рэчыцы да Лоева, па ўсім беразе... А пераправы мы не бачылі, мы на лодцы пераплылі... сто рублёў заплацілі. Каб была пераправа, мы на кані ехалі б... А рускія салдаты ўсюды ёсць... І на тым беразе, і на гэтым беразе...

— Мальчаць! — злосна загадвае Ані «гер лейтэнант» і зноў звяртаецца да Сашы.

— Дзе наводзіцца пераправа? — дапытваецца перакладчык.

— Мы не бачылі пераправы,— паўтарае Саша Аніны словы.— Мы пераплылі на лодцы. Тут быў паром, але яго спалілі...

— Хто спаліў?

— Я не ведаю, хто спаліў. Нам сказалі, што яго спалілі ў мінулую ноч.

Голас у Сашы чужы. Гушкаючы дзіця, яна адступае на крок назад. А дзіця крычыць. Быццам чуе пагрозу. Саша не вытрымлівае — адварочваецца і дае яму грудзі. Усім целам яна адчувае на сабе іх бессаромныя, прагныя позіркі. Нейкі момант яны нават маўчаць... Сашу ахоплівае жудасць... Немцы! Цяпер няма сумнення, што гэта немцы. Але як яны трапілі сюды? Яна прыгадвае: дэсант, парашутысты. Пра іх гаварыў Уладзімір Іванавіч, ды і ў вёсцы ў апошнія дні было нямала размоў пра таямнічых і страшных парашутыстаў.

«Што ж яны зробяць з намі, дачушка мая любая?»

Саша ўзіраецца ў іх твары: што яны думаюць?

«У іх таксама ёсць маці, жонкі, дзеці».

Аня ўскідвае клунак на плечы — яны маўчаць. Яны не адбіраюць рэчаў, не робяць вобыску. Гэта крышачку супакоіла Сашу. Але яны зноў залапаталі нешта між сабой. Яна напружвае слых, памяць, каб зразумець хоць асобныя словы. Перакладчык нешта пытае ў лейтэнанта.

«Вас махен?» — «Што рабіць?» — ловіць Саша асобныя зразумелыя словы.

«Мусіць, ён пытае, што рабіць з намі».

«Гер лейтэнант» на нейкі момант як бы задумваецца, потым панура, ні на кога не гледзячы, кідае незразумелае слова:

— Эршысен!

— Эршысен? — здзіўлена перапытвае светлавалосы юнак, і Саша бачыць, як ён бляднее, як дрыжаць яго губы.— Абер дорт іст дох айн зойглінг!

«Зойглінг? Што такое зойглінг?» Нарэшце ўспамінае: грудное дзіця. «Ах! — Яна адступае, сціскае дачку.— Што ён сказаў пра цябе, мая дачушка? Што яны хочуць зрабіць? Не дам! Я нікому не дам цябе! Не бойся!» А сама ўся задрыжала, азірнулася навокал, гатовая бегчы, уцякаць.

Аня, зразумеўшы яе душэўны стан, стала побач, сціснула ёй руку. А «гер лейтэнант» у гэты момант нешта злосна гаварыў маладому. Той стаяў смірна, ківаў у знак згоды галавой, але твар яго яшчэ больш бялеў. Каб Саша ці Аня разумелі па-нямецку, яны пачулі б страшныя словы:

— Ты многа вучыўся, Грабель, але карысці з тваёй навукі, бачу, мала. Ты кепска вывучыў галоўнае — навуку нашага дарагога фюрэра. Мы не для таго пачыналі вайну і прыйшлі сюды, каб разводзіць тут слюнявы інтэлігенцкі гуманізм. Кожны рускі, малы і стары,— наш вораг... Ты хочаш, каб я адпусціў іх, а яны прывялі сюды рускіх салдат і тыя зрабілі аблаву на нас? Гэтага ты хочаш?

Грабель маўчаў.

— Курт, я даручаю гэта табе,— павярнуўся лейтэнант да трэцяга, які за ўвесь час не вымавіў ніводнага слова.— Там, у яме, дзе ляжыць ляснік. І гэтак жа — ва ўпор з пісталета... Без лішняга шуму.

Салдат узняў вінтоўку і накіраваўся да іх.

Аня засланіла сабой Сашу.

— Пайшлі,— правільна па-руску сказаў маўклівы, прыветліва ўсміхаючыся.— Пайшлі... другой пуць...— Ён паказаў рукой на прасеку.

Блакітнавокі як бы страпянуўся і, не падымаючы галавы, растлумачыў:

— Вас завядуць на іншую дарогу, па гэтай няможна хадзіць...

«Ён хлусіць! Хлусіць! Не верце яму!» — ледзь не вырваўся з грудзей у Сашы крык, але Аня ўсё мацней і мацней сціскала яе руку і цягнула за сабой:

— Хадзем, Шурачка.

«Яны надумалі нешта страшнае»,— хацела сказаць ёй Саша, але чамусьці зноў нічога не сказала, а паслухмяна павярнулася і пайшла за Аняй.

Ззаду пачуўся голас лейтэнанта:

— Курт! Дэн зойглінг канст ду ніхт эршысен!

«Эршысен?.. Эршысен?.. Ніхт эршысен? — паўтарала Саша апошняе слова, але ўспомніць пераклад яго ніяк не магла.— Ніхт — не... Што — не? Што яны не зробяць з табой, мая дачушка? Што яны надумалі зрабіць з намі? А як жа ты астанешся без мяне? Трэба спытаць у іх... Няхай скажуць. Яны ж людзі...»

Саша азірнулася. Салдат зноў усміхнуўся ёй, паківаў галавой. А тыя двое стаялі на прасецы і глядзелі ім услед.

Канваір лёгка штурхнуў Аню вінтоўкай у плячо і паказаў направа, куды ў гушчар вяла вузкая, з зараслымі травой каляінамі лясная дарога. Яны збочылі з прасекі. Тады Аня выпусціла Сашыну руку, дастала аблупленае яйка і... пачала есці.

Саша жахнулася: як яна можа есці ў такі момант?

— Аня! — прашаптала яна. Але ў адказ Аня дастала з другой кішэні цэлае яйка, павярнулася і працягнула яго салдату:

— Калі ласка... Смачнае... смачнае.— І яна апетытна прыцмокнула языком.

Ён узяў яйка, пастукаў ім аб прыклад вінтоўкі, засмяяўся дзіўна вельмі, страшна, паківаў галавой, як бы дакараючы,

напэўна, падумаў: «Дурныя вы, як вароны. Нічога вы не разумееце...» Аднак сказаў іншае:

— Карош... русіш фраў... Спасіба. Пайшлі... Пайшлі...

Аня зноў выхапіла правую руку з кішэні і сыпанула ў твар яму... соль. І тут жа рванула з яго рукі вінтоўку, размахнулася і стукнула па галаве.

Саша не паспела апомніцца — так вокамгненна гэта здарылася, толькі пачула трэск, але пасля не магла зразумець, што гэта трэснула — прыклад ці чэрап фашыста.

Аня шпурнула клунак на зямлю, выхапіла ў яе дзіця, гукнула: «Уцякайма!» — і, нізка нахіліўшыся, кінулася ў кусты.

Саша бегла за ёю праз чэпкі гушчар, да крыві абдзіраючы аб сукі і калючкі твар, рукі, ногі. Потым гэтак жа без агляд-кі яны беглі па рэдкім лесе, мінаючы прасекі і дарогі. Колькі часу беглі так — ніхто з іх не помніў. Спыніліся тады, калі апынуліся на полі і ўбачылі недалёка жанчын, што мірна жалі жыта. Аня села на краі нівы, у разору. Саша ў знямозе ўпала побач. Аня абняла яе за шыю і прашаптала:

— Ну, Шурачка, нехта Богу за нас моліцца. Гэта ж яны нас на смерць вялі... на расстрэл.

Сашу пачала біць нервовая ліхаманка.

III

Камандзір павітаўся — апошнія два дні ён не з'яўляўся наначнача; спытаўся, як здароўе Сашы, зазірнуў у калыску, дзе ляжала Ленка, і разгублена спыніўся пасярод хаты. Ён не ведаў, што можна сказаць яшчэ, як развітацца, каб людзі не зразумелі, што іх пакідаюць. Ён стараўся зрабіць выгляд, што нікуды не спяшаецца, але трывожныя позіркі, якія кідаў на акно, выдавалі яго. Ды і не было ўжо сакрэтам адступленне. На вуліцы, у пяску, буксавалі машыны. Крычалі і злосна лаяліся чырвонаармейцы.

Даніла — шаснаццацігадовы брат Сашы, зразумеўшы ўсё, моўчкі паказаў вачамі на хворую сястру, і сцятыя вусны яго дрогнулі.

Камандзір паспрабаваў усміхнуцца:

— Такі салдацкі лёс, Данік. Сёння тут, заўтра там...

Саша, якая запалёнымі вачамі напружана сачыла за кожным рухам камандзіра, устрапянулася, імкліва села на ложку.

— Вы адступаеце? Вы пакідаеце нас? Няўжо вы не маглі ўтрымаць іх на Дняпры і Сожы? На такіх вялікіх рэках?.. Божа мой!

— Супакойцеся, Аляксандра Фёдараўна,— не ўзнімаючы вачэй, сказаў камандзір.— Мы трымаемся, але мяне пераводзяць на другі ўчастак... Я зайшоў...

— Вы хлусіце! — закрычала Саша.— Навошта вы хлусіце? Каму вы хлусіце? Сваім людзям?.. Сёстрам, маткам?.. Яны захапілі Гомель? Так? Не кажыце мне, я ведаю, чаму сёння не чуваць кананады... Вы адступаеце. Уцякаеце... Кідаеце нас... Дык і я іду з вамі!.. Я не астануся з гэтымі звярамі!.. Не! — Яна ўсхапілася з ложка.— Я не хачу, каб яны зноў павялі нас на расстрэл...

Старэйшая сястра Поля кінулася да яе, абняла, намагаючыся ўкласці на ложак.

— Саша, родная мая, куды ты пойдзеш? Ты ж на нагах не стаіш... Ты зусім хворая...

— Не чапайце мяне,— ірванулася Саша.— Вы хочаце, каб яны забілі маю дачку? Усе вы баязліўцы! Вы баіцёся кінуць гэтую трухлявую хату! «Бацькаў дом!..» А яны прыйдуць і спаляць ваш дом, заб'юць вас!.. Пабачыце тады!..

— Сястра! Не адны мы астаёмся... Народ астаецца! — дрыготкім голасам, але па-мужчынску цвёрда і разважліва сказаў Данік.

Саша нікога не слухала, яна хутка збіралася ў дарогу: надзела лепшае плацце, чаравікі, хустку, прагледзела дакументы, якія ўзяць.

За акном паклікалі:

— Таварыш капітан!

Ён зняў пілотку, нахіліў галаву, уздыхнуўшы, прамовіў:

— Бывайце...— Потым ціха сказаў Сашы: — З войскам вам няможна. Ды і наогул позна...— І так, з непакрытай галавой, ступаючы зусім нячутна, быццам крадучыся, выйшаў з хаты.

Поля, убачыўшы, што Сашу не ўтрымаць, схапіла з калыскі дзіця і рашуча сказала:

— Не дам Ленку! Забі — не дам! Ты хочаш загубіць яе? Чым ты яе карміць будзеш? У цябе ж няма малака! Ды і куды ты пойдзеш цяпер? Чула, што сказаў капітан?..

Саша каля стала паспешліва складала ў старую хустку дзіцячыя рэчы; пры словах сястры яна выпрасталася, застыла са старэнькай, засціранай пялёнкай у руках, са страхам і здзіўленнем паглядзела на сястру, якая трымала Ленку.

— Як людзі, Саша, так і мы,— зноў па-філасофску разважліва зазначыў брат.— Не будзем адрывацца ад людзей...

Саша перавяла позірк на пялёнку і... раптам, закрыўшы ёю твар, упала грудзьмі на стол, на дзіцячыя рэчы. Плечы яе затрэсліся ад плачу. Поля і Даніла кінуліся да яе.

— Саша, родная, супакойся.

Недзе зусім блізка разарваўся снарад. У іх хаце са звонам вылецела колькі шыб.

— Хутчэй у сад! — крыкнула Поля.

Данік абняў Сашу за плечы і сілком пацягнуў за сабой. Яна ішла як непрытомная, абыякавая ў гэты час да ўсяго, што рабілася навокал, ішла, як асуджаная на смерць.

У садзе, пад старой камлюкаватай грушай, было сховішча — такое, якое рабілі амаль усе ў першыя дні вайны па інструкцыі мясцовых улад: глыбокая яма з кароткай траншэяй ад яе. Праўда, Даніла добра ўдасканаліў сховішча: зверху ямы паклаў бярвенні, якія бацька нарыхтаваў, каб перарабіць хляўчук, накрыў саломай, засыпаў зямлёй, а сцены ўмацаваў лазовым плятнём; атрымаўся амаль бліндаж. Хаваліся ў ім не толькі іх сям'я, але і суседка з малымі дзецьмі.

Снарады рваліся рэдка, і выбухі аддаляліся ў напрамку шашы, трушчачы альховыя кусты паўз рэчку, што працякала за гародамі. Відаць, немцы вялі прыстрэлку моста, каб разбіць яго і затрымаць адступленне савецкіх часцей.

Траянавы сядзелі глыбока ў яме, на саломе, прыціснуўшыся адно да аднаго, і слухалі гэтыя выбухі. Поля і суседка ціха, амаль шэптам, з паўзамі, перамаўляліся.

— Я, Полечка, парсюка ў сенцах карміла і не помню, ці зачыніла хату... Калі не зачыніла — наробіць ён шкоды.

— Мы ўчора вярнуліся пасля налёту, а ў нас у хаце Сойкавых каза гаспадарыць. Усе кветкі папсавала...

— Гэтая падла нічога не баіцца. А куры — бачыла, як хаваюцца?

Саша крыху супакоілася, і цяпер яе раздражняла гэтая, як ёй здавалася, нікчэмная размова аб непатрэбных і дробязных падзеях і рэчах.

— Сціхніце вы! Людзі гінуць... А вы пра курэй...

Ад руху артылерыі і танкаў па шашы зямля стагнала.

— Я баюся, мамачка. Што гэта гудзіць? — прапішчала трохгадовая дзяўчынка.

— Гэта гром, дзетка. Не бойся.

Саша быццам захлынулася нечым.

— О Божа! — у роспачы прашаптала яна.— Як яны ўцякаюць! Як ім не сорамна! Столькі машын!

Данік не ўтрымаўся — вырашыў супакоіць сястру; ён у тым годзе скончыў сямігодку і не прамінаў выпадку прыгадаць які-небудзь гістарычны прыклад:

— Кутузаў да самай Масквы адступаў, а потым як даў французам, дык ляцелі яны...

— Змоўкні! — крыкнула ў роспачы Саша.— Змоўкніце вы! Як вы не разумееце!..

Усе сціхлі, нават дзеці. Данік, пакрыўджана забурчаўшы, пачаў выбірацца з ямы. Поля схапіла яго за кашулю:

— Куды ты, Данік? Куды ты лезеш пад кулі? Ох, гора мне з вамі!

— Ды адчапіся ты! — узлаваўся хлопец.— Я ж табе не дзіцёнак... Не маленькі! Сам ведаю, што раблю.— І ён рашуча вылез. Паляжаў на зямлі, прыслухоўваючыся, потым усхапіўся і ў адзін міг апынуўся на грушы.

Шаша праходзіла за якога паўкіламетра, паміж ёй і першымі хатамі вёскі была пустка з зараснікамі лазы і палосай алешніку. Там працякаў ручай, вада ў якім заўсёды мела колер густога чаю і пахла прэлым лісцем і травамі. Ручай гэты, як і рэчка, выцякаў з вялікага лесу, што пачынаўся адразу ж за шашой. Хаця, уласна кажучы, не там ён пачынаўся і не там канчаўся. Лес быў навокал, абступаў вёску з трох бакоў і толькі на захадзе крыху адыходзіў, кіламетры на два-тры, вызваліўшы месца пад пясчанае неўрадлівае поле, над якім у ветраныя дні ўзнімаліся хмары пылу.

З грушы Данік добра бачыў кавалак шашы і мост цераз рэчку. Хутка снарады перасталі рвацца, шаша апусцела.

У вёсцы таксама было пуста і ціха. Уздоўж ручая, маскіруючыся ў алешніку, адступалі пехацінцы; яны ішлі па адным, па два, уподбег, прыгнуўшыся, хоць ніхто не страляў. Наступіў нейкі момант, калі вайна сціхла. Але ад гэтага стала яшчэ больш жахліва і Даніку на грушы і жанчынам у сховішчы. Саша без слоў спявала калыханку. Малая адрывалася ад пустых грудзей і крычала, ёй хацелася есці. Яе крык палохаў жанчын, быццам яна магла наклікаць бяду. Таму ўсе, нават дзеці суседкі, кожны па-свойму, супакойвалі яе — гушкалі, спявалі «ката». Ніхто не думаў пра тое, што Ленцы ўсяго два месяцы і ніякая калыханка яе не супакоіць, малако — вось што ёй патрэбна было.

Цераз мост прайшоў грузавік і, збочыўшы ў кусты, спыніўся. З кузава выскачылі чырвонаармейцы, панеслі да моста скрыню, замітусіліся.

«Узарваць мост хочуць»,— зразумеў Данік і пачаў з дзіцячай цікаўнасцю і нецярплівасцю чакаць выбуху, разважаючы, ці можа даляцець асколак да яго, аднак не думаючы пакідаць свой назіральны пункт на грушы. Раптам за мостам застракатала, і з-за павароту шашы выскачылі матацыклісты. Данік зразумеў, што гэта немцы, толькі тады, калі двое першых, якія амаль дасягнулі ўжо моста, неяк дзіўна кульнуліся, а адзін матацыкл па насыпе скаціўся ў рэчку і там, на мелі, прадаўжалі круціцца яго колы, ганяючы кругамі ваду. Данік куляй зляцеў з грушы, крыкнуў у сховішча:

— Немцы! — і зноў на грушу.

Ён пачуў, як ускрыкнула Саша. З дзіцем на руках яна кінулася да выхаду.

Поля і суседка ўчапіліся за яе і не пускалі. Заплакалі дзеці.

— Куды ты цяпер уцячэш? Куды ты пабяжыш? Хочаш, каб застрэлілі?

Ці то само гэтае страшнае слова, ці частыя стрэлы, якія пачуліся цяпер даволі выразна, прымусілі Сашу змяніць свой намер: яна зноў забілася ў куток. Калоцячыся ўсім целам, прыцiснулася да вільготнай зямлі. Яна бачыла перад сабой іх, немцаў. Перад яе вачамі зноў, як неаднойчы ўжо, стаў той, што вёў іх на расстрэл. У яе памяць урэзалася кожная рыса яго твару. Малады, нават прыгожы, з ветлівай

усмешкай... Цяпер, калі яна ведае, што ён вёў іх на расстрэл, ад гэтай усмешкі ледзянее кроў... Як ён можа так усміхацца! А за ім стаіць той, другі, што сказаў: «Курт, айн зойглінг канст ду ніхт эршысен...» Цяпер Саша дакладна ведае пераклад гэтых слоў: «Курт, дзіця можаш не страляць». І вось ён зноў стаіць, ён зноў вымаўляе гэтыя страшныя словы, паказвае пальцам на Ленку і хавае свой твар... Сашы страшна, але ёй вельмі хочацца ўбачыць яго твар... Яна напружана ўглядаецца перад сабой. Яе хвораму ўяўленню здаецца, што твар яго нечалавечы, пачварны, аброс дзікай шчэццю... У часе кароткіх прыступаў гэтай незвычайнай хваробы, якая цягнецца амаль месяц, перад ёй ніколі не з'яўляўся трэці немец — той, што выйшаў з лесу першы і што пабялеў, калі «гер лейтэнант» загадаў расстраляць іх... Гэтага яна ўспамінала тады, калі ў галаве было ясна ці калі расказвала каму-небудзь аб жудасным здарэнні ў лесе. Тады ўспаміналася ўсё да драбніц. Толькі твару таго, што сказаў: «Дзіця можаш не страляць», Саша ніколі не магла ўспомніць, таму ў часе прыступаў ён стаяў перад ёй безаблічны і здаваўся вельмі страшным. Вось і цяпер ёй здалося, што яго нечалавечая, кашлатая рука цягнецца да Ленкі. Саша заплюшчыла вочы і закрычала:

— Во ён! Ратуйце Ленку! Поля!.. Данік!

Поля абняла яе.

— Саша, родная мая! — шаптала яна.— Нікога няма. Адны мы тут... Паглядзі... Маня, дзеці яе. Там — Данік... Данік! — гучна паклікала яна.

Але ў адказ пачула яшчэ больш частую і, здалося, больш блізкую страляніну. Старэйшая сястра, якая дзесяць год была ім, малодшым, за маці, адышла ад Сашы і высунула галаву са сховішча, шукаючы брата.

— Вось жа задам я гэтаму хлопцу! Лезе пад самыя кулі! Даніла! Зараз жа ідзі сюды!

Але хлопца нідзе не было, дарэмна яна клікала. Даніла ў гэты момант штосілы бег уздоўж ручая да моста, дзе грымеў бой. З вышыні ён убачыў, што другая група матацыклістаў выехала па лясной дарозе на заходні канец вёскі, да пясчанага броду. Ён убачыў, як яны пачалі перацягваць цераз рэчку свае матацыклы, і адразу зразумеў іх намер: зайсці ў тыл

групе байцоў, што вядзе бой каля моста. Доўга не думаючы, ён памчаў, каб папярэдзіць іх.

Калі поўз ад ручая цераз пустку, яго, напэўна, засеклі, бо кулі ціўкалі навокал, ссякалі лазу. Але ён не зважаў. Яго мэта — паўразбураны цагляны хлеў былой дарожнай станцыі, адкуль біў наш кулямёт.

Ён дабраўся да гэтага хлява і ўбачыў там трох байцоў. Адзін ляжаў за ручным кулямётам і кароткімі чэргамі страляў за раку, прыгаворваючы:

— Што, з'елі, гады?

Другі моўчкі набіваў дыскі і падаваў кулямётчыку. Трэці стаяў за цагляным слупам, пільна сачыў за мостам, зрэдку страляў з вінтоўкі і нешта камандаваў. Убачыўшы Даніка, які прапоўз у хлеў праз дзірку ў сцяне, ён здзіўлена спытаў:

— Ты што робіш тут?

— Дзядзечка, яны перапраўляюцца там,— хлопец паказаў рукой — дзе.— Яны хочуць акружыць вас.

— Нічога, хлопчык, нічога,— супакоіў яго баец.— Хутка мы ўсё скончым...— І, уздыхнуўшы, прамовіў прачула: — Эх, таварыш камандзір! На смерць пайшоў! Лажыся, хлопчык! Бі іх, ірадаў, Сцяпан!

Кулямёт ударыў доўгай чаргой. І ў гэтую ж хвіліну грымнуў выбух, такі, што Данілу здалося — абвалілася неба. Зыбанулася зямля, а зверху пачало нешта падаць і балюча выцяла хлопца па назе і па плячы. Ён нават не адразу зразумеў, што ўзарвалі мост. Чакаючы ўдараў яшчэ, не ўзнімаў галавы. Але чыесьці дужыя рукі паднялі яго з зямлі. У твар хлопца глядзелі сумныя вочы байца, які страляў з вінтоўкі.

— Помні, хлопчык! — ціха і ўрачыста сказаў баец.— Каб узарваць мост, пайшоў на смерць наш камандзір — Аляксей Кашалеў. Запомні гэта прозвішча — Кашалеў! А цяпер асцярожна прабірайся да маці... А мы, таварышы, пакуль дым ды пыл, сіганём на той бок, а там — у лес! За мной! — І ён кінуўся ў пралом сцяны, за ім следам — кулямётчыкі.

Даніла перапоўз у лазняк і адтуль убачыў, што асталося ад моста.

Палавіна яго была зруйнавана зусім; нават драўляныя палі, вельмі густа набітыя і пераплецены паміж сабой падпорамі так, што любімай гульнёй хлапчукоў было лазіць пад

мостам, былі патрушчаны выбухам. Па каламутнай вадзе плавалі кавалкі дрэва і бліскала паглушаная рыба. Данік падумаў, што ў іншы час пры такой сітуацыі можна было б добра пажывіцца рыбай. Але цяпер яго ўвагу прыцягвалі немцы на тым баку ракі. Яны туляліся па сасонніку, але высоўвацца баяліся і стралялі рэдка, бо не бачылі, у каго страляць. Толькі калі з другога боку шашы ў хмызняку шуганула ўгору высокае полымя (Данік здагадаўся, што гэта чырвонаармейцы падпалілі свой грузавік), немцы пачалі шалёную страляніну.

З-за павароткі шашы вылез танк, спыніўся і ўдарыў у полымя з гарматы.

«Біце, дурні, у белы свет, як у капейку!» — зларадна падумаў хлопец і спрытна папоўз да вёскі: недарэмна вучылі іх поўзаць па-пластунску. Дабраўшыся да саду дзеда Андрэя — суседа насупраць, ён устаў на ўвесь рост і пайшоў. Яму не хацелася, каб вяскоўцы бачылі, што ён паўзе ці ідзе, схіліўшы галаву, тым больш што страляніна сціхла. У яго нават з'явілася гарэзлівая думка пажартаваць: падкрасціся да сховішча, дзе, ён ведаў, сядзяць дзед-дзівак і яго нявестка Аксана, і гукнуць па-нямецку якое-небудзь «хендэ хох!». Але ён разумеў, што людзям не да жартаў, і пайшоў далей дваром. Адчыніў брамку і... аслупянеў. Па вуліцы ішлі немцы ў касках. Яны ішлі моўчкі ланцугом пасярод вуліцы, накіраваўшы дулы аўтаматаў на двары: баяліся засады. Данік адразу скеміў, што ўцякаць нельга — пачнуць страляць, і астаўся стаяць. Убачыўшы яго, немцы жвава загаманілі, некаторыя нават апусцілі аўтаматы і парушылі свой роўны ланцуг. Адзін, малады, бадзёры, падбег да Даніка, спытаў, паказваючы на двары:

— Русіш зольдат?

Данік паківаў галавой: няма.

Немец засмяяўся.

— О, гут,— і тут жа дастаў губны гармонік, сыграў перад самым тварам ашаломленага Даніка знаёмы матыў «Из-за острова на стрежень». Зноў засмяяўся, паказваючы белыя здаровыя зубы. Потым дастаў з нагруднай кішэні плітку шакаладу і працягнуў хлопцу. Данік узяў шакаладку, і немец, задаволены сабой і становішчам навокал, паляпаў яго

па плячы і рушыў даганяць сваіх. Данік глядзеў ім услед, і сэрца яго ўсё мацней і мацней сціскалася ад нейкай невядомай дагэтуль балючай крыўды. Было крыўдна за незнаёмага Аляксея Кошалева, які загінуў, узрываючы мост. Навошта была яго смерць, калі гэта ні на хвіліну не затрымала ворага? Было крыўдна за сваю рэчку, якую ён любіў з маленства, за тое, што яна такая мелкая і ў ёй так шмат бродаў... За сваю зямлю... За Сашу, якая так напалохана і дрыжыць у сховішчы. І за сябе. Як маленькаму, як блазнюку, сунулі яму шакаладку... А магчыма, гэты немец самы злосны і хітры фашыст.

Ён зайшоў у свой двор і шпурнуў шакаладку ў лужыну, затаптаў босымі нагамі. Сеў на ганак і заплакаў, не ўголас, а па-мужчынску ціха і пакутліва. У сэрцы яго не было яшчэ той усвядомленай нянавісці да прышэльцаў, якая з'явілася пазней. Але пагарда да іх, агіда да іх гармоніка, недарэчнай ігры, шакаладкі ўжо з'явіліся. А самае галоўнае — знік страх перад імі. Напалоханы Сашыным расказам, яе хваробай, ён хоць і трымаўся і не паказваў выгляду, але ў душы вельмі баяўся іх прыходу. Цяпер жа, калі ўбачыў іх, сустрэўся тварам у твар, страх гэты знік.

Данік пайшоў на гарод. Заплаканая, збялелая Поля, убачыўшы яго жывога, узрадавалася і ў той жа час накінулася:

— О Божа! У мяне сэрца чуць не выскачыла... Дзе ты бадзяешся, валацуга ты няшчасны? Як табе не сорамна!..

— Немцаў сустракаў,— з панурай іроніяй адказаў Данік.

— Што ты плявузгаеш!

— Чаму гэта плявузгаю? Вунь яны па вуліцы ідуць, паўз нашу хату... Вунь, чуеш, каля фермы іх матацыклы траскацяць. А вы седзіце тут, як краты.— У яго голасе і словах было столькі сталага і мужнага, што старэйшая сястра разгубілася.

Спусціўшыся ў сховішча, ён гаварыў тым жа тонам:

— Саша! Ты жывая тут? — Гэта ён спытаў з іроніяй, а потым сказаў сур'ёзна, зусім па-сталаму: — Дарэмна ты так дрыжыш перад імі. Трэба гонар мець. Бачыў я ўжо іх... Адзін мне шакаладку даў. Сволач! — Данік злосна плюнуў на салому.— За цукерку хацеў купіць...

Словы яго нечакана зрабілі на Сашу дзіўнае ўражанне: быццам ёй адмянілі смяротны прысуд, які душыў яе, скоўваў, выклікаў прыступы гэтага дзікага страху, жахлівых уяўленняў. Не, у яе страх не знік, як у Даніка, але стаў цяпер нейкі звычайны, як у іншых людзей; гэта была боязь за самае дарагое — за дзіця, за сябе, за ўсіх блізкіх, страх перад невядомым — жыццём у акупацыі. Ці думаў хто калі-небудзь, што ім, маладым, вольным, шчаслівым, прыйдзецца жыць у акупацыі? Слова якое нязвыклае! Раней, калі Саша, чытаючы кнігі аб мінулым, аб Грамадзянскай вайне, сустракала гэтае слова, то ніколі не ўдумвалася асабліва ў яго сэнс. Яна ўпершыню зразумела гэты сэнс, калі яшчэ там, за Дняпром, прачытала прамову Сталіна. Але ўсё адно, да самай гэтай хвіліны ніколі не думала, што ёй прыйдзецца жыць на акупіраванай тэрыторыі. Спачатку яна верыла ў дзве вялікія ракі, потым, хворая, дала сабе клятву, што адступіць, уцячэ, памрэ, але з гэтымі нелюдзямі не астанецца. І вось — не адступіла... Памерці таксама нялёгка... Трэба жыць! Жыць! Але як жыць? Як бы яшчэ не верачы, што гэтае жудаснае слова «акупацыя» стала рэчаіснасцю, Саша амаль шэптам спытала:

— Ты праўда бачыў іх, Данік?

— Вельмі мне хочацца жартаваць!

— Значыцца, мы... у акупацыі.— Саша прамовіла вельмі сумна, але Поля ўсцешылася, што сказала яна гэта цвяроза, без роспачы, без крыку, як мог бы сказаць кожны здаровы чалавек. Поля вельмі баялася, што ў сястры пасля здарэння ў лесе нядобра ў галаве.

— У акупацыі? — Данік хмыкнуў.— На сваёй зямлі? — Ён, відаць, разумеў гэтае слова неяк інакш, па-свойму, ён не жадаў лічыць сябе зняволеным на сваёй зямлі, у сваёй хаце.

Размаўляючы, яны насцярожана прыслухоўваліся, што робіцца ў вёсцы. Страляніны не чуваць было нават удалечыні. Быццам вайна нечакана аддалілася на многа-многа кіламетраў. Але за ракой гурчалі маторы. Шум матораў пачаў хутка набліжацца, перайшоў у магутны гул, ад якога дрыжала зямля і на галовы ім сыпаўся пясок.

— Зноў самалёты,— заўважыла суседка.

— Не, танкі! — адразу вызначыў Данік.— Нашы ўзарвалі мост на шашы, і яны ідуць цераз рэчку каля фермы. Адразу туды выйшлі, быццам паказаў хто...

— Хіба мала яны закінулі шпіёнаў! — зноў спакойна і разважліва адгукнулася Саша.

— Каб узарваць мост, пайшоў на смерць Алёша Кошалеў. Запомніце яго імя! — гэтак жа ўрачыста, як сказалі яму, вымавіў Данік і цяжка ўздыхнуў.— А ўсё адно гэта не затрымала іх... Што наша рэчка!

Жанчыны не спыталі, хто такі Алёша Кошалеў і адкуль Данік усё ведае. Увогуле з таго моманту сёстры непрыкметна для сябе перасталі лічыць яго малым, за якім трэба глядзець. Цяпер ён пасталеў у іх вачах, яны слухалі яго ўважліва і, напэўна, падпарадкаваліся б любому яго загаду.

— Можа, і нашы дзесь вось так,— усхліпнула суседка, пачуўшы пра смерць.— Адступаюць, адступаюць, а потым...

— Няхай не адступаюць! — злосна перапыніла яе Саша.— Мой не адступае! Майму няма куды адступаць... Таму яны і трымаюцца там.

— Адкуль ты ведаеш? — здзівіўся Данік.

— Ты ж сам чытаў зводкі!

Хворая, Саша кожны дзень прасіла брата схадзіць да чырвонаармейцаў і дастаць газету. Са страхам шукала яна паведамлення ці намёку сярод горкіх навін, што здалі Мурманск. Паведамлення такога не было. Наадварот, яна прачытала радкі, якія пераканалі, што горад, дзе служыў Пятро, не здадзены, стаіць, змагаецца. І вельмі нават можа быць, што гэта ратавала яе. З дзіцячай наіўнасцю яна верыла, што там, дзе яе Пеця, не адступаюць, там змагаюцца па-сапраўднаму. А гэтая вера нараджала іншую: што ён жывы, што ён будзе жывы. Поля лепш, чым хто іншы, разумела сястру, а таму моцна тузанула брата за рукаў і сказала нечакана:

— Пайду я прынясу што-небудзь паесці. Не паміраць жа нам тут з голаду.

Пад вечар на паўднёвым усходзе, куды адступілі нашы, зноў загрымела артылерыйская кананада. Усе вызначылі: за лесам, дзе пачыналася ўкраінская зямля, разгараецца бой. Гэта недалёка — кіламетраў за пятнаццаць. І Саша з надзеяй, з душэўным трапятаннем услухоўвалася ў страляніну. А можа, гэта пералом? Можа, вернуцца нашы? Але не, дарэмна яна спадзяецца, вельмі ж ужо многа ідзе іх, гітлераўцаў.

Яны запаланілі вёску, шнырылі па ўсіх кутках. На вуліцы, у пяску, буксавалі іх машыны. Салдаты заходзілі ў двары, у хаты. Мабыць, ведаючы аб сховішчах, прайшлі па гародах і загадалі вяскоўцам вярнуцца ў хаты і заняцца справамі. Акупантам хацелася паказаць, што ўлада іх трывалая, што ў першыя ж гадзіны яны ўмеюць навесці належны парадак.

Саша, выглянуўшы са сховішча, убачыла немца, што стаяў пад грушай з аўтаматам на грудзях, і ў жудасці адскочыла назад: салдат здаўся ёй падобны да таго, які вёў іх на расстрэл. Саша, напэўна, асталася б там, у цёмнай яме, але плакала дзіця і выдавала іх. Немец цярпліва чакаў, пакуль вылезуць усе. Поля сілком выцягнула Сашу:

— Вылазь, дурная! А то, чаго добрага, яшчэ страляць сюды...

Немец, убачыўшы яе з дзіцем, прыветліва заківаў галавой, заўсміхаўся:

— О, мутэр!

Але Саша не верыла гэтай прыветлівасці, усмешкам і хавалася за Даніка. А хлопец глядзеў на ворага з нянавісцю.

Немец, мабыць, прачытаў гэтую нянавісць у яго вачах, бо раптам нахмурыўся, зусім іншым тонам выгукнуў: «О-о!», пагразіў Даніку кулаком, дулам аўтамата паказаў на хату:

— Лос!..

Ён давёў іх да хлява і пабег у суседні двор, дзе весела рагаталі яго сябры. Траянавы хутка зразумелі, чаму там такі рогат: з немцамі гутарыў «па-нямецку» дзед Андрэй, іх сусед. Гэты дзівакаваты і надзвычай балбатлівы дзед у Першую сусветную вайну, будучы ўжо немаладым чалавекам, абознікам, трапіў у палон і гады два прабыў у Нямеччыне. Цяпер дзед паказваў сваё веданне чужой мовы. Неўзабаве, калі немцы, добра нарагатаўшыся, разышліся, дзед з'явіўся ў хаце Траянавых, вясёлы, жвавы.

— А што, не казаў я вам? — выгукнуў ён з парога.— Я заўсёды казаў, што немцы — народ культурны. Ты глядзі, якую запальнічку мне падарылі. Фіць! — Дзед пстрыкнуў запальнічкай і задаволена, як дзіця, засмяяўся.— Дзе Саша? Няхай не дрыжыць, дурная. Гэта на яе нейкія бандыты напалі. У сям'і, кажуць, не без вырадка. Бандыты ўсюды ёсць...

Саша, вярнуўшыся ў хату пасля таго, як немцы выгналі іх са сховішча, адразу ж залезла з дачкой на печ, загарадзілася рознымі лахманамі, каб не было відаць. Дзедавы словы вельмі балюча ўразілі яе. У той час, калі сэрца абліваласяся крывёю ад вялікага гора і крыўды, ажно думкі блыталіся ў галаве, гэты стары блазен быццам радуецца ды яшчэ выхваляецца нейкай цацкай... Як яму не сорамна! З глузду ён з'ехаў, ці што? Саша не вытрывала, шэптам, але з болем, з душэўным крыкам папрасіла:

— Сціхніце, дзед! Гора прыйшло, а вы... Няўжо вы не разумееце, што здарылася?

— А дзед за запальнічку гатовы ўсё прадаць,— злосна кінуў Данік, які дагэтуль лічыў дзеда Андрэя сваім лепшым другам.

Стары, відаць, зразумеў недарэчнасць свайго ўчынку і спалохана замахаў рукамі:

— Што гэта вы! Хіба я не рускі чалавек? Гэта я толькі дзеля таго, каб Саша вельмі ўжо так не баялася... Што не ўсе яны такія, ёсць культурныя...

— Пабачым іх культуру...— адгукнулася Поля, якая маўкліва і, як заўсёды, старанна прыбірала ў хаце — падмятала тырсу, крэйду, што насыпаліся ад выбухаў.

— Пабачым, пабачым,— згадзіўся дзед і з незвычайнай для яго паспешлівасцю, быццам баючыся нейкай крамолы, выскачыў з хаты.

— Стары дурань! — вылаяўся Данік і, узрушаны, таксама пайшоў на двор.

За лесам няспынна грымела кананада. Данік разумеў, што там — вялікі бой, можа, нават такі, як бітва пад Барадзіно (хлопец прадаўжаў мысліць гістарычнымі катэгорыямі), інакш немцы не кідалі б столькі авіяцыі: эскадрыллі бамбардзіроўшчыкаў і штурмавікоў праносіліся над шашой і лесам, і зямля ўздрыгвала ад моцных глухіх выбухаў. Думкі і сэрца хлопца былі там, дзе грымелі гэтыя выбухі. Ён нават у глыбіні душы пашкадаваў, што такі бой разгарэўся не каля іх вёскі; тады, магчыма, і яму ўдалося б прыняць нейкі ўдзел і вёска праславілася б, як Барадзіно.

А немцы ўсё ішлі ды ішлі, і здавалася, не будзе канца плыні машын, танкаў, пяхоты. І ўсе яны спяшаліся туды, дзе грымеў бой, у вёсцы не затрымліваліся і нікога не

чапалі. Аднак Данік, хоць і не адчуваў больш страху перад імі, лічыў, што лепш усё-такі не мазоліць ім вачэй. Ён залез на вышкі ў хляве іназіраў адтуль. Пад вечар неба праяснілася, вялікі, ярка-чырвоны, быццам абмыты, шар выкаціўся з хмар і каціўся над далёкімі лугамі, каб неўзабаве ўпасці ў Сож. Дым вайны не засланяў сонца, яно заходзіла, як звычайна ў жнівеньскі дзень.

Зноў загулі самалёты.

«Вяртаюцца, адбамбіліся, гады»,— падумаў Данік і нават не стаў іх шукаць у небе — абрыдла глядзець на іх! Але што гэта за свіст? Блізкі выбух скалануў хлеў. Каля калгаснай фермы, дзе немцы зрабілі пераправу цераз рэчку, адзін за адным шугалі ўгору слупы агню і дыму. Данік убачыў свае, савецкія, самалёты з такімі роднымі чырвонымі зоркамі на крылах. Яны бамбілі пераправу.

Саша і Поля выскачылі з хаты і пабеглі на гарод, у сховішча.

— Гэта нашы! Нашы! — радасна крычаў ім Данік: яму здавалася недарэчным хавацца ад сваіх бомб. Хіба могуць яны пацэліць у сваіх?

Саша спынілася каля сховішча і, з Ленкай на руках, упершыню без страху сачыла за бамбёжкай. І ўпершыню ў гэты цяжкі, трагічны дзень яна з удзячнасцю падумала пра сваіх — пра гэтых вось лётчыкаў. Надзея, якая з'явілася, калі яна пачула кананаду, загарэлася з новай сілай: а можа, і сапраўды гэта пералом? Можа, нашы наступаюць?

Самалёты хаваліся за лесам і з'яўляліся зноў, заходзячы на цэль па некалькі разоў. Бомбы трапілі ў кароўнікі, і яны гарэлі яркім полымем. А крыху воддаль ад пажару гарэў агромністы шар сонца. У небе натужліва вылі і звінелі маторы, трашчалі кулямёты: недзе за хмарамі і дымам ішоў паветраны бой.

Поля клікала Даніка. Але таго і след прастыў.

— Гэты хлопец у магілу мяне звядзе,— скардзілася і плакала яна.

Саша маўчала: яна не адчувала асаблівага хвалявання за брата, і ёй было няёмка праз гэта. Дарэчы, яна не хвалявалася так, як Поля, і за бацьку, які пайшоў у армію. Няўжо яна стала такой эгаісткай, што, акрамя дачкі і мужа, больш ні аб кім з блізкіх не думае, не турбуецца за іх лёс? Не, гэта

нешта іншае. Бацька выконвае свой абавязак. А Данік... ён не маленькі, як думае Поля...

У хату яны не пайшлі больш — начавалі ў сховішчы. Данік вярнуўся позна ўвечары, калі нават кананада сціхла. Ён нічога не адказаў на папрокі старэйшай сястры. Але калі прымасціўся на саломе побач з Сашай, яна сэрцам адчула, як моцна ён узрушаны, і чамусьці асаблівая павага да брата агарнула яе. Яна моўчкі пагладзіла яму руку. Ён сціснуў яе пальцы і горача прашаптаў:

— Цяпер я ведаю, дзеля чаго пайшоў на смерць Алёша Кошалеў... Ты знаеш, колькі нашы накрышылі іх?.. Каб ты бачыла! Там стоўпілася столькі машын, танкаў... тэхнікі рознай... А нашы як далі! Адны трэскі ляцелі... І зброі навокал рознай!..

Раніцой, калі яны з Поляй адважыліся перайсці ў хату і палілі ў печы, каб згатаваць якое-небудзь снеданне, Данік прыбег з такім выглядам, што Саша ахнула ад радасці:

— Нашы?..

Хлопец панурыўся.

— Не.— Аднак вочы яго блішчалі.— Але каб ты бачыла, колькі іх вязуць адтуль, раненых і забітых! Машына за машынай! Як дровы — навалам... У школе шпіталь робяць...

На самым світанні кананада за лесам узнавілася і гадзіны дзве грымела яшчэ больш моцна, чым учора. Сашы здавалася, што грыміць яна не мацней, а бліжэй, і надзея, што патухла за ноч, зноў зацяплілася ў яе сэрцы. Але раптам кананада сціхла. Вельмі раптоўна — быццам лопнула нейкая струна. Цішыня гэтая балюча ўдарыла Сашу. Яна кінула карміць дзіця, шэптам спыталася ў сястры:

— Што гэта, Поля? Чаму яны сціхлі?

— Сціхлі... Кажуць, калі пушкі сціхаюць, то пачынаецца наступленне...

— Хто? Хто наступае, Поля?

— А хто ж іх ведае, Саша,— уздыхнула сястра.— На вайне, што ў карцёжнай гульні.

У гэты момант і ўбег узрушаны Данік.

Калі Саша пачула пра шпіталь, згасла апошняя іскра гэтай надзеі. У грудзях зрабілася пуста і холадна. І ўсё стала абыякава для яе, нішто яе больш не цікавіла, не магло запаліць.

— Значыцца, нашы адступаюць,— ціха і сумна сказала яна.— Чуеш — сціхла?..

— Сціхла,— паўтарыў Данік; ён, мабыць, толькі цяпер звярнуў на гэта ўвагу.

Прыйшоў нейкі незнаёмы ў цывільным, малады, высокі, інтэлігентна апрануты, і, тыцкаючы пальцам, груба сказаў:

— Усім да школы... Ты,— на Даніка,— з лапатай. Ты,— на Полю,— з вядром і анучамі. Мыць... Ты,— ён сустрэў Сашын позірк, поўны нянавісці, і сумеўся.

— Яна хворая,— сказала Поля.— І дзіця хворае.

Фашысцкі прыслугач грэбліва паморшчыўся і, пакінуўшы Сашу ў спакоі, папярэдзіў:

— Не ўздумайце марудзіць! Гэта вам не калгас!

— Здраднік,— прашаптала Саша, калі ён выйшаў.

Яна ўпершыню ўбачыла здрадніка, і яе вельмі ўразіла, што ён такі малады, інтэлігентны; яна ўяўляла, што здраднікі — нейкія вырадкі, крэціны, пачвары ці старыя барадатыя кулакі.

— Халуй! Сволач! — вылаяўся Данік.— Калі з лапатай, каб капаць ім магілы, калі ласка... ахвотна пайду.

Поля, баючыся пакідаць Сашу адну, параіла, каб яна пайшла да дзеда Андрэя, у нявесткі якога таксама грудное дзіця.

Пра небяспеку і гора многа гавораць тады, калі яны далёка і ёсць яшчэ надзея пазбегчы навалы. Калі ж гора стаіць на парозе, калі небяспека побач і страх завалодаў людзьмі, у такія хвіліны стараюцца гаварыць пра самае звычайнае, простае, але пра тое, што вельмі дарагое. Саша і Аксана, астаўшыся адны, пачалі гаворку пра сваіх маленькіх. Быццам тое, што «ў Ленкі паносік», а «ў Мішкі прарэзаўся першы зубок», было для іх самым галоўным у жыцці ў гэты момант. Яны не ўсведамлялі, што размова аб дзецях узнікла ад тайнага жадання забыцца на ўсё, што адбываецца навокал. Жанчыны як бы хацелі перахітрыць самых сябе. Але гэта не проста было зрабіць. Чым больш яны гаварылі пра дзяцей, тым больш выразным рабілася адчуванне той небяспекі, што пагражала ім, іх маленькім, усім людзям.

Аксана раптам сціхла, насцярожана прыслухалася. У хаце санліва гулі мухі. Каля школы чулася чужая гаворка як напамінак пра гэтую небяспеку. Яшчэ больш суровым напамінкам прагучаў стрэл.

Яны ўздрыгнулі.

— Я баюся,— прашаптала Аксана.— А помніш, я была самая смелая. Помніш, як мы за раку хадзілі, а хлопцы напалохаць нас хацелі...

Саша не помніла, бо не хадзіла ніколі разам з ёй, Аксана была старэйшая, але ківала галавой: усё помню.

Маладуха так захапілася расказам пра сваю ўяўную смеласць, што яны не пачулі, як прыйшоў Данік. Саша першая ўбачыла яго ў дзвярах. Ён стаяў, ухапіўшыся за вушак, з белым як палатно тварам, на якім скамянелі ўсе жывыя юнацкія рысы. Ахнуўшы, Саша памкнулася да яго. Першая яе думка была аб Полі.

— Дзеда Андрэя забілі.— Голас хлопца быў ненатуральна гучны і зусім чужы. Саша не пазнала яго, ёй здалося, што гэта сказаў нехта другі, з-за дзвярэй.

Аксана заціснула далонямі рот, каб не закрычаць. Потым, без плачу, без слёз, схапілася за грудзі і як бы задыхнулася.

— Ім здалося, што ён вельмі старанна капае магілу... спрытней за ўсіх...

Саша ўсхліпнула, але сказала сурова і бязлітасна:

— Дзеду хацелася пабачыць іх культуру.

Данік паглядзеў на яе, быццам не пазнаючы, у роспачы стукнуў кулаком аб вушак, потым упёрся ў гэты вушак ілбом і ледзь чутна застагнаў:

— У-у-у...

IV

Жыццё ў акупацыі...

Па-рознаму яно пачыналася для людзей. І напачатку мела свае асаблівасці, свае адметныя рысы ў гарадах і сёлах. Часткова гэта залежала ад акупантаў. Мэта ў іх была адна, арганізацыя ўлады амаль аднолькавая, і большасць з

кіраўнікоў «новага парадку» выконвалі загады «фюрэраў» з дакладнасцю аўтаматаў. Тупыя расісты, чалавеканенавіснікі пачыналі з тэрору, з масавых забойстваў. Аднак былі і такія, больш разумныя і хітрыя, якія спрабавалі праводзіць палітыку «перніка», заігрывання і дэмагагічных абяцанняў, асабліва ў адносінах сялянства.

Такім чынам, акупацыйныя ўлады мелі пэўны ўплыў на форму ўзаемаадносін паміж людзьмі. Змест жа жыцця, яго пульс вызначаўся іншым — настроем народа. А настрой быў усюды аднолькавы: нянавісць да прышэльцаў. Народ, які ведаў волю, шчасце, не мог ні на хвіліну схіліць галавы перад захопнікамі. Народ змагаўся.

Барацьба гэтая таксама пачыналася па-рознаму. У адных мясцінах сілы супраціўлення выяўлялі сябе ў першыя ж дні акупацыі, стыхійна і бурна. У другіх — яны раслі паступова, па распрацаванаму партыяй плану, і, дасягнуўшы патрэбнай магутнасці, наносілі ворагу цяжкія ўдары. Так было з партызанскімі злучэннямі, што выраслі з невялікіх атрадаў і груп камуністаў. Але ў многіх вёсках і гарадах у першыя месяцы акупацыі групы патрыётаў вялі ўпартае, глыбока падпольнае, самаахвярнае змаганне з фашыстамі, не ведаючы аб існаванні партыйных цэнтраў ці не знаходзячы з імі сувязі, пакуль цэнтры не знаходзілі іх. Пераважна гэта была моладзь, выхаванцы камсамола — «маладагвардзейцы» нашай зямлі. Юнакі і дзяўчаты выконвалі свой абавязак перад Радзімай гэтак жа, як іх бацькі і браты, як вучылі іх школа, камсамол, літаратура і кіно. Шмат было стыхійнага ў іх дзеяннях і ўчынках. Але колькі было непаўторнага гераізму! Многія з гэтых герояў загінулі. Другія асталіся невядомымі — сціплыя людзі, яны не гаварылі пра сябе. А потым прайшлі гады, многае забылася...

Саша жыла як у тумане ці ў цяжкім сне: дзе канец гэтай невядомасці, бераг, да якога трэба ісці? Дзе фронт, нашы? Дзе Пеця? Што робяць астатнія людзі тут, у акупацыі? Няўжо ўсюды такое жыццё, калі ніхто нічога не ведае, калі людзі дбаюць толькі аб тым, як пражыць далей?

Фронт аддаліўся. Нямецкія вайсковыя часці адышлі і нібы панеслі з сабой той страх, у якім жыла Саша да іх прыходу і потым некалькі дзён пасля забойства дзеда Андрэя. Стала ціха і пуста. Але ад цішыні гэтай не стала лягчэй.

Саша капае бульбу, не сваю — чужую. Час ад часу бульбіны пачынаюць варушыцца ў зямлі, як жывыя, падвойваецца дужка кошыка, цяжэе ў руках капаніца. Саша садзіцца ў разору. Гойдаецца зямля, плыве некуды ўбок сасняк, што пачынаецца ў канцы загона. Але не гэтая хвілінная слабасць палохае. Страшна ад таго, што бываюць моманты, калі здаецца неверагодным, нерэальным тое шчасце, якое было нядаўна. Хіба можна паверыць, што ў яе, вось такой — у даматканай світцы, з парэпанымі пальцамі,— магло быць столькі шчасця і радасці? Яна сама не верыць у тыя месячныя ночы, калі яны хадзілі з Пятром па полі. Нерэальнымі здаюцца амбулаторыя, пакой у Анінай хаце, дзе стаяў яе маленькі ложак, на якім, аднак, ім з Пецем ніколі не было цесна... Усё гэта — як у сне... Пра што яны гаварылі з Пятром у тыя ночы? Пра ўсё... Пра Чарнышэўскага, напрыклад, пра Веру Паўлаўну... Божа мой! Няўжо сапраўды яны вялі такія размовы? Няўжо было жаданне гаварыць пра кнігі, пра кіно? Якое ж гэта было казачнае жыццё! Цяпер няма кніг, няма з кім пагутарыць пра іх, успомніць мінулае. Быў Данік, брат, з якім можна было б часам прыгадаць і кнігі і кіно... Але і брата цяпер няма ў яе, няма, хоць і жывуць яны ў адной хаце. Як нечакана ўсё рушылася, развалілася. Каб не дачка, не маленькая Ленка, не было б сэнсу і жыць... Клопат пра яе, пра дачку, каб накарміць малую і самой не памерці з голаду, прымушае Сашу капаць чужую бульбу. Як наймічка... Не ў багацці яна жыла, без маці вырасла, здаралася, што часам і раней, да тэхнікума, рабіла ў людзей, але каб адчуваць сябе наймічкай — такога і ў сне ніколі не было. Ды хіба такое магло з'явіцца тады, калі яна была гаспадыняй свайго лёсу?

Пакуль яна жыла за Дняпром, а Поля ў горадзе (старэйшая сястра працавала на чыгунцы), раздзялілі і зжалі збажыну. На іх не выдзелілі, толькі на бацьку і на Данілу — хто рабіў у калгасе. Але ўсё забрала мачыха, прыхапіўшы і тое, што вырасла на сядзібе. Яна без шуму, «культурна і ветліва», перабралася да роднай дачкі, як толькі бацька пайшоў у армію, а Поля вярнулася з горада. Сёстры ніколі ні перад кім не схілялі галоў, і ў іх нават думкі не было, каб прасіць ці патрабаваць ад мачыхі вярнуць іх дабро, хоць сваякі і

суседзі раілі ім гэта зрабіць. А потым, як кажуць, «на каго людзі, на таго і Бог». Дзялілі на едакоў пасевы калгаснай бульбы. Цягнулі жэрабя — каму які загон. Бульба была ўвогуле кепская: ад пачатку вайны ніхто яе не даглядаў, не палоў, не акучваў. А Полі «пашанцавала» выцягнуць загон, па сутнасці, зусім пусты, дзе ў траве цяжка было знайсці каліва. Некаторыя жанчыны нават патрабавалі перадзяліць, але пачуўся голас: «Нічога, яны пры Саветах пажылі, вунь усе вывучыліся, як пані, хадзілі» — і Поля горда адмовілася ад перадзелу.

Але жыць трэба, наперадзе суровая, галодная зіма. І сёстры капаюць у суседзяў, якім пашчаслівіла, за пяты кош.

Пяты кош...

Саша глядзіць на кошык, напоўнены бульбай, і не можа ўспомніць, які гэта па ліку. Чатыры яна высыпае ў гаспадарскія мяшкі, пяты — у свой. Іх ніхто не правярае: няма ў вёсцы сям'і больш сумленнай, чым сям'я Фёдара Траянава, гэта ведаюць усе. Саша часта забывае лік кашам, а таму часта і пяты і шосты высыпае гаспадарам. Калі побач Поля, яна лічыць. Цяпер Полі няма. Саша адчувае, што гэта больш, чым чацвёрты кош, але не зусім упэўнена, што гэта так. Ёй шкада сваёй працы, сваіх парэпаных рук, якія моцна баляць. Слёзы засцілаюць вочы, зноў двоіцца ручка кошыка, зноў плыве сасняк... Яна ў злосці высыпае бульбу сабе, упершыню, калі не ўпэўнена ў ліку. Гэта — надзел чалавека, які кінуў сваіх, уцёк з арміі, вярнуўся дадому і цяпер вельмі стараецца разбагацець. Саша ненавідзіць гэтага чалавека. Яна моцна пасварылася з Поляй, калі тая аднойчы пашкадавала, што іх бацька не вярнуўся. «Старому пяцьдзесят шосты год, які з яго салдат». А з братам яна пабілася самым сапраўдным чынам і ўжо, можа, месяц не гаворыць...

Наляцеў вецер, прыгнаў хмару. Сыпануў дробны асенні дождж. Саша ўскінула на галаву пусты мяшок, ледзь разагнула стомленую спіну.

На полі яшчэ некалькі такіх жа маркотных схіленых постацей. Бліжэй за ўсіх — старая Крыўчыха, бабулі гэтай каля васьмідзесяці год. Яна адзінокая і ўжо шмат дзён сама выбірае свой загончык, адзін-два кашы ў дзень.

Саша колькі разоў памагала бабулі. Раптам ёй здалося, што старая галосіць. Прыслухалася — не, не галосіць, спявае, але так журботна, што ў Сашы сціснулася сэрца. Услухалася лепш і разабрала асобныя словы:

Ой, сеяла, ды не валачыла.
Усё поле слёзкамі заліла...

Ніколі яна не чула гэтай песні, гэтага нуднага, гаротнага матыву. Але словы... словы недзе чула. Сашы вельмі хочацца ўспомніць, дзе, ад каго чула яна словы гэтай песні.

Дождж сціх. Ён цэлы дзень ідзе вось такімі перагонамі: наляціць, сыпане і нечакана сціхае. І нясмелы нейкі, як бы несапраўдны. Пайшоў бы надоўга — можна было б пайсці дадому, да Ленкі, пагрэцца і адпачыць.

Саша знаходзіць у пажоўклай і палеглай траве каліўе бульбы, выварочвае капаніцай мокрую зямлю, у якой блішчаць белыя бульбіны, выбірае іх і думае аб песні. І раптам успамінае: быў у іх школе настаўнік літаратуры, малады паэт, які ведаў многа розных песень, прымавак. Дык вось ён некалі дэкламаваў словы гэтай песні, прыводзячы яе як узор фальклору прыгоннага часу.

«Вось якія песні вярнуліся... Прыгонныя... А дзе цяпер той настаўнік? Ён жа да гэтага года быў у іх школе, вучыў Данілу. Яны на рыбу разам хадзілі.— Думкі яе зноў вярнуліся да брата.— Эх, Данік, Данік... Добрыя людзі цябе вучылі... Я цябе так любіла, няньчыла малога... А ты... Куды ты хілішся? За кім ты ідзеш? Няўжо яны запаланілі тваю душу? Няўжо ім удаецца паланіць і душы людзей?»

З болем, злосцю і крыўдай думала яна пра брата. Але разам з тым упершыню ўзнікае думка, што сама яна, магчыма, таксама няправільна паводзіць сябе ў адносінах да яго. Паступова думка гэтая робіцца перакананнем. Ён дзіця яшчэ, блазнюк, захапіўся вайной, зброяй. Трэба змагацца за яго, трэба адарваць ад Кузьмы.

Кузьма — іх стрыечны брат — першы паліцэйскі ў вёсцы, цяпер начальнік паліцэйскага паста, «вярхоўная ўлада», як ён сам крычаў п'яны. «Галоўны здраднік» — назвала яго Саша. Здрада Кузьмы была вельмі балючым ударам, і яна дагэтуль не можа зразумець, што штурхнула маладога чала-

века з працавітай сям'і на такі шлях. Саша разумела, калі ў паліцэйскія пайшоў сын кулака Гніды. Не здзівілася, калі ў паліцыю запісаўся былы яе аднакласнік Колька Трапаш. Гэты і ў школе быў мацюжнік, курэц, карцёжнік, ды і сям'я ў іх нейкая бесталковая, іх у вёсцы «цыганамі» завуць. А Кузьма з такой паважанай сям'і. Маці яго — родная сястра іх бацькі — надзіва сумленная, набожная і працавітая жанчына. Калі расказвалі, што ніхто не бачыў, калі яна спіць і есць, то Саша верыла гэтаму. Цётка Хадоска перакусвала непрыкметна каля прыпечка, «зводзіла вока» дзе-небудзь у разоры, за полівам, ды зноў за працу. Кузьмоў бацька, кажуць, не такі быў цягавіты, працавіты, часам заглядаў у чарку, але і яго ўспаміналі з павагай. Саша яго помніла слаба, ён памёр у першы год калектывізацыі. На руках у цёткі асталося шасцёра дзяцей, і яна ганарылася, што выгадавала іх, «вывела ў людзі». У навуку яны не пайшлі, толькі адна з малодшых дачок скончыла педвучылішча. Набожная Хадоска і не імкнулася іх вучыць. «Няхай на зямлі працуюць,— казала яна.— Зямелька ўсіх пракорміць». Але дзеці чамусьці не затрымліваліся ў калгасе. Самы старэйшы прыстаў у прымы ў горадзе, у сям'ю рабочага. Адна дачка выйшла за лесніка, другую звёз нейкі шафёр-украінец. І самы працавіты, па маці, быў Кузьма. У школе ён вучыўся не надта, але затое з малых год карміў сям'ю рыбай. Ён быў такі заўзяты і ўдалы рыбак, што вопытныя старыя рыбаловы ахвотна раіліся з ім і бралі з сабой. А яшчэ ён захапляўся коньмі. Скончыўшы гадоў за сем чатыры класы, Кузьма стаў калгасным пастухом. Потым наняўся на конезавод і працаваў там год пяць. Ажаніўся. Прывёз да маці жонку. І раптам гады за два перад вайной апынуўся ў рыбалавецкай арцелі недзе на Дняпры. Адтуль ён і з'явіўся ў родную вёску паліцэйскім, неўзабаве пасля ўступлення немцаў, да якіх ён трапіў, як высветлілася, яшчэ месяца паўтара назад, пад Жлобінам.

Пакуль ён быў проста паліцэйскі, і прытым адзін у вёсцы, то не надта мазоліў вочы людзям — больш сядзеў дома. Але як толькі стаў начальнікам паста і атрымаў пад сваю ўладу яшчэ двух чалавек, адразу ж чамусьці зрабіў абход усіх сваякоў. Зайшоў да Траянавых. Ужо крыху падвыпіўшы недзе, павітаўся гучна, весела:

— Хайль, дарагія сёстры!

Саша адвярнулася. Гэта яго ўкалола, і ён з іроніяй спытаўся:

— Не падабаецца табе, сястрычка? Вядома, дзе табе будзе падабацца! Ты ж камсамолка, цябе савецкая ўлада вывучыла...

— А цябе яна крыўдзіла? — злосна кінула Саша.

— Не крыўдзіла, але і ходу не давала. Я мазалямі кавалак хлеба зарабляў.

— Куды ж гэта табе ходу не давалі?

— Гаспадаром стаць.

— Кулаком?

— Вось-вось... Так ваша ўлада і разважала: чуць станавіўся чалавек на ногі, багацеў — кулак, на Салаўкі яго...

— Вось якое нутро ў цябе! Не ведала. Значыцца, ты спадзяешся, што немцы за тваю службу маёнтак табе дадуць? Панам зробяць? А мы будзем батрачыць у цябе... так?

Поля спалохана падавала Сашы знакі: маўчы, каму ты гаворыш, думай!

Кузьма заўважыў гэтыя знакі.

— Што ты там моргаеш, Поля? Баішся? Не бойся. Я ж не чужы — брат... Я сваіх не пакрыўджу. Толькі каб мне сваякі ножкі не падстаўлялі... Падтрымаеце мяне — будзеце жыць і гора не мець... А што думае Саша — гэта мне і так вядома. Нічога... Перамелецца — мука будзе. Людзі не адразу разумеюць...

— Адзін ты адразу разумны стаў,— зноў не вытрывала Саша.

Ён не адказаў на гэты закід — гаварыў далей:

— А батракамі ніхто вас рабіць не думае. Кожны будзе жыць, як ён хоча. Ніхто не будзе стукаць у вокны: выходзь на работу! Ты на доктара вучылася — ідзі працуй доктарам. Я ўжо гутарыў у воласці з бургамістрам, каб медпункт у нас зноў адкрыць. Для цябе, Саша, месца... Гарантую!

— Дзякуй за ласку! — з горкай іроніяй адказала Саша, з нейкай дзіўнай асалодай адчуваючы, як расце ў ёй непрыстойнае жаданне — плюнуць брацiку ў чырвоную п'янаватую фізіяномію.

— Ты ж не немцаў будзеш лячыць — сваіх людзей...

— Не чапай яе, Кузьма,— рашуча запярэчыла Поля, звяртаючыся, аднак, да паліцэйскага ветліва.— Яна не-

здаровая. Не трэба ёй працаваць... Як-небудзь так пражывём.

— Пратэстуеце? — кісла ўсміхнуўся Кузьма. — Ну што ж, пратэстуйце. Толькі,— ён пагразіў пальцам,— глядзіце ў мяне, каб з гэтай хаты не выходзіла ні слова, ні яшчэ што. Ты, Поля, разумная дзяўчына. Я цябе ведаю і спакойны. А ты, Саша, глядзі, язык не распускай. Я за цябе адказваць не жадаю. Помні: непарадкаў ніводная ўлада не любіць.

— Не бойся, Кузьма, мы не падвядзём,— заспакоіла яго Поля.

Саша адчувала, што калі пойдзе гаворка далей, то сваркі ім не пазбегчы, можа і горшае што здарыцца. А таму, узяўшы з калыскі Ленку, дэманстратыўна палезла на печ. Яна заўсёды там хавалася, калі, здаралася, у хату заходзілі немцы. Цяпер яна вырашыла, што будзе гэтак жа хавацца і ад паліцэйскіх, у тым ліку і ад Кузьмы. Няхай ведае, якая ў іх улада. А гутарыць з ім — прыніжаць сваю годнасць. Больш яна не скажа ні слова. Чаму ён сядзіць? Ішоў бы прэч хутчэй! Навошта Поля заводзіць з ім гаворку: пра здароўе цёткі, пра надзелы зямлі?

У хату ўвайшоў Данік.

— А-а, Даніла! Здароў, брат! — Кузьма падняўся насустрач, высока ўзняў руку, каб ляпнуць далоня ў далоню, пасяброўску, з размаху. Але Данік працягнуў руку не адразу, і шчырага прывітання, як чакаў Кузьма, не атрымалася. А Данікаў позірк, нахмураны, непрыветлівы, спадылба, урэшце вывеў паліцая з раўнавагі.

— Што ты на мяне ваўком глядзіш? — спытаў ён спачатку ціха, потым злосна крыкнуў на ўсіх: — Што вы на мяне ўсе так гледзіцё? Як на ворага... Што я вам зрабіў? — Акрамя злосці, у гэтым выкрыку былі роспач і страх.

— Гэта табе здаецца, Кузьма,— проста, па-сваяцку, але як старэйшая малодшаму сказала Поля.— Даніла на ўсіх так глядзіць. У яго характар такі.

Але Кузьмаператварыўся ўжо з брата ў суровага начальніка паліцэйскай варты, які адчуваў сваю ўладу над людзьмі. Ён караў за позірк, які яму не спадабаўся.

— Вось што... ты, брат,— злосна кінуў ён Данілу,— не думай, што мне невядома, чаго ты па лесе бадзяешся... Людзі бачылі. Зараз жа здай усё, што знайшоў... А то я буду з табой інача гаварыць!

Юнак пільна паглядзеў на паліцэйскага, і раптам твар яго расплыўся ад шырокай задаволенай усмешкі.

Нічога не сказаўшы, Данік выйшаў з хаты. А хвілін праз пяць прынёс рускую вінтоўку без затвора, нямецкі аўтамат з раструшчаным прыкладам і цынкавую скрынку патронаў.

— Вось што я знайшоў... Бяры,— працягнуў ён зброю Кузьме ўсё з той жа задаволенай усмешкай, быццам радаваўся, што знайшлося каму перадаць.

Поля ажно ахнула:

— Божа! Ты хаваў такія цацкі? На шыбеніцу захацеў, дурань гэткі?

— Усё? Больш нічога няма? — сурова спытаў Кузьма, разглядаючы аўтамат і мяркуючы, ці можна яго адраманатаваць: было б чым выхваляцца перад іншымі начальнікамі пастоў, бо зброі ў іх не густа.

— Я на шыбеніцу не хачу,— адказаў Данік.

Кузьма зарагатаў і па-сяброўску ляпнуў яго па плячы:

— Правільна, братыш! Малайчына. Глядзі, які ты вырас! Я цябе гады два не бачыў! Мужчына! Будзеш правільна весці сябе — у паліцыю вазьму. Хочаш?

— Поля не пусціць,— пакорліва і наіўна схіліў галаву Данік, хітра іграючы на пачуццях старэйшай сястры.

А Поля пасля гэтых слоў як бы зноў адчула сваю ўладу над ім.

— Што ты плявузгаеш, Кузьма? Паліцая знайшоў! Вось вазьму папругу — усю скуру спушчу на тваім паліцаі. Я яму яшчэ гэтыя цацкі не дарую. Знайшоў, што цягнуць у хату!

— Ого, строгая яна ў цябе... маці,— жартаўліва штурхнуў Кузьма юнака.

— Каб і цябе маці з рук не выпусціла, можа, чалавекам астаўся б,— забылася Поля на асцярожнасць, якой прытрымлівалася ў размове з ім.

Кузьма нахмурыўся:

— Ну, ну... Што ж я цяпер — не чалавек, па-твойму?

«А ты яшчэ лічыш сябе за чалавека? Здраднік ты, а не чалавек!» — вельмі хацелася Сашы крыкнуць з печы ў твар яму гэтыя пякучыя словы. Але яна стрымалася: навошта нажываць ворага, ды яшчэ і раздражняць яго. Выконваючы зарок, які дала сабе, яна не сказала больш ніводнага

слова, пакуль паліцай размаўляў з Данілам і Поляй. Калі ж ён нарэшце, забраўшы зброю, развітаўся, па ўсім відаць, задаволены сваім візітам, сваёй уладай над людзьмі, Саша са зняважай кінула брату:

— Заечая твая душа!

Ён змаўчаў на гэтую абразу. А Поля ўхваліла яго ўчынак:

— Што ты, Саша! Дзякуй Богу, што ў яго хапіла розуму аддаць гэта Кузьме, усё-ткі свой чалавек. Немцы знайшлі б — страшна падумаць, што маглі б зрабіць.

Але калі праз колькі дзён Данік пачаў наведвацца ў школу, дзе размяшчаўся паліцэйскі пост, і весці сяброўства з Кузьмой і Колькам Трапашам, Поля катэгарычна запатрабавала:

— Каб нагі тваёй там не было!

Саша падтрымала старэйшую сястру:

— Як табе не сорамна! А яшчэ плакаў над Алёшам Кошалевым і над дзедам... А цяпер цябе да паліцаяў пацягнула. Эх, ты!.. Хутка сваіх людзей пачнеш забіваць...

— Не ваша справа,— агрызнуўся брат.

— Ах, не наша?.. Ну дык ідзі!.. Ідзі, ліжы немцам боты, кланяйся ім...

Юнак здрыгануўся, нейкі дзіўны цень упаў на яго твар. Ён утаропіў на Сашу вочы, у якіх таксама быў гэты цень. А яна, расчырванелая, узрушаная, з гнеўным бляскам у вачах, стаяла перад ім і сціскала кулакі.

— Адзін ужо робіць гэта... твой брат і дружок... Ідзі і ты! Струп няшчасны!

«Струп» — вулічная мянушка Данілы. Ніхто не помніў, з якой прычыны яе далі, але хлопец страшэнна крыўдзіўся. Ён адразу ўзгарэўся і, мабыць, не знайшоўшы больш нічога, чым можна ў адказ дапячы сястры, крыкнуў:

— Ты!.. Ты прыехала са сваёй байстручкай, дык маўчы!..

Саша задыхалася ад абразы. Яе Ленку, самае дарагое і светлае, што ёсць у яе пакутлівым жыцці, жывую часцінку Пеці, які ў гэты момант, магчыма, сцякае дзе-небудзь крывёю,— іх роднае дзіця назвалі такім зняважлівым словам!.. Хіба можа маці пачуць такое і вытрываць? Саша ўляпіла брату аплявуху. Ашаломлены, ён спачатку адскочыў, ухапіўся за шчаку, а потым тыграм кінуўся на Сашу, учапіўся

ў яе валасы, тузаў і сам стагнаў і плакаў. А яна ашалела малаціла яго кулакамі куды папала. Добра, што Поля была ў хаце і хутка разбараніла іх.

І вось ужо каля месяца яны не гавораць, не глядзяць адно аднаму ў вочы. Сашы вельмі цяжка праз гэта. Толькі цяпер вось стала крыху лягчэй, калі вырашыла больш не маўчаць, а пачаць змаганне за брата.

Прыехаў сын гаспадара — хлапчук год трынаццаці — забраць бульбу. Ім прыйшлося добра папацець, пакуль ускінулі на воз не па сіле цяжкія мяшкі. Саша нават узлавалася ў думках: «Дзіця прысылаюць. Самі не могуць прыехаць... Мала што капаеш на іх, дык яшчэ і мяшкі цягай...»

Адчуўшы зноў горкую крыўду за свой найміцкі лёс, яна хутка пайшла ад воза. Але хлапчук, які, магчыма, дзіцячым сэрцам, чыстым і чулым, зразумеў яе, дагнаў і даверліва прашаптаў:

— Саша, хочаш, навіну скажу?

— Якую навіну?

— Паліцаі партызана злавілі.

Саша, здзіўленая, павярнулася да яго:

— Партызана? Сапраўднага?

— Ну, так! Кузьма яго ў калодзеж пасадзіў. Кажуць, гэта нейкі сваяк Ганны з Рэпак. Яна хлеб для партызан пякла, а ён, відаць, прыйшоў, каб забраць гэты хлеб. А Марфа Вугняўка падгледзела, што ў Ганны ўсю ноч у печы паліцца, ды ўзяла Кузьму сказала... Паліцаі яго на вышках знайшлі. А цяпер у школьны калодзеж пасадзілі... Як ты думаеш, што яны зробяць з ім?

Да Сашы кепска даходзіў сэнс апошніх слоў хлопчыка, бо навіна гэтая была для яе вельмі нечаканай і моцна ўсхвалявала: побач партызан! Зусім іншыя думкі завалодалі ёю.

— Бацька кажа — расстраляюць. У немцаў такі загад ёсць: партызанаў страляць.

Хлапчук цмокнуў на каня і паехаў, а Саша асталася стаяць з капаніцай у руках. Яна глядзела ўдалячынь, дзе відны былі хаты, але нічога не бачыла, акрамя туманнага вобраза партызана. Ёй вельмі хацелася ўявіць гэтага чалавека ў яго рэальным чалавечым абліччы, але перад вачамі паўставалі па чарзе: Пеця, бацька, Уладзімір Іванавіч, сакратар райкома, стары рэчыцкі доктар, адным словам, усе самыя дарагія,

блізкія людзі і ўсе тыя, каго яна паважала ў жыцці. Можа, як ніколі яны паўставалі вельмі яскрава, таму яна доўга не краталася з месца, адчуваючы ў душы нейкую радасць, узнёсласць і рашучасць. А думкі — як маланкі, светлыя і страшныя, радасныя і небяспечныя...

Значыцца, не хлусілі людзі, калі казалі, што не толькі недзе за ракой, у Палессі, але і тут, блізка, у іх лесе, ходзяць партызаны. А ў вёсцы ёсць людзі, якія смела памагаюць ім. Гэтая Ганна з Рэпак, як яе называюць усе, маладая ўкраінка, непрыкметная жанчына, ціхая і добрая. У яе двое дзяцей, муж у арміі. Аднак яна не пабаялася пячы хлеб партызанам...

А вось яна, Саша, жыве, як на нейкім туманным востраве,— нічога не бачыць, нічога не чуе і ўсяго баіцца. А брат горнецца да паліцаяў... Яна ўся халадзее ад думкі, што Даніла можа быць нейкім чынам замешаны, мець дачыненне да арышту партызана. Хто ён, гэты чалавек? Малады? Стары? Здрада загубіла яго. Чаму людзі такія жорсткія і бязлітасныя? Хаця няма чаму здзіўляцца. Усе ведаюць Вугняўку — дачку кулака, якая свайго ўласнага мужа, за якога выйшла, каб не трапіць на Салаўкі, зжыла са свету. Але Кузьма... Кузьма з беднай сям'і і такі падлюга! Садзіць жывога чалавека ў смярдзючы калодзеж! Ніхто б ніколі да гэтага не дадумаўся, ён вось, гад, дадумаўся. Спачатку пасадзіў туды двух вяскоўцаў, якія адмовіліся ісці на рамонт шашы, а цяпер — партызана.

Саша добра ведала гэты калодзеж — шырокія бетонныя трубы, слізкія і зялёныя. Школа — былы папоўскі дом. Пры жыцці папа ў калодзежы была празрыстая сцюдзёная вада. У Сашы захаваўся ў памяці ўспамін маленства: яна памагала маці паіць папоўскіх кароў і круціла калаўрот, гэта было надзвычай цікава. Праз год, пасля таго як папа выселілі і зрабілі ў доме школу, вады ў калодзежы не стала. Бабкі плявузгалі, што ад Бога гэта: выгналі «айца святога» — перасох калодзеж. Але кожны вучань ведаў, па якой прычыне знікла вада: дзеці кідалі туды пясок, цэглу, смецце, і крыніцы забіліся. За дзесяць год накідалі столькі, што калодзеж напалавіну памялеў. Аднак і цяпер ён яшчэ даволі глыбокі, і адтуль патыхае гнілой вільгаццю. І вось там, у гэтай гнілоце, сядзіць чалавек з чыстым сэрцам, які не шкадаваў свайго жыцця за народ. У Сашы гарэла душа ад думак пра невядомага

партызана. Яна паспрабавала працаваць, але капаніца вывальвалася з рук. Тады яна кінула ўсё і пайшла дадому...

— Чаму так рана? — здзівілася Поля, якая ўбірала капусту з гарода.

— Абрыдла мне! — злосна адказала Саша.— Што я, наймічка? Няхай яна згніе, іх бульба!

Старэйшая сястра разумела яе, таму не сказала ні слова, толькі ўздыхнула: клопат аб сям'і ляжаў на яе плячах.

За адным заняткам Саша забывалася на ўсё іншае — калі карміла дачушку, гуляла з ёй. Ленка ачуняла і ў чатыры месяцы была тоўсценькая, рухавая і — кожнай маці так здаецца! — надзвычай разумная для свайго ўзросту. Яна ўжо ўмела смяяцца, хапаць за валасы, за нос, драпацца. І ўсё больш і больш рабілася падобнай на бацьку. У яе ўсмешцы Саша пазнавала ўсмешку Пятра, яго прыжмур вачэй, яго зморшчынку на лбе, а радзімая плямка на мочцы вушка была такой дакладнай копіяй, што маці заўсёды смяялася, гледзячы на яе.

Саша зайшла ў хату на пальчыках, бо Поля сказала, што Ленка спіць, але малая не спала: моўчкі ляжала ў калысцы і смешна лавіла сваімі пухлымі ручкамі чырвоны шарык, прывязаны над ёй. Саша радасна кінулася да яе, схапіла на рукі.

— Дачушка мая любая! Радасць мая адзіная! Ляжыш і маўчыш, слаўная мая, маленькая...

Дзяўчынка радасна загудзела і ўчапілася ручкамі ў маміны валасы. Саша карміла малую, гушкала, забаўляла — і сапраўды на нейкую хвіліну забылася на партызана. Але прыйшла Поля, папрасіла нешта зрабіць па гаспадарцы, Саша выскачыла на двор, як заўсёды імклівая, спрытная, і ўраз спынілася, уздрыгнула: перад вачамі была школа. Потым, за што б яна ні бралася, усё валілася з рук: з галавы не выходзіў партызан.

Па-асенняму рана вярнуўся з пашы статак. Каровы сваім муканнем абудзілі цішыню. Але разышлася жывёла па дварах, і зноў стала ціха і пуста. Цішыня і пустэча — змоўклі пеўні, бо іх парэзалі, зніклі сабакі, не гулялі на вуліцах дзеці, не хадзілі без пільнай патрэбы дарослыя — характэрныя рысы жыцця вёскі ў часы акупацыі.

Трэба прынесці вады — напаіць карову. Саша схапіла вёдры, выскачыла на вуліцу. Іх хата стаяла на аднолькавай

адлегласці ад суседніх калодзежаў, і яны хадзілі то да аднаго, то да другога — каму куды падабалася. Цяпер Сашу пацягнула ў той, што бліжэй да школы. Але ў тым калодзежы нямецкія танкі зламалі журавель, і цяпер вяскоўцы хадзілі туды кожны са сваёй вяроўкай. Саша вярнулася ў двор і ўзяла пад паветкай лейцы. Яна набірала ваду і не зводзіла вачэй са школьнага двара, з таго калодзежа, што вытыркаўся з зямлі абглянцаванай бетоннай трубой. Там таксама было ціха і пуста, як і ўсюды навокал. Над комінам школы ўзнімаўся ў хмарнае асенняе неба празрысты дымок. «Рана запалілі паліцаі. Відаць, зноў самагонку гоняць».

Саша доўга чэрпала ваду. Падняла цяжкія вёдры на каромысел, намерваючыся ісці. Зноў паставіла на зямлю... Нарэшце, пасля доўгага вагання, нясмела рушыла да школы з лейцамі ў руках.

«Я толькі гляну — які ён, партызан? Толькі гляну»,— стукала сэрца моцна і часта.

Брамка на школьны двор была зачынена. Але як толькі яна штурхнула яе, на ганку, як па сігналу, з'явіўся Кузьма.

— Э-э! Хто там? Ты, Саша? — здзівіўся ён, аднак хутка саскочыў з ганка, каб адчыніць.

— Кажуць, Кузьма, ты партызана злавіў? Праўда?

— Праўда. Вунь сядзіць у калодзежы як міленькі.

— Можна паглядзець, які ён?

— Для цябе, Саша, усё можна. Ты ж ведаеш, я цябе заўсёды паважаў,— намагаўся заваяваць яе прыхільнасць паліцай; мабыць, неспакойна было ў здрадніка на душы ад думкі, што нават сваякі асуджаюць яго.— А ён... вар'ят нейкі... Сядзіць — песні спявае, вершы на памяць чэша... Быццам не разумее, што яго чакае.

Саша схілілася над калодзежам і ўбачыла ў глыбіні, адкуль патыхала гніллю, схіленую постаць чалавека. Ён ціха спяваў па-ўкраінску прыглушаным голасам, аднак выразна вымаўляючы словы:

Як хороше, як весело
На білим світі жить!..
Чого ж у мене серденько
І мліє, и болить?..

Быццам горкі яблык захрас у горле Сашы. Магчыма, сляза яе ўпала на таго, хто сядзеў і спяваў там, унізе. Ён падняў галаву. Саша ўбачыла, як па-кашачы заблішчалі яго вочы ў паўзмроку калодзежа.

— О! — выгукнуў ён маладым голасам.— Хто ты? Анёл з неба ці зорка вячэрняя?.. Зорка Марыя.— Ён засмяяўся і нечакана прачытаў незнаёмыя Сашы вершы па-руску:

Протекали столетья, как сны,
Долго ждал я тебя на земле...

— Хто ты? — у сваю чаргу, і таксама на ты, ціха спытала Саша.

— О, падучая дева-звезда хочет земных речей? Я? — Ён падхапіўся, падняў рукі і сказаў зусім іншым голасам, сур'ёзна, горда:— Ча-ла-век я! Чала-авек! Ты ведаеш, зорка Марыя, што такое чалавек?..

— Бачыла дурнога? — засмяяўся Кузьма і адышоў ад калодзежа: яму абрыдлі ўжо дзівацтвы партызана. Ён двойчы дапытваў яго, біў — і нічога не выбіў. Паслаў Гніду ў валасць з рапартам начальніку паліцыі. Чакаючы, што з такой прычыны начальнік можа сам завітаць да іх, яны з Колькам Трапашам пераганялі самагонку, каб зрабіць чысты спірт.

— Як ты трапіў сюды? — яшчэ цішэй спытала Саша, нахіліўшыся ў самы калодзеж.

— А ты спытай у таго сабакі, што гырчыць недзе там.

Саша азірнулася — Кузьма падымаўся на ганак школы.

— Табе цяжка?

— Спусціся да мяне — мне будзе весялей.

— Ты сапраўдны партызан?

— Не, зроблены... татай і мамай...

— Ты ведаеш, што цябе чакае?

— Мяне? — Ён на міг як бы задумаўся і раптам зноў засмяяўся.— Анёлы на небе. У раі. Ляцім са мной!

— Ты мог бы вылезці адтуль?

Ён неяк ірвануўся, прыціснуўся да трубы, быццам на яго нешта падала.

Саша азірнулася зноў. Кузьмы не было. І тады на партызана сапраўды ўпаў канец лейцаў, другі канец іх Саша хутка накручвала на руку і шаптала:

— Яго няма... Ён пайшоў у школу...

І адразу востры край трубы разануў яе рукі, грудзі... Яна не паспела нават падумаць, што робіць, што ёй можа быць за гэта, а ён перамахнуў ужо цераз трубу і схаваўся на тым баку калодзежа. Перад яе вачамі мільгануў апухлы, з крывападцёкамі твар.

— А ты? Ты як? — гарачым шэптам спытаў ён, не паказваючыся з-за трубы.

— Я? — Яна ні да чаго не рыхтавалася, ні аб чым не думала, усё гэта здарылася вельмі нечакана для яе самой, але мозг працаваў з такой яснасцю, што яна адразу знайшла, што адказаць, каб супакоіць яго: — Я — нічога... Я — сястра паліцая.

— А-а,— працягнуў ён і кошкай, амаль на чацвярэньках, сігануў да хлява, з незвычайнай спрытнасцю пераскочыў цераз паркан і, пятляючы, пабег па полі да алешніку.

Саша стаяла з накручаным на руку канцом лейцаў, глядзела яму ўслед і зачаравана слухала дзівосную музыку, што нараджалася ў яе сэрцы, запаўняла ўсю яе істоту — нешта накшталт урачыстага гімна. Ад музыкі гэтай адначасова рабілася радасна, быццам вярнулася страчанае шчасце, і журботна, хацелася смяяцца і плакаць.

— Пагаварыла? — весела гукнуў з ганка Кузьма.

Саша схамянулася, кіўнула галавой: так, пагаварыла.

Кузьма падышоў да калодзежа, глянуў туды і... спалохана ахнуўшы, подскакам аббег навокал трубы.

— Што? Куды? Дзе? — разгублена забалбатаў ён, потым, спыніўшыся перад Сашай, закрычаў не сваім голасам: — Дзе ён?!

— На неба паляцеў! — нечакана засмяялася Саша.— Да анёлаў.

Ён убачыў лейцы ў яе руках і нарэшце ўсё зразумеў. Схапіў Сашу за штрыфель старой дамотканай світкі, трасянуў:

— Ты... Ты... выпусціла? Шпіёнка! Бальшавіцкая...— Ён брыдка вылаяўся.

Гэта абразіла Сашу, і яна, размахнуўшыся, дала яму аплявуху. Ён адскочыў і, ажно пасінеўшы ўвесь, выхапіў з кабуры пісталет.

— А-а, ты так... Дык я цябе!..

— Страляй... Страляй, сволач! — Саша падставіла свае тугія грудзі і зрабіла крок да яго.— Страляй, юда! Здраднік!.. Вырадак! Страляй!

Ён, напэўна, стрэліў бы, каб яна спалохалася ці кінулася ўцякаць. Але ад такога нечаканага нападу яе ён, паліцай, які яшчэ не прывык да забойстваў, разгубіўся. Невядома, чым гэта ўсё скончылася б, каб не з'явіўся Колька Трапаш. Ён знянацку падскочыў да Кузьмы і выхапіў пісталет.

— Ты што робіш? Вар'ят! Яна — сястра твая.

— Сястра?! — не закрычаў, а, здавалася, загаласіў Кузьма.— А ты ведаеш, што зрабіла гэтая сястра? Яна выпусціла яго... Ды я не пагляджу, што яна сястра!.. Я сваю галаву не буду падстаўляць! — Голас яго паступова рабіўся натуральным, і ён пачаў злосна лаяцца.

— Каго выпусціла? Яго? — Колька Трапаш глянуў у пусты калодзеж, здзіўлена залыпаў вачамі, потым перавёў позірк на Сашу, убачыў лейцы і... зарагатаў.

— Ай ды Саша! Малайчына!

— Ты што? — ірвануўся да яго Кузьма.— Ты падумай, што будзе.

— Чакай, не крычы! Слуп дубовы. Начальнік ліпавы. Ты ведаеш, што я табе скажу... Калі ніхто не бачыў, нам лепей замяць гэтую справу.

— Не, не... Няхай не думае... Я ёй... Я не пагляджу, што сястра!.. Напляваць мне!..

— Дурань! Што ты зробіш? Пасадзіш Сашу — табе жыцця не будзе ад сваіх. Родная маці цябе пракляне. А ўвесь гарнізон рагатаць будзе: партызана з-пад носа дзеўка ўкрала... Начальнік!.. Ідзі, Саша! І нікому ні слова пра тое, што тут здарылася,— упэўнена загадаў Колька Трапаш.

Кузьма хацеў быў пярэчыць — Колька абняў яго за плечы і пацягнуў у школу.

— Ты слухай мяне... Я цябе не падвяду. Варона!

Саша, не ўсё як мае быць зразумеўшы, не спяшаючыся скруціла лейцы і пайшла да калодзежа, дзе стаялі яе поўныя вёдры. Толькі тады, калі прынесла цяжкія вёдры ў хату, яна адчула страшэнную слабасць у нагах; знясілена апусцілася на ўслон і, відаць, моцна пабялела. Поля кінулася да яе:

— Што з табой, Саша?

— Я партызана выпусціла.

— Каго?

— Партызана... што Кузьма злавіў і трымаў у калодзежы.

— Як? — падскочыў да яе Данік, якога яна нават не прыкмеціла, калі зайшла ў хату, бо як ішла па ваду, дык яго не было. У душы варухнулася старая крыўда на брата за яго дружбу з Кузьмой.

— Проста. Падала лейцы — і шукай, Кузьма, ветру ў полі.

Данік раптам абняў яе за плечы і ласкава прашаптаў:

— Саша!

Яна перасмыкнула плячамі.

— Не чапай! Твой прыяцель хацеў застрэліць мяне. Колька Трапаш перашкодзіў...

— Божа мой! Што ты нарабіла? — пляснула далонямі Поля, да якой не адразу дайшло, што здарылася.— Што ты нарабіла?! Ты захацела загубіць сябе, дзіця, нас? Ты не ведаеш гэтага гада, Кузьму. Не ведаеш, што ён можа зрабіць... Ён дакажа немцам... Я пабягу... Я зараз жа пабягу да цёткі Хадоскі, да Юлькі... папрашу...

— Не трэба,— зморшчылася, як ад нечага брыдкага, Саша.

— Ты маўчы! Ты даўно страціла галаву і сама не ведаеш, што робіш.

— Не трэба, Поля,— рашуча запярэчыў Данік.— Навошта ўмешваць лішніх людзей? Я сам усё ўладжу.— І, павярнуўшыся да Сашы, сказаў ціха і ласкава:— Ты не бойся, Саша.

— А я нікога не баюся! Адчапіцеся вы ад мяне! — Яна падышла да калыскі, схілілася над дачкой, і буйныя гарачыя слёзы закапалі на тварык дзіцяці.

Данік пастаяў, з любоўю паглядзеў на сястру і нячутна выйшаў з хаты. Следам за ім, накінуўшы хустку, пайшла Поля.

«Выдасць ён мяне ці не выдасць?» Саша ўспаміналa ўсё, што ведала пра Кузьму, прыгадвала ўсе сустрэчы з ім, з самага маленства, усе выпадкі, калі ён праяўляў высакароднасць ці, наадварот, нізасць. Думала пра яго блізкіх — маці, скупую, але шчырую і справядлівую цётку Хадоску, сясцёр, братоў, жонку і больш за ўсё пра дзіця — двухгадовага хлопчыка...

Яна ляжала на печы з шырока расплюшчанымі вачамі і ў цемры бачыла твары гэтых людзей, ад якіх цяпер нейкім

чынам залежаў яе лёс, жыццё, лёс яе дачкі. А цемра ў хаце — хоць вока выкалі, нават вокны слаба відаць: на дварэ глухая дажджлівая асенняя ноч. Дождж хліпае, і здаецца, што на вуліцы хтосьці ходзіць, плача, шэпчацца. Саша ўздрыгвае, прыслухоўваецца... Не, яна нічога не баіцца, ніякай кары. Аднаго баіцца — каб не вярнулася тое агіднае, пакутлівае, абразлівае пачуццё страху, якое яна перажыла пасля здарэння ў лесе. Як хораша было б, каб у душы назаўсёды астаўся той урачысты гімн, светлы, узнёслы, што загучаў, калі партызан схаваўся ў прырэчных кустах. Але яна пачынае слухаць роўнае, спакойнае дыханне дачкі, якая ляжыць побач, і музыка гэта пачынае сціхаць, бо зноў з'яўляецца страх — за яе, за гэтае маленькае нявіннае стварэнне.

Поля таксама не спіць. Яна ўздыхае на ложку і нешта шэпча, магчыма, моліцца. Раней Саша, безумоўна, пасмяялася б, каб пачула, што сястра моліцца. Цяпер не смешна: няхай моліцца, можа, ад гэтага робіцца лягчэй.

Поля вярнулася ад цёткі быццам заспакоеная, але вельмі ўжо нейкая панурая і маўклівая. Саша сказала, што, можа, ёй лепей пайсці начаваць да каго-небудзь з суседзяў ці сваякоў.

— Навошта? — здзівілася Поля і, памаўчаўшы, дадала: — Ад лёсу свайго не схаваешся. Дасць Бог, усё абыдзецца.

Саша зразумела, што гэта — словы цёткі Хадоскі.

— Божа мой! — прашаптала Поля.— Гэты хлопец загоніць мяне ў магілу. Дзе можна бадзяцца ў такі час і пад такім дажджом?

Саша здагадалася, што не Даніла непакоіць сястру — брат не ўпершыню бавіцца недзе так позна,— што ёй хочацца пагутарыць. Але Сашы не хацелася парушаць сваіх думак, і яна прыкінулася, што спіць.

Нарэшце Даніла вярнуўся.

Саша здзівілася, што Поля, адчыніўшы, ніводным словам не папракнула яго.

Хлопец моўчкі распрануўся і... палез на печ. Саша хацела прагнаць яго, ёй было агідна ад думкі, што брат, магчыма, зноў быў у паліцаяў. Але, мацаючы ў цемры, куды лезці, ён дакрануўся да Сашынай рукі, і яна ажно ўздрыгнула: рука яго дрыжала і была халодная як лёд. Таму яна толькі папярэдзіла:

— Каля сцяны — дзіця.

Ён лёг з другога боку, каля коміна, і Саша адчула, што не толькі рукі яго дрыжаць, але і сам ён увесь калоціцца, як у ліхаманцы, ляскае зубамі.

«Дзе гэта ён перамёрз так? Не вельмі ж яшчэ холадна»,— ужо з цікаўнасцю падумала яна.

Ён падсунуўся да яе і, заікаючыся, зашаптаў у вуха:

— Т-т-ты... баішся?

«Адчапіся ты ад мяне, нікога я не баюся»,— хацелася адказаць Сашы, але нешта стрымала яе ад гэтага грубага адказу.

— Не б-бойся... Ён н-не данясе...

«Гэта ён табе паабяцаў?.. Ты выпрасіў літасць гэтую? А мне не трэба яго літасці!» — зноў наважылася адказаць Саша, але не паспела: Данік горача шаптаў:

— Цяп-пер ён н-нікому н-не скажа... Яго н-няма...

— Няма? — здзівілася Саша.

— Ён п-п-памёр.

— Памёр?

Данік зацісну́ў халоднай далоняй ёй рот.

— Цішэй... Ён ехаў у воласць... На веласіпедзе. А масток, ведаеш, які каля лесніка... Без парэнчаў, без нічога... І-і ц-цямнела ўжо... І ён — у рэчку... Можа, у яго шынель у ланцуг закруціўся, што ён не мог вылезці і... зах-х-лынуўся. Можа, п'яны быў...

Саша ўсё зразумела. Дзіўныя пачуцці ахапілі яе: страх, што Данік, хлапчук, дзіця яшчэ, забіў чалавека, і не чужога, не немца, а стрыечнага брата, і ў той жа час бязмерная ўдзячнасць яму, бо зрабіў ён гэта, каб уратаваць яе, Ленку, каб пакараць здрадніка. І яшчэ сорам за тое, што пагана думала аб ім... А ён вось які... І ўсё шэпча, нібы хоча апраўдацца, астудзіць жар душы:

— Яму не трэба было ехаць у воласць. Навошта ён ехаў? Так паспешліва. Проці ночы. Помніш, цётка Хадоска расказвала: цыганка ў іх некалі варажыла і сказала Кузьму, што яго смерць будзе ад вады... Каб ён асцерагаўся... Вось бачыш... Ад вады...

Саша сціснула яго рукі і, дрыжучы сама амаль гэтак жа, як ён, прашаптала:

— Не трэба, Данік, родны. Не трэба... Я ўсё разумею... Супакойся.

Яны доўга маўчалі, цяжка дыхаючы адно аднаму ў твар. У цемры і цішыні было чуваць, як Данік дробна ляскае зубамі, Саша абняла яго, каб сагрэць.

— Ты лазіў у рэчку? — прашаптала яна.

— Не... Я не лазіў...— адказаў ён так, што стала ясна: нехта ўсё ж лазіў.

— А хто? — хутка спытала Саша.

— Ты не павінна пра гэта пытацца! — сказаў ён сурова, патрабавальна, перастаўшы нават дрыжаць і заікацца.

— Я разумею. Даруй мне, Данік. За ўсё... што я ўдарыла цябе, што думала так...

— Нічога... Я не крыўдзіўся. Я радаваўся, што ты такая. Але мне цяжка было.

— І мне цяжка...

— Ты думала, я спалохаўся, калі аддаў Кузьму вінтоўку без затвора. А ў нас іх, можа, дваццаць схавана, і кулямёт, і гранаты... Новенькія... Трэба было заткнуць яму горла ламаччам, каб не думаў нічога, не дакопваўся. І хадзіў я да іх таму... А заадно вучыўся, як зброяй карыстацца... У нас ніхто добра не ўмеў.

«У нас... Значыцца, іх некалькі чалавек... Відаць, усе такія, як ён, Данік. Але якія смелыя і разумныя! Хто ж там яшчэ?» Саша прыгадала ўсіх Данілавых сяброў, і ўсе яны зусім не былі падобныя на герояў, ва ўсіх іх яшчэ дзіцячы вецер у галаве.

Аднак нехта ж ёсць... Яны змагаюцца. Яны пакаралі здрадніка Кузьму, які хацеў забіць партызана, выдаць немцам яе, Сашу.

— Мы самі рыхтаваліся вызваліць партызана. Ночы чакалі. Ты нам крыху напсавала. Нам гэты чалавек вельмі спатрэбіўся б...

Саша слухала, што казаў Данік, як цудоўную казку, ад якой робіцца святлей на душы і з'яўляецца моцнае жаданне самой стаць такой, як героі гэтай казкі...

Яна раптам ціха папрасіла, здзівіўшы брата:

— Данік... Вазьміце мяне ў сваю групу. Я вам таксама спатрэблюся... Я — фельчар.

Ён доўга думаў. Яна чакала, стаіўшы дыханне.

Нарэшце ён паабяцаў:

— Добра. Я параюся з хлопцамі.

Саша прыгарнула яго да сябе і прыціснулася губамі да яго ўжо гарачай шчакі.

V

І вось яна першы раз ідзе на збор падпольнай групы.

Позні вечар. У вёсцы дзе-нідзе мільгаюць агеньчыкі: гараць у хатах каганцы ці тлее на прыпечку лучына — такое святло прынесла «цывілізаваная Еўропа». Гэтыя агеньчыкі — адзіныя арыенціры, бо без іх лёгка можна было б заблудзіцца ў такой цемры.

Саша крадзецца на пальчыках, стараючыся ступаць як мага цішэй. Але зямлю скаваў мароз, і боты грукаюць на ўсё наваколле. Яна спыняецца, слухае. Сэрца стукае так, што робіцца горача ў грудзях і балюча ў скронях, у вушах. Магчыма, праз гэта шум бору далятае хвалямі, як у дзіцячай гульні, калі вушы заціскаеш далонямі: шум — цішыня, шум — цішыня. І чым больш яна стаіць, узіраецца і слухае, тым робіцца горш: пачынае здавацца, што наперадзе хістаюцца постаці, а ззаду чуюцца крокі і шэпт. Можа, за ёй сочаць, ідуць? Не, гэта толькі здаецца... Няўжо ёй так страшна? Яна не харобрыцца залішне. Так, страшна. Няма чаго таіцца. Вельмі. Але не за сябе, апраўдвае яна свой страх. За Даніка, за яго сяброў, якія паверылі ёй і цяпер чакаюць недзе там, за вёскай, каля старога млына. Данік доўга, нешта з месяц, раіўся з хлопцамі. Мабыць, ім нялёгка было вырашыць такое пытанне. Не адразу яны прыйшлі да згоды — Саша разумела гэта і не крыўдавала. Яна старэйшая за іх, у яе дзіця...

Успомніла Ленку — і думкі пайшлі ў іншым кірунку. Навошта яна ідзе туды? Што яна будзе рабіць? Невядома, хто там, у іх групе. Даніла і дагэтуль не сказаў. Калі там усе такія, як ён, то якая гэта арганізацыя? Што могуць зрабіць гэтыя дзеці? Забілі Кузьму? Гэта смелы ўчынак, безумоўна. Ён прымусіў задумацца многіх, хто служыў ці мае намер

пайсці на службу да акупантаў. Але ці заклікаў ён каго да барацьбы? Яны ратавалі яе, Сашу. Але маглі вельмі проста загінуць самі. Яна ўспомніла, як пасля пахавання Кузьмы да іх у хату прыйшла цётка Хадоска. Высокая і ссутуленая заўсёды, яна за той дзень зусім згорбілася, а яе маршчыністы, загрубелы ад вятроў, спякоты і маразоў твар як бы абвугліўся. Саша ўбачыла яе і жахнулася. Цётка абапіралася на тоўсты бярозавы кій (дагэтуль ніхто яе з кіем не бачыў), і рукі яе калаціліся. Яна не села, хоць Поля і запрасіла яе. Яна стала каля парога і ўтаропіла на Сашу свае чырвоныя ад слёз, але сухія вочы, у якіх адбівалася нечалавечая пакута.

— Ну, Сашачка, пахавалі мы твайго брата,— сказала яна ціха і журботна.— А ты не прыйшла...

Сашы здалося, што кашчавая, чорная, з парэпанымі пальцамі рука, якая сціскала кій і з якой яна, Саша, не зводзіла позірку, раптам нябачна сціснула яе горла. Саша задыхнулася. Яна любіла цётку, і ёй было вельмі шкада яе. Але пасля яе слоў перажыла амаль такі ж прыступ страху, як пасля здарэння ў лесе. Калі яна ратавала партызана, то не думала пра небяспеку, усё выйшла неяк само сабой, па закліку сэрца. А тут яна адразу падумала пра Ленку і невядома чаму схапіла яе, сонную, з калыскі.

«Ваш сын пайшоў супраць сваіх людзей, і людзі пакаралі яго»,— хацелася сказаць, каб прымусіць цётку змоўкнуць і не глядзець так страшна. Але Саша разумела, што словы такія яшчэ больш раняць матчына сэрца, і, шкадуючы старую, хавалася ад яе вачэй, як умела.

— Вось і ў цябе дачка расце,— паківала галавой старая,— і ніхто не ведае, што яе чакае!

Саша, уздрыгнуўшы, адвярнулася, каб загарадзіць ад Хадоскі дачку.

«Калі яна зачэпіць Ленку яшчэ, я скажу ёй... Няхай яна не лье слёз па сыну-здрадніку. Трэба было раней думаць і ўгаворваць Кузьму, каб кінуў паліцыю... Я ўсё скажу...» — вырашыла Саша.

Але цётка Хадоска больш не зачапіла малую. Пастаяўшы яшчэ крыху і адмахнуўшыся ад Полі, якая са слязамі гаварыла нейкія недарэчныя словы ўцехі і запрашала сесці, яна сказала да Сашы сурова:

— Маўчыш? У вочы не глядзіш? На абаронцаў сваіх спадзяешся? Што ж... абарона ў цябе моцная,— і выйшла.

Саша і дагэтуль не разумее, чаму ўсё абышлося ціха. У вёсцы ніхто не сказаў ніводнага слова пра тое, што яна выратавала партызана. Напэўна, ніхто і не ведае. Значыцца, маўчаць і Колька Трапаш і цётка Хадоска. Але ці заўсёды яны будуць маўчаць?..

Дык ці мае яна права рызыкаваць зноў? Якая ■ яе падпольшчыца, партызанка! Не! Спыніцца яна не можа! Яе чакаюць там, каб даверыць вялікую тайну. Яна не можа вярнуцца, бо адчувае, што пасля гэтага ўзненавідзіць сябе і яе існаванне, без таго змрочнае, стане чарней, чым гэтая ноч. Там недзе змагаюцца, сцякаюць крывёй, гінуць тысячы людзей, каб выгнаць ворага, каб вярнуць тое шчасце, якое мела і яна, Саша. Там недзе Пятро. Яна верыць, што ён вернецца і з ім вернецца ўсё. Таму яна не можа, не мае права сядзець склаўшы рукі.

У алешніку над ракой нешта хруснула. Саша замірае на месцы. Што там — чалавек ці звер? Цішыня. Шуміць бор, журчыць рэчка, змагаючыся з ільдом, што наступае ад берагоў. Мароз мацнее. Але інею няма. Зямля чорная. На небе з'явілася прасветліна і выглянула адзіная зорачка. Ад гэтай маленькай, страшэнна далёкай зорачкі неяк адразу пасвятлела навокал. Каб не палохацца грукату ўласных ботаў, Саша нахіляецца, скідае і бяжыць далей па мёрзлай, калючай зямлі ў адных працёртых панчохах.

Каля млына яе сустрэў брат. Ён вынырнуў нечакана, як з-пад зямлі.

— Ты, Саша?

Падышоў, убачыў у яе руках боты, здзівіўся:

— Босая? Вось дурная. Абувайся хутчэй, ногі памарозіш.

Саша меркавала, што хлопцы збіраюцца ў старым млыне. Але Данік перавёў яе па разбуранай плаціне, па слізкіх, абмёрзлых кладках на другі бок рэчкі. Саша здзівілася, што ідзе ён даволі смела, не баючыся грукаць ботамі. Яны падышлі да самага лесу, і толькі тады Саша здагадалася, дзе яны збіраюцца.

Гады тры назад калгас пачаў разводзіць трусоў. Тут была ферма: абгароджаны драцяной сеткай участак і невялікая

будыніна — кухня, дзе варылі корм. Сетку і клеткі разам з трусамі парасцягалі, але будыніны пакуль што ніхто не чапаў: яна стаяла на былым, дакалгасным, надзеле, гаспадар якога цяпер служыў за старасту. Зямля тут была, магчыма, самая кепская, адзін пясок, але многія з вяскоўцаў заяўлялі, што з іх даволі той зямлі, якой яны карысталіся да калгаса, на што большае яны не прэтэндуюць. Людзі не верылі ў трываласць «новага парадку».

Ні печы, ні катлоў у былой кухні ўжо не было, вокны забіты шалёўкай. Гэта, напэўна, зрабіў староста. Але шчыліны паміж шалёўчынамі старанна пазатыкаў нехта, безумоўна, другі. Куча саломы ляжала ў адным куце, у другім — гарэла самаробная васковая свечка.

Саша абвяла позіркам хату і ўбачыла толькі аднаго чалавека.

Пачуццё расчаравання, нават крыўды спыніла яе каля парога. Каля свечкі ляжаў жыватом на падлозе суседскі сын, Данікаў равеснік, яны разам кончылі сёмы клас,— Цішка Матыль. Але калі Данік выглядаў як сталы хлопец, то Ціхан гэты здаваўся яшчэ зусім дзіцянём: нізкарослы, рудзенькі, з прышчаватым тварам, ціхі і сарамлівы — нейкі зусім непрыкметны. Праўда, Цішка быў лепшы вучань, выдатнік. Але Саша не помніла, каб Данік асабліва сябраваў з ім.

Ён глянуў на Сашу і сарамліва апусціў вочы.

«Дык гэта ўся іх арганізацыя? Дзеці»,— падумала яна.

Але раптам з-за кучы саломы пачуўся голас невядомага; голас належаў больш сталаму чалавеку.

— Сядайце! — уладна загадаў ён.

Саша паслухмяна апусцілася на калені побач з Ціханам.

— Ці ведаеце вы, куды ўступаеце? — спытаў голас.

— Ведаю,— адказала Саша; гэтая таямнічасць не спадабалася ёй. «Як у секце якой». Голас невядомага здаваўся крыху знаёмым, але ўспомніць, хто гэта, яна не магла.

— Падумайце, ці адчуваеце вы ў сабе сілы мужна сустрэць любую небяспеку на тым шляху, на які ўступаеце?

— Каб не адчувала, то не прыйшла б сюды. Мяне ніхто не цягнуў.— У голасе яе пачулася крыўда, і чалавек за саломай збянтэжана кашлянуў і памаўчаў больш, чым трэба.

— Дайце руку вашым сябрам і паўтарайце за мной словы прысягі.

Даніла і Ціхан працягнулі свае рукі і сціснулі моцна яе маленькую, але загрубелую ўжо ад цяжкай працы руку.

— Я, грамадзянін Савецкага Саюза...

— Я, грамадзянка Савецкага Саюза...— удакладніла Саша.

Невядомы зноў кашлянуў.

— Член Ленінскага камсамола...

— Член Ленінскага камсамола...

— Уступаючы ў падпольную арганізацыю для барацьбы з фашысцкімі акупантамі і іх паслугачамі, клянуся...

І раптам ад Сашы адышло, знікла ўсё знешняе: таямнічасць, якая не спадабалася, рукі хлопцаў, што сціскаюць яе руку, голас невядомага. Словы прысягі ўліваліся ў яе магічнай сілай. Ад гэтага пачынала хутчэй струменіць кроў, часцей білася сэрца, глыбокім і перарывістым стала дыханне. Голас яе мацнеў з кожным словам і дзе-нідзе зрываўся і дрыжаў.

— За смерць нашых матак і дзяцей, за іх кроў і слёзы...— Словы гэтыя салёна-горкім камяком сціснулі горла; Саша на момант змоўкла.

Хлопцы адчулі, як дрыжыць яе рука. Але раптам голас яе як бы прарваўся праз нейкую цяжкую перашкоду і зазвінеў з новай сілай:

— ...я клянуся помсціць праклятым фашыстам бязлітасна, усімі сродкамі падпольнай барацьбы...

Яна сказала гэта гучней, чым трэба, і чалавек за саломай панізіў голас. Але Саша не звярнула ўвагі на гэтую акалічнасць, бо падказчыка больш не існавала для яе. Ёй здавалася, што гарачыя і суровыя словы ідуць з глыбіні яе ўласнага сэрца. На Даніка і Цішку яна таксама забылася. Яна глядзела ў цёмны кут, а бачыла вялікія прасторы роднай зямлі, натоўпы людзей, калоны чырвонаармейцаў... Усяму народу давала яна клятву!

— Калі ж я парушу гэтую клятву — здраджу, збаюся, выдам тайну арганізацыі, няхай рука маіх сяброў бязлітасна пакарае мяне...

Саша была яшчэ там, у невядомай далечы, дзе ішла барацьба, калі над самым вухам пачула ціхія звычайныя словы:

— Добры вечар, Саша.

Яна страпянулася. З цемры схіліўся да яе знаёмы твар. Толя Кустар прыветліва ўсміхаўся і працягваў руку. Саша навват не адразу зразумела, адкуль ён з'явіўся. З Толем яна разам вучылася ў сямігодцы. Але гэта быў «чужак», ён жыў на пасёлку Кустары, які належаў да іншага сельсавета. Пасёлак быў кіламетры за тры ад іх вёскі, за лесам, а таму сустракаліся яны толькі ў школе, і нельга сказаць, каб былі сябрамі.

Саша пасля ніколі не цікавілася лёсам Толі і іншых аднакласнікаў з пасёлка. Чула неяк краем вуха, што Толя скончыў ФЗУ і працуе недзе ў Мінску электраманцёрам.

Зразумеўшы, што гэта ён падказваў ёй словы прысягі, Саша ўзрадавалася: ёсць, значыцца, у арганізацыі больш сталыя людзі! Толя — яе аднагодак, самастойны чалавек, рабочы!

Толя моцна сціснуў яе руку і сказаў:

— Вось як мы сустрэліся з табой!

Ні ён, ні брат, ні Цішка не сказалі ёй больш ні слова пра тое, куды яна ўступіла, што павінна рабіць, як паводзіць сябе. Яна зразумела: усё сказана ў словах клятвы. Яна свяшчэнная, гэтая клятва, і нельга разбаўляць яе звычайнымі словамі. Ды і ўвогуле лішняга тут ніхто не гаварыў.

Толя Кустар падсунуў бліжэй свечку, зняў пальцамі, як абцугамі, нагар і ціха сказаў:

— Пачнём, таварышы.

Данік падсунуўся бліжэй да яго, абхапіў рукамі калені і схіліў галаву, нарыхтаваўшыся слухаць. Цішка не варухнуўся, ён, як і раней, ляжаў на жываце, падпёршы рукамі галаву; далоні закрывалі шчокі, а рудаватыя валасы — лоб, і Саша бачыла адны яго вочы, вялікія, зацянёныя вейкамі, стомленыя, як у дзіцяці, якому хочацца спаць, і сумныя. У Толі, наадварот, вочы былі ясныя, вясёлыя, полымя свечкі, што гарэла каля яго ног, адбівалася ў зрэнках дзіўным, як бы жывым святлом.

— Перш за ўсё — пра галоўнае ў нашай дзейнасці...— пачаў Толя крыху афіцыйна і ўрачыста, але тут жа акінуў усіх задаволеным позіркам і, панізіўшы голас, проста паведаміў: — Радасная навіна, хлопцы: Стары ўстанавіў сувязь з партызанамі.

— Ну-у? — падхапіўся Цішка, сеў, і вочы яго заблішчалі.— Як? Дзе?

А Саша падумала: «Значыцца, ёсць яшчэ нехта больш сталы, каго яны называюць Старым. Хто ж гэта?»

— Не мае значэння, Ціхан, як і дзе... Галоўнае, што сувязь ёсць... Будзе! Мы павінны паслаць у атрад свайго чалавека і дамовіцца аб пастаяннай сувязі. Стары скажа, куды ісці...

— Я! — выгукнуў Цішка.— Мяне...

— Чакай! — спыніў яго Толя.— Я думаю, што лепш пайсці Данілу. Нам з табой ёсць іншае заданне. Першае заданне ад партызанскага камандавання... Яно вынесла прысуд чалавеку, які выдаў фашыстам раненых партызан. Нам даручылі выканаць гэты прысуд...

Саша зразумела, што трэба некага забіць, пакараць смерцю, і жахнулася: раптам калі-небудзь такое заданне дадуць ёй, а яна... яна не здолее забіць чалавека!

— Хто? — спытаў Цішка, вочы яго зноў патухлі, і ён зморшчыўся, як ад нечага вельмі брыдкага.

— Ляснічы.

— Наш? У яго чацвёра дзяцей! — вырвалася ў Сашы.

Ляснічы быў чужы і незнаёмы ёй чалавек. Але тыдні два назад яна з ім пазнаёмілася. Ён прыехаў увечары і вельмі прасіў, каб яна прыняла роды ў яго жонкі. Саша не хацела, нават баялася ехаць у лес. Але ў чалавека быў надта разгублены выгляд, ды і Поля, звычайна баязлівая, шапнула, што варта паехаць: ляснічы заўсёды спатрэбіцца.

Спакутаваная родамі жанчына, ціхая і ласкавая пасля таго, калі ўсё шчасліва скончылася, прасіла павесялелага ад чаркі самагонкі мужа: «Ляксей, ты ж добра аддзякуй дохтарцы... Не скупіся». Ён на развітанне сунуў ёй тры вялікія кавалкі старога сала. І Саша, якая там, на рабоце, заўсёды абражалася, калі ёй што-небудзь падобнае прапаноўвалі, узяла гэтае сала, бо брала не для сябе, а для ўсёй сям'і, якая сядзела на адной бульбе. Усё гэта ў адзін міг паўстала перад яе вачамі, а найбольш выразна — дзеці, адно пад адно, не разабрацца, дзе старэйшае, дзе малодшае; тры пары вачанят

увечары, калі іх выгналі ў другі пакой, спалоханых, а раніцой, калі ім сказалі, што ў іх ёсць брацік, здзіўленых. Дзеці, якія заўтра стануць сіротамі. Яна лепш, чым хто другі, ведае, як гэта цяжка і страшна: сама расла сіратой і сама цяпер маці.

Саша глядзела на хлопцаў з надзеяй пачуць, што ляснічы асуджаны не на смерць.

Яны пераглянуліся паміж сабой і змоўклі — больш ніводнага слова пра гэта. Сашы здалося, што хлопцы зразумелі словы пра дзяцей як яе слабасць, жаночую жаласлівасць, і спалохалася, што цяпер яны перастануць давяраць ёй тайны падполля. Яна хацела растлумачыць, што літасці да гэтага чалавека ў яе сэрцы няма. Сапраўды, хіба можа быць літасць да таго, хто выдаў ворагам сваіх людзей, партызан, ды яшчэ раненых, бездапаможных? Такому гаду яна сама прыдумала б самую страшную кару! Але дзеці. Яна, маці, не магла не падумаць пра іх... Няхай таварышы правільна яе зразумеюць...

— Я прымала роды ў яго жонкі,— сказала Саша.— Я думаю, дзеці не вінаваты, што бацька ў іх такі...

— Дзяцей ніхто не вінаваціць,— сурова адказаў Цішка.— Мы не фашысты.

Саша ўзрадавалася, што размова аднавілася. Але Толя Кустар у гэты момант пачаў гаварыць зусім пра іншае:

— Таварышы, набліжаецца свята Кастрычніка. Мы павінны адзначыць яго. Людзі павінны ведаць, што ёсць сілы, якія змагаюцца з ворагам... што фашысцкая прапаганда — брахня... Прапаную... Першае — расклеіць лістоўкі... Будзем спадзявацца, што атрымаем іх з партызанскага атрада, калі ж не — напішам самі... Другое... Прапаную на ўсіх грамадскіх будынках — на школе, сельсавеце, клубе — вывесіць чырвоныя сцягі. Пашыць сцягі даручым Сашы. Згодна? — звярнуўся ён да яе.

Саша кіўнула галавой. Але першае баявое заданне не ўзрадавала яе, бо здалося дробязным: вялікая справа пашыць чатыры сцягі!

Хлопцы сур'ёзна абмяркоўвалі, дзе ўзяць тканіну на сцягі, як лепш іх вывесіць, каму пісаць лістоўкі. А Сашы здавалася, што робяць яны гэта знарок, каб не гаварыць пры

ёй пра больш важныя справы. Данік прапанаваў у дзень свята спаліць мост на шашы — той самы, які ўзарваў Алёша Кошалеў і які акупанты нядаўна аднавілі. Прапановы яго чамусьці не прынялі. І Саша зноў падумала, што не прынялі таму, што прысутнічае яна, слабая жанчына, якая быццам пашкадавала здрадніка.

* * *

Толькі сёмага лістапада Саша зразумела значэнне сцягоў, якія яна ўпотайкі пашыла і перадала Даніку.

Раніцой, калі яны з Поляй пачалі паліць у печы, да іх прыбегла суседка Аксана, узрушаная, трохі спалоханая, але ўзрадаваная.

Яна нават забылася павітацца, а з парога таямніча зашаптала:

— Бачылі? Сцягі! Нашы! — Вочы яе гарэлі.

Яны выйшлі на вуліцу. Напярэдадні выпаў снег. Першая ваенная зіма ўсюды лягла вельмі рана. Уначы прыціснуў мароз, неба ачысцілася ад хмар і было глыбокае, яснае, як быццам старанна вымытае. Снег зусім па-зімоваму рыпеў пад нагамі. З комінаў у празрысты блакіт падымаліся белыя слупы дыму. Але не гэтае хараство прыцягвала ўвагу людзей. Вялікі чырвоны сцяг над школай — вось што выводзіла з хат старых і малых. Сцяг ледзь трапятаўся, палымнеў і на фоне блакіту, над цёмнай сцяной лесу здаваўся агромністым, як зара,— на паўнеба. Сэрца ў Сашы адразу напоўнілася ўрачыстасцю: прыйшло свята, суровае, падпольнае, але такое, якога нікому і ніколі не знішчыць, не згасіць, якое заўсёды, у любых умовах, будзе палымнець вось такімі сцягамі. Гэта не проста сцягі, гэта — кроў тых, хто аддаў жыццё за гэтае свята, гэта сэрцы — яе, Данікава, Толева, Цішкава, невядомага ёй Старога — палымнеюць там, над дахамі школы, сельсавета, клуба. Ад такога адчування стала радасна.

Саша прайшлася па вуліцы. Усе глядзелі на сцягі, як на нейкую знамянальную з'яву. Смялейшыя стаялі на вуліцы, нават збіраліся групамі, больш асцярожныя — у сваіх

дварах. Але нават у рухах і словах людзей адчуваўся святочны настрой.

Цішка Матыль павітаўся і ціха павіншаваў:

— Са святам, Саша!

А праз колькі двароў яе гэтак жа ціха павіншаваў аднаногі дзядзька Раман:

— Са святам, хросніца!

— Вас таксама, хросны!

Саша прыпынілася каля яго.

— Малайцы хлопцы! — кіўнуў ён на будынак сельсавета.

— Якія хлопцы? — здзівілася яна, устрывожаная.

— Што сцягі павесілі. Каб я ведаў, хто гэта зрабіў, я пацалаваў бы іх, галубкоў шызых...

Сцягі доўга ніхто не здымаў — ні паліцаі, ні староста. Потым Саша даведалася, што каля кожнага з іх хлопцы прымацавалі дошчачку з надпісам: «Замініравана». Толькі ў другой палавіне дня прыехаў ваенны камендант з атрадам жандараў і паліцаяў. Камендант загадаў пасадзіць пад арышт мясцовых паліцэйскіх, выцяў бізуном старасту і скінуў яго з пасады. Потым сабраў самых старых мужчын і пачаў расказваць ім, якая моцная нямецкая армія і якая слабая савецкая, радасным крыкам паведаміў, што нямецкія часці ўступілі ў Маскву, а ў заключэнне паграізіў:

— Калі ў вашай вёсцы будзе яшчэ хаця б адзін бандыцкі выпад супраць новага парадку, я павешу вас.— Ён абвёў позіркам групу панурых барадатых людзей, падумаў і дадаў: — Не, я павешу не вас. Я павешу кожнага другога ва ўзросце ад пятнаццаці да трыццаці год. Майце на ўвазе гэта і перадайце ўсім!

Камендант і эсэсаўцы паехалі, а паліцаі асталіся: вёска была занесена ў лік небяспечных крамольных пунктаў, і замест невялікай варты ў школе размясціўся цэлы гарнізон. Новыя паліцаі вялі сябе нахабна: кралі курэй, парасят, разганялі зборы, вечарынкі, каго сустракалі позна ўвечары, збівалі, хто б гэта ні быў — малы, стары, жанчына; як валацугі, цэлую ноч шлындалі па вёсцы, падслухоўвалі, падглядвалі ў вокны. Адным словам, «новы парадак» праявіў сябе на поўную сілу.

Лютавала ранняя суровая зіма: трашчалі маразы, вылі снежныя завірухі.

У хаце не было газы. Зараблялі кавалак хлеба пры лучыне — пралі кудзелю для тых увішных гаспадароў ці гаспадынь, якія, нягледзячы на вайну, выбралі для сябе калгасны лён. Саша ніколі раней не прала і з першых жа дзён зненавідзела гэтую дапатопную работу. Манатоннае гудзенне самапрадкі, няроўнае святло лучыны — то ўспыхне, то згасне, свіст ветру і крокі паліцэйскіх — усё гэта наганяла такую нуду і роспач, што хацелася зрабіць немаведама што, абы не сядзець вось так. Саша з нецярплівасцю чакала, калі падпольшчыкі дадуць ёй заданне. Але падполле маўчала, нават на сход ці збор больш яе не запрашалі.

Астаўшыся ў хаце сам-насам з братам, яна наступала на яго:

— Чаму мы маўчым, нічога не робім? Чаму не збіраемся?

— Чакай, Саша. Не гарачыся. Больш вытрымкі, сястра! — па-сталаму разважліва адказваў ён.

— Я ведаю... Вы збіраецеся, вы дзейнічаеце,— сказала яна другі раз.— Але вы не хочаце даваць мне задання. Вам не спадабалася, што я пашкадавала дзяцей ляснічага...

— Калі ты будзеш думаць і гаварыць глупства,— узлаваўся Данік,— мы сапраўды цябе выключым. Я першы прагаласую.

— Ну і выключайце! — не стрывала Саша, пакрыўджаная да слёз.

Данік бліснуў страшным позіркам. Яна спалохана адступіла ў закутак паміж грубкай і печчу і, магчыма, у гэты момант упершыню заўважыла, як змяніўся брат: узмужнеў, выцягнуўся, стаў вышэйшы за яе ростам, але як схуднеў — на твары адны скулы тырчаць ды блішчаць вочы, запалёныя, чырвоныя, як у чалавека, які не спаў многа дзён.

Ён працягнуў руку, і Сашы здалося, што ён намерваецца ўдарыць. Але брат абняў яе, нязграбна, сціснуўшы ўчэпістымі кашчавымі пальцамі плячо, і глуха зашаптаў:

— Слухай, дурніца, навошта гэта табе?

— Што? — не зразумела яна.

— Хадзіць цяпер на нашы сходы? Навокал снег — босая гародамі не пабяжыш... І бобікаў, як сабак... Ты замужняя

жанчына, маці... Твая адсутнасць ці сустрэча з намі, хлопцамі, адразу выкліча падазронасць. Усё, што трэба, я табе перадам... Зразумей!

— Разумею,— прашаптала Саша, пасаромленая; яе кранула разумная асцярожнасць сяброў. Яны не забываюць, што яна маці і таму менш, чым хто іншы, мае права рызыкаваць.

— А заданне і ты атрымаеш,— гаварыў далей Данік.— Не хвалюйся. Работы ўсім хопіць, дай толькі разгарнуцца. Не ўсё адразу!

Сапраўды, неўзабаве брат прынёс ёй заданне падпольнай групы. Ён вярнуўся пад вечар з лесу, дзе разам з Цішкам і іншымі хлопцамі траляваў з лесасек на шашу дровы, якія потым немцы на машынах перавозілі ў горад. Саша адразу ж, па вачах, убачыла, што ён мае сказаць ёй нешта важнае. Абое яны з нецярплівасцю чакалі моманту, калі Поля выйдзе з хаты. Калі тая нарэшце пайшла даглядаць карову, Данік забраўся ў той жа закутак паміж печчу і грубкай і паклікаў Сашу. Яна падышла з дзіцем на руках.

— Слухай, ёсць табе заданне,— зашаптаў брат.— Нялёгкае, адразу табе скажу. Незвычайнае... Але ў падпольнай барацьбе ўсё бывае... У партызанскім атрадзе ранены камісар... Яму адрэзалі ступню нагі, і бок прастрэлены, не гоіцца. А ў лесе зараз цяжка — зіма. Стары лагер яны пакінулі: немцы напалі... У родную вёску чалавек не можа пайсці, сама разумееш, там кожны яго ведае... Трэба яму прытулак... Мы параіліся з хлопцамі і вырашылі: самае лепшае — у нас...

— У нашай вёсцы? — спытала зацікаўленая Саша.

— Не, у нашай хаце... У нас.

У куце было ўжо цёмна, і яны дрэнна бачылі адно аднаго. Але па руху, які зрабіла Саша — неяк шчыльней прыціснула малую,— Данік зразумеў, што гэта яе моцна здзівіла і ўразіла. Баючыся, каб яна не запярэчыла, хлопец сціснуў яе локаць, зашаптаў горача і хутка:

— Твайго Пятра ніхто не бачыў, не ведае тут... Нават і Поля... Камісару зробяць дакументы на Пятра, быццам немцы адпусцілі яго, раненага, з лагера палонных. Ёсць жа такія выпадкі...

Саша аслупянела. Перш за ўсё сэрца апякла страшная думка, якая ніколі раней не з'ўлялася: што і яе Пеця можа

быць у палоне, у адным з гэтых жудасных лагераў, пра якія яна чула. У кашмарных снах, у пакутлівых уяўленнях яна часам бачыла Пецю раненым, сцякаючым крывёю на абмерзлых скалах, у снягах далёкай Поўначы. Але ні разу не бачыла яго ў палоне. Пеця, ласкавы, любы, жыццярадасны, і фашысцкі палон — не пагаджалася з гэтым яе свядомасць. Не, не, лепш смерць, чым гэта, крычала яе сэрца. Яна не чула далейшых пераконванняў Даніка, які даводзіў:

— Ты павінна зразумець, якога чалавека мы ратуем... У нас яму з усіх бакоў добра. Ты — медык, можаш палячыць яго раны. Чалавек хутчэй стане на ногі, чым дзе ў іншым месцы.

Адагнаўшы нарэшце думкі аб Пецевым палоне, Саша ўявіла, як чужы, незнаёмы чалавек прыедзе ў іх хату і яна мусіць называць яго мужам, Пецем, магчыма, прыйдзецца нават на людзях абняць, пацалаваць, каб не выдаць яго, сябе... І ў гэты ж момант думаць пра Пецю: дзе ён, што з ім? Чужы чалавек Ленку будзе называць сваёй дачкой.

Не, гэта немагчыма! Яна можа выканаць любое заданне, пайсці на смерць... Але толькі не гэта! Данік — дзіця, не разумее, якая гэта пакута будзе для яе.

— Данік, я не магу...— прашаптала яна.— Ты зразумей... Я не ведаю, што з Пецем, а ў гэты час чужы чалавек будзе жыць пад яго імем. Я не здолею так прыкідвацца.

Заварушылася, заплакала Ленка.

— Спі, мая маленькая, зорачка мая ясная,— загушкала Саша малую, прымаўляючы па-вясковаму пяшчотна і мнагаслоўна: — Спі, мая ягадка. Нікога не бойся... ты з мамай. Нікому я не дам цябе пакрыўдзіць, сінічку маю ненаглядную.

— Значыцца, не можаш? — тузануў яе за локаць Данік, перапыняючы размову з дачкой.

— Данік, ты не падумаў, як цяжка будзе ўсім нам... мне... Пашкадуй мяне, Данік, я жывы чалавек,— маліла яна.

Ён выпусціў яе локаць:

— Я думаў... Мы ўсе думалі. А вось ты... На словах — гераіня. А калі справу трэба рабіць, то перш за ўсё пра сябе думаеш. Лішні раз пахваляваццa баішся... А яшчэ пішчала: чаму маўчым, чаму нічога не робім? Дайце заданне... Вось табе заданне!..

Ён кідаў з кутка гэтыя бязлітасныя словы, як камені.

— Данік, ты зразумей мяне правільна. Я не баюся, Данік!..

Але словы яе яшчэ больш узлавалі напорыстага хлопца. Ён сам прапанаваў такі варыянт — прытуліць камісара ў сваёй хаце, цвёрда ўпэўнены, што Саша не толькі не адхіліць яго план, а, наадварот, узрадуецца такому надзвычайнаму заданню. І раптам Саша адмаўляецца. Як жа ён цяпер гляне хлопцам у вочы, што скажа, каб апраўдаць сябе і Сашу? Што падпольшчыкі і партызаны падумаюць пра іх? Яму стала балюча, сорамна і крыўдна за сястру, за яе баязлівасць; ён не прызнаваў ніякіх іншых прычын, акрамя адной: баіцца. І каб яна проста сказала пра гэта, ён мог бы зразумець і дараваць, бо Саша не адна, у яе — дзіця, сам ён, уцягваючы яе ў падпольную барацьбу, ніколі не забываўся на гэта. Але калі яна, як ён лічыў, пачынае выкручвацца, хітраваць, спасылацца на «высокія пачуцці» і прыцягваць да зусім рэальнай справы невядомага яму, Даніку, а таму і нерэальнага «свайго Пецю», гэта яго абурыла.

— Што Данік? Данік які быў, такі і астанецца. А вось ты... як ты пасля глянеш на сябе? Чалавек жыцця свайго не шкадаваў... А мы баімся прытулак яму даць. Няхай ранены замярзае ў лесе. Калі твой Пеця сапраўды чырвонаармеец, я думаю, не пахваліць ён цябе за гэта, калі даведаецца...

Сам таго не падазраючы, Данік сказаў такія словы, якія ўмомант змянілі кірунак імклівых Сашыных думак. Сапраўды, што сказаў бы Пеця, каб яна параілася з ім? Яна не ўпершыню правярала гэтак свае ўчынкі. Няўжо ён кіне ёй дакор, што яна дала прытулак раненаму партызану? Не, ніколі! Безумоўна, самой ёй будзе вельмі цяжка. Але каму цяпер лёгка! Хіба мае яна права засцерагаць сябе ад цяжкасцей, перажыванняў? Хіба яна не баец, як усе, не падпольшчыца-партызанка? Як жа яна адмаўляецца ад такога ганаровага задання? Ёй жа давяраюць жыццё партызанскага камісара!

Данік скрыгатнуў з роспачы зубамі і, ссутулены, падобны на старога, пасунуўся да дзвярэй.

— Данік! — спыніла яго Саша.— Чакай... Я згодна...

Ён зноў апынуўся каля яе, забыўшыся на сваю злосць, крыўду, і схапіў рукамі за плечы, нібы баючыся, што яна зноў перадумае і адмовіцца.

— Згодна?

— Ты не падумай, што я таму, што баюся... Але... Як Поля?

— А што Поля? Поля нічога не ведае і не павінна ведаць... Яна ж таксама ніколі ў вочы не бачыла твайго Пеці... Фотакартачка ў цябе адна, малюсенькая... Мы яе заменім.

Саша ўздыхнула і ціха, незласліва сказала:

— Дурань ты малы, Данік. Хіба гэта ад яе можна схаваць? У адной хаце жыць будзем... Яна ў першы ж дзень убачыць, што мы ніякія не жонка і не муж. Паспрабуй тады тлумачыць.

Юнак разгубіўся. Вось ліха, пра ўсё ён падумаў, усё ўлічыў, нават на фотакартку не забыўся, а вось гэта і ў галаву не цюкнула.

— Што ж ты прапануеш? — ужо нясмела, няўпэўнена спытаў Данік; ініцыятыва ў вырашэнні гэтай нялёгкай задачы цалкам перайшла да Сашы.

— Трэба сказаць Полі.

— Што ты! Спалохаецца. Загалосіць. Правaліць усю справу.

— Магчыма, спалохаецца, паплача, але... зразумее, Данік. Яна ж наша сястра. Усё адно без яе дапамогі нам не абысціся.

Позна ўвечары яны пачалі размову з Поляй. На прыпечку дагарэла лучына, і старэйшая сястра загадала:

— Спаць, дзеці! Заўтра Даніку рана ў лес, а ты, Саша, пойдзеш да цёткі Марыны, паможаш кросны паставіць. Яна прасіла. Ды і сама павучышся ніты закідаць.

Сашу кальнула ў сэрца: «Зноў ісці за наймічку».

Не было больш цяжкай пакуты, як ісці на заробак у чужую хату, працаваць пад наглядам людзей, у якіх тая перавага, што яны маюць чым заплаціць за працу. Яна ведала, што не ўсе гэтыя людзі кулакі ў душы, пераважная большасць з іх зусім не радуецца такому становішчу, аднак усё адно яе глыбока абражала плата натурай і асабліва словы спачування, якія часта прыходзіцца выслухоўваць. Цяжка бывае зразумець, хто з іх кажа шчыра, а хто зларадна: так табе і трэба, інтэлігентачка, доктарка.

Даволі часта Саша працавала не за хлеб і не за соль (соль была даражэй за ўсё), а за дзвесце грамаў газы ці за карабок запалак. Ёй так цяжка было ўставаць па некалькі разоў на ночы да дзіцяці без святла: не будзеш жа раздзьмухваць вугалькі і паліць лучыну, калі Ленка, мокрая ці, яшчэ горш, нездаровая, крычыць на ўсю хату. Здабытую газу ашчаджалі надзвычай.

Таму Поля вельмі здзівілася, калі Данік, у адказ на яе загад спаць, запаліў газнічку.

— Ты навошта гэта паліш без патрэбы? — накінулася яна на брата.

Ён моўчкі занёс газнічку ў запаветны закутак, куды яшчэ раней схавалася Саша, і паклікаў старэйшую сястру:

— Ідзі сюды, Поля.

Калі яна прыйшла, паказаў на ўслончык:

— Садзіся. Пагаварыць трэба.

Здзіўленая і крыху спалоханая, Поля паслухмяна села.

— Давай,— кіўнуў Данік Сашы: яны так дамовіліся, што гаварыць будзе яна, яе Поля спакайней выслухае, а на яго можа адразу накінуцца.

Саша села побач, плячо ў плячо, паклала руку на калена сястры.

— Слухай, Поля, што мы табе скажам. Не палохайся. Не злуйся. Ты ў нас была за маці, ты нас выгадавала, і мы цябе любім, як маці. Але тут справа такая... Зразумей нас... Мы з Данікам камсамольцы, і мы не маглі інакш...— Яна панізіла голас да шэпту.— Мы звязаны з партызанамі...

— І ты?! — здзівілася Поля, але не закрычала, не заплакала, а толькі сумна паківала галавой.— Што вы сабе думаеце! Ну няхай гэты сарвігалава... А ў цябе ж малое дзіця...

Такія спакойныя Поліны словы падбадзёрылі Сашу і Даніка, бо чакалі яны горшага.

— Поля,— зноў таямніча зашаптала Саша,— партызанскае камандаванне дало нам заданне... прытуліць у сябе... у нас у хаце раненага камісара... Яму зробяць дакументы на Пецю... Быццам яго з лагера адпусцілі...— Тлумачыць далей у яе не хапіла сілы. Яна змоўкла, і ў напружанай цішыні, у якой было чуваць, як лёгка патрэсквае кнот газнічкі, яны чакалі, што адкажа старэйшая сястра. Поля

маўчала. Данік сачыў за яе вялікім ценем на белай сцяне грубкі. Там адбілася ўсё: як яна ўздрыгнула, як адхіснулася ад Сашы, потым прытулілася зноў, як пачала павольна і панура нахіляцца яе галава.

Нарэшце Поля цяжка ўздыхнула. І яны зразумелі, што яна — іх саўдзельніца, іх верны таварыш па барацьбе.

Саша, адчуваючы, што вось-вось не стрымаецца і заплача, прытулілася тварам да яе пляча.

Данік па-мужчынску проста пахваліў:

— Малайчына ты ў нас, Поля!

VI

Ён прыехаў адвячоркам.

Фурман у аблезлым кажушку спыніў худога каня каля крайняга калодзежа, недалёка ад школы, дзе размяшчаліся паліцэйскія. Ён памог вылезці з саней чалавеку ў шынялі, у летняй фуражцы, з абмоткай на шыі замест шаліка, падаў яму мыліцу і амаль пусты рэчавы мяшок. Інвалід сунуў яму нейкія грошы, і фурман павярнуў каня назад.

Чалавек астаўся стаяць пасярод вуліцы, абапіраючыся на мыліцу. Левая нага яго была абута ў стаптаны кірзавы бот, на правай тоўста накручаны брудныя анучы.

Убачыўшы каля калодзежа старую, што з жаночай цікаўнасцю намагалася пазнаць салдата, ён пакульгаў да яе.

— Скажыце, дзе хата Фёдара Траянава? — спытаў ён.

— А вунь пятая адгэтуль... Вунь, дзе вялікая таполя...

— А Саша... Саша іх тут... дома?

— Саша? А Божачка ты мой! — адразу здагадалася і загаласіла жанчына.— Даражэнькі ты мой! Тут яна, дома твая Сашачка!.. З дочачкай роднай! А гаротны ты мой!..

«Ён ажно пахіснуўся»,— расказвала пасля жанчына, яна хацела падтрымаць, правесці, але ён падзякаваў і «не пайшоў, не пакульгаў, а трушком пабег, хоць і на адной назе».

Праз пяць мінут паўвёскі ведала, што прыйшоў без нагі муж Сашы Траянавай.

Данік назіраў з вышак сваёй хаты, праз шчыліну ў страсе. Калі чалавек стаў набліжацца, ён саскочыў адтуль і паведаміў сёстрам:

— Прыехаў! Ідзе...

Сашу, якая лічыла, што падрыхтавала сябе належным чынам да сустрэчы з гэтым чалавекам, ахапіў нейкі незразумелы страх. Яна замітусілася па хаце, не ведаючы, што рабіць, куды дзець сябе, схапіла Ленку, але адчула, што рукі трасуцца, і перадала малую Полі, якая сядзела за калаўротам. Паспрабавала наводзіць парадак, перастаўляць рэчы, папраўляць падушкі.

Поля сказала:

— Не трэба, Саша.

А што трэба? Што трэба ёй рабіць? У скронях балюча стукала кроў, ажно зялёныя кругі паплылі перад вачамі. Як яна скажа яму, чужому, незнаёмаму: «Ты, Пеця», як сустрэне яго?

Калі рыпнулі вароты, яна застыла пасярод хаты як каменная, баючыся павярнуцца, баючыся хоць на міг адвесці вочы ад дзвярэй. Фантастычна-неверагодная думка бліснула ў яе гарачай галаве: можа, Данік такім чынам падрыхтоўвае яе сустрэчу з Пецем?

Вось адчыняцца зараз дзверы, і зойдзе ён... Не, не, гэтага не можа быць, не павінна быць! Яна не жадае, каб ён быў у палоне, каб ён вярнуўся цяпер, калі ідзе бой за Маскву, за жыццё. Розумам яна не жадала яго звароту, а сэрца, дурное бабскае сэрца, замерла ў чаканні...

Дзверы адчыніліся, і... Саша ўскрыкнула, спалохаўшы Полю і Даніка.

На парозе стаяў Уладзімір Іванавіч Лялькевіч.

Саша адразу пазнала яго.

Ён акінуў хуткім позіркам прысутных — добра, што ў хаце не было нікога чужога! — зачыніў дзверы і пакульгаў да Сашы, якая стаяла нерухома, ашаломленая, разгубленая: як прыняць чалавека, які некалі дамагаўся яе кахання? Поля насцярожана ступіла насустрач яму, як бы жадаючы загарадзіць малодшую сястру.

Ён спыніўся перад імі і, не вітаючыся, аднак не зводзячы яснага і смелага позірку з Сашы, ціха сказаў:

— Паверце, Аляксандра Фёдараўна, што толькі сёння, калі мне расказалі падрабязна, назвалі ваша дзявочае прозвішча, я здагадаўся... зразумеў, што гэта — вы. Калі вам

вельмі непрыемна, я заўтра ж пайду, дазвольце толькі пераначаваць.— Ён апусціў вочы і схіліў галаву: ісці яму не было куды.— Вы скажаце, што я пайшоў праведаць сваіх бацькоў...

Поля зразумела, што гэта ўсяго толькі знаёмы, і, з палёгкай уздыхнуўшы, зірнула на Сашу.

«Чаму ж ты маўчыш? Скажы чалавеку слова!» — гаварыў яе позірк.

Саша схамянулася і працягнула руку:

— Добры дзень, Уладзімір Іванавіч.

Ён выпусціў мыліцу, нахіліўся, каб паціснуць яе руку, і пахіснуўся. Поля падтрымала яго:

— Ды вы сядайце. Дайце ваш мяшок. Распранайцеся.

Яны рабілі не тое, што трэба, не тое казалі адно аднаму. Даніку не спадабаліся не толькі паводзіны сясцёр, але і паводзіны самога камісара. Глянуўшы на вокны, ці не падглядаюць праз адтуліны ў шыбах цікаўныя вочы жанчын, дзяцей, ён гучна павітаўся:

— Здароў, Пецяl

Лялькевіч павярнуўся і адразу ж радасна абняў Даніка.

— Здароў, Данік, здароў, дарагі!..

Гэта было шчыра, бо яны ведалі адзін аднаго, сустракаліся ў атрадзе, калі Данік хадзіў увосень на сувязь і Лялькевіч гутарыў з ім. Камісар адчуў глыбокую ўдзячнасць да гэтага разумнага, смелага хлопца і расчуліўся да слёз. Убачыўшы, як заблішчалі яго вочы, не стрымалася — заплакала Поля. Замітусілася, памагла яму скінуць шынель, пасадзіла на лаву. Саша цяпер толькі ўбачыла яго нагу, абкручаную анучамі, мыліцу, якую ён паклаў побач, успомніла Пецю і таксама праслязілася. Слёзы іх аказаліся вельмі дарэчы, бо праз хвіліну ў хату ўскочыла суседка Аксана — прынесла сіта, якое ўзяла з тыдзень назад і ўсё забывалася вярнуць. Яна спынілася каля парога, прыкінуўшыся, што збянтэжылася, убачыўшы незнаёмага чалавека. Данік і тут не разгубіўся. Ён амаль з дзіцячай непасрэднасцю паведаміў:

— Ксана! Сашын муж прыйшоў... Пецяl З лагера!..

Маладая жанчына, якая, пачуўшы гэту навіну на вуліцы, прыбегла, каб пераканацца самой, ад нечаканасці выпусціла з рук сіта, яно пакацілася цераз усю хату пад ногі Сашы.

Аксана нясмела, сарамліва падышла, працягнула чырвоную, загрубелую руку:

— Добры дзень, Пеця. Са зваротам вас... Шчаслівым... Няхай будзе шчаслівы...

Потым кінулася да Сашы, абняла і залілася слязьмі. Убачыла чужыя радасць і гора — успомніла сваё: забітага немцамі свёкра, мужа, які невядома дзе цяпер, можа, даўно снег укрыў яго белыя косці.

Саша разумела, што ёй трэба адказаць слязьмі і нейкімі словамі. Але не было ні слёз, ні слоў. У гэты момант заплакала ў калысцы Ленка. Поля ўзяла яе і паднесла «бацьку». Ён пацалаваў і ціха сказаў:

— Дачка мая.

Саша ўздрыгнула, пачуўшы гэта. Яна забылася на Аксану, на яе слёзы, уся неяк сціснулася, напружылася і раўніва сачыла за кожным рухам Лялькевіча, гатовая ў любую хвіліну кінуцца і адабраць у яго дзіця. Якая яна яму дачка! Але Уладзімір Іванавіч як бы адчуў гэта і хутка перадаў малую Полі. Саша ўздыхнула, успомніла сваю ролю і пацалавала суседку ў мокрую шчаку.

— Супакойся, Аксана. Такі наш лёс жаночы.

— Ксана,— звярнулася да яе Поля,— ты пазычыш мне?..— Яна не сказала — чаго.— Госця сустрэць. Можа, калі-небудзь разжывёмся...

— Полечка, родная, про што ты кажаш! Усё, што ёсць у маёй хаце! Усё! Разам жыць — разам гора перажыць...

Поля і Аксана хутка выйшлі.

Данік хітра ўсміхнуўся камісару:

— «Полечка, родная, пра што ты кажаш!» Усё, чым мы сустракаем госця.

Яны асталіся адны, калі не лічыць Ленку. Хвіліну маўчалі.

«Чаму ён маўчыць?» — нервавалася Саша. Але каб яна не баялася глянуць, то здагадалася б, чаму ён маўчыць. Пасля непасільнага для раненага напружання і душэўнага хвалявання камісару стала блага. Збялелы, ён прытуліўся галавой да сцяны, баючыся страціць прытомнасць. Не, і на гэты раз ён перамог сваю слабасць, выцер рукавом халодны пот на лбе, ціха папрасіў:

— Аляксандра Фёдараўна, дайце, калі ласка, вады.

Яна глянула і ахнула:

— Вам нядобра?..

Ён піў, і зубы яго стукалі аб конаўку. Цяпер яна стаяла побач, уважлівая, чулая, забыўшыся на свае пачуцці.

— Можа, ляжаце?

— Не, нічога. Прайшло.— Ён вінавата ўсміхнуўся.— Аляксандра Фёдараўна, я хачу, каб вы паверылі, што я нічога не ведаў... Для мяне гэта вельмі важна.

— Уладзімір Іванавіч, навошта вы так? Чаму вы думаеце, што я не веру вам? Вы як бы засцерагаеце мяне ад нечага, і выходзіць, што вы самі не верыце мне. Зразумейце, для мяне гэта заданне арганізацыі, ваша...

— Толькі не маё...

— Партызан! А вы іх камандзір. Глядзіце на мяне як на партызанку, якая выконвае ваша заданне. Так мне лягчэй будзе. Вы — камандзір, я — ваш баец. Аб усім іншым я сама буду думаць. Аб сваёй дачцэ, аб сваім мужу...

Ён схіліў галаву:

— Я разумею вас. Дзякую вам.

Саша нахмурылася.

— Завошта дзякаваць? Я нічога яшчэ не зрабіла.— І, жадаючы перавесці размову на іншую тэму, яна спытала: — Даўно вас ранілі?

— На свята. Мы вырашылі паднесці ім «святочны сюрпрыз». Наляцелі на Зубраўку, там у іх склад боепрыпасаў. Склад мы запалілі... Але на станцыі чамусьці апынуліся танкі. Гітлераўцы кінулі іх наўздагон нам. Танкі білі з гармат. І мяне — асколкамі...

— Скажыце, многа ў вас там людзей, у лесе?

— Многа.— У яго карых вачах успыхнула ледзь прыкметная ўсмешка.— Вы маеце на ўвазе наш атрад? Але хіба наш атрад адзін? Атрады ўсюды, у кожным раёне, у кожным лесе. Яны растуць, як грыбы.

Саша даверліва наблізілася:

— Вось добра! Трэба, каб пра гэта ведалі людзі. А то мы сядзелі тут, што ў цемры. Нічога не ведалі, нічога не бачылі. Пакуль хлопцы не звязаліся з вамі. Вы не ўяўляеце, як гэта страшна. Якія цяжкія думкі з'яўляюцца.

Вочы камісара раптам загарэліся дзіўным агнём, ён азірнуўся на вокны і схапіў Сашу за руку. Яна хацела адняць руку, але ён цягнуў яе да сябе.

— Слухайце, Аляксандра Фёдараўна! Вам... вам першай... я скажу навіну... Шчаслівую навіну. Пазаўчора па радыё прынялі...

Пачуўшы гэта, Саша паслухмяна села на лаву, побач з ім, не аднімаючы больш рукі, якую ён сціскаў усё мацней і мацней.

— Нашы разграмілі немцаў пад Масквой. Чуеце, Саша? Разбілі! І гоняць прэч гадаў. Тысячы трафеяў! Тысячы палонных!.. Вось пра гэта трэба, каб народ як мага хутчэй даведаўся! У маім шынялі зашыта некалькі лістовак. Мы іх размножым...

Нехта застукаў у сенцах. Яны спынілі размову, і Саша хутка адышла да калыскі. Радасна ўсхваляваная навіной, яна падумала, што чалавек гэты прыйшоў сюды не толькі дзеля таго, каб залячыць свае раны, але і каб працягваць барацьбу, кіраваць імі, маладымі падпольшчыкамі.

Праз гадзіну-паўтары, калі добра ўжо сцямнела, у хаце сабраліся Аксана, дзядзька Раман з жонкай, сусед Хвядос, які месяцы два таму назад прыйшоў, ранены, з акружэння, дзве суседкі-бабулі. Жанчынам хацелася пабачыць Сашынага мужа, мужчынам — чалавека, які вярнуўся з лагера палонных. На стале, засланым святочным абрусам, тым, што ткала яшчэ нябожчыца маці ў пасаг дочкам, стаялі талеркі са скрылькамі сала, міскі з гуркамі, капустай, бульбай, ад якой да самай столі падымалася пахучая пара, дзве пляшкі самагонкі, закаркаваныя кавалкамі кіяха.

Спачатку ўсе паводзілі сябе стрымана, паважна, як належыць у такіх выпадках. Мужчыны, увайшоўшы ў хату, віталіся з «Пецем» за руку, цёткі цалаваліся з Сашай і плакалі. У тыя чорныя дні ў жанчын хапала прычын, каб плакаць.

За стол селі не ўсе: суседкі ад запрашэння ветліва адмовіліся і прымасціліся на лаве. Дзядзька Раман, чалавек дасціпны, бывалы, узяў сабе ролю гаспадара, па вясковых

законах у яго на гэта было маральнае права: Саша — яго хросніца. Шклянак было ўсяго дзве, і дзядзька Раман наліў у першую чаргу сабе і «Пецю».

— Ну, сынок, за тое, каб нам жыць і жыць, на злосць супастатам. Не гаруй, што без нагі... Кажуць, чаму бываць, таго не мінаваць. Судзьба. Я вось з пятнаццатага года на дзеравяшцы... Таксама ад іх снарада.— Ён кіўнуў галавой у акно.

Саша, якая насцярожана сачыла за ўсім, убачыла, як уздрыгнулі ў Лялькевіча бровы і задрыжала рука. «Навошта дзядзька суцяшае? Каму лёгка ў дваццаць пяць год аставацца калекам? Навошта пра гэта напамінаць?»

А дзядзька не сунімаўся:

— Але нічога, брат, як бачыш, жыву. Была б галава на плячах. А ў цябе яна ёсць. Чалавек ты вучоны. Тэхнік. Мы з табой яшчэ не адну дарогу пабудуем, на злосць супастатам. Дык будзьма ж!..

Саша не садзілася. Поля ўступіла ёй абавязкі гаспадыні, і яна завіхалася па хаце, шукаючы сабе работы і стараючыся менш быць на святле — над сталом гарэла Аксаніна лямпа. Саша калыхала дачку, падавала капусту, падкідвала дровы ў печ, дзе варыўся другі чыгун бульбы. Калі выпілі ўсе, хто сядзеў за сталом, Саша паднесла пачастунак суседкам. Бабулі хрысціліся і казалі аднолькавае пажаданне:

— Няхай табе Бог шчасця дае. Каб шчасліва жылося вам...

Прыгублівалі для прыліку, выціралі рагамі хустак вусны і адмаўляліся ад закускі.

У Сашы ад іх простых і шчырых слоў балюча сціскалася сэрца. «Каб нам шчасліва жылося? Бабулькі, родныя, каб вы ведалі, хто мы! Але так трэба... Так трэба!»

Мужчыны не саромеліся закусваць, але больш налягалі на гуркі і бульбу, бо ведалі, што сала ў гэтай сірочай хаце не сваё — пазычанае.

Лялькевіч выпіў, з'еў гарачай бульбы, і бледны твар яго пакрыўся нездаровымі чырвонымі плямамі.

— Што, братка, кажуць, страх што робіцца ў гэтых лагерах? — спытаў Хвядос, з жахам думаючы, што ён таксама мог трапіць туды.

— Ды ўжо ж вядома, у палоне — не ў цешчы ў гасцях,— стрымана адказаў Лялькевіч, зірнуўшы на Даніка, які адзін за ўсіх апетытна ўплятаў сала.

— Кажуць, раненых ды хворых яны канчаюць там, душагубы праклятыя,— азвалася цётка Ганна, Раманава жонка.

Лялькевіч кінуў позірк на Сашу. Яна стаяла ля калыскі і ў сваю чаргу глядзела на яго, разумеючы, як нялёгка адказваць яму на такія словы: трэба захаваць асцярожнасць і ў той жа час не здацца гэтым добрым людзям чужаком, не страціць іх давер.

Ён уздыхнуў:

— Розныя і сярод іх ёсць. Некаторыя на вайне звярэюць.

— Ох, звярэюць. Горш за звяроў робяцца,— не стрымалася зноў Ганна.

— А ўвогуле, ёсць міжнароднае правіла, як адносіцца да палонных,— змякчыў Лялькевіч свае і цётчыны словы.

— Эх, братка ты мой! — махнуў рукой Раман.— Правіла ты хацеў ад гэтых супастатаў! Бачыў ты ў іх правіла?

— Дачка мая Прося, што ў Баршчоўцы замужам, расказвала...— умяшалася ў размову адна з бабуль, што дагэтуль маўкліва сядзела на лаве.— У тую нядзельку прыходзіла адведаць мяне. Дык яна расказвала. Вялі гэтыя ірады праз іх сяло, можа, тысячу нашых салдацікаў... Вывелі на луг і ўсіх палажылі, саколікаў. Завошта? Божачка ты мой! Колькі крыві людской льецца!

Мабыць, адчуўшы, што размова набывае не зусім пажаданы ў такіх умовах характар, Хвядос спытаў:

— І многіх яны адпускаюць?

Лялькевіч вырашыў: лепш няхай падумаюць блага аб ім, чым адразу наклікаць падазронасць паліцыі. Хто-небудзь з жанчын па наіўнасці сваёй раскажа, якія размовы вяліся ў дзень яго прыезду,— і ён можа аказацца пад наглядам, а гэта вельмі і вельмі непажадана.

— Многіх,— адказаў ён.— А што ім цяпер баяцца? Кажуць, Маскву ўзялі...

Але атрымалася горш.

— Маскву? — ажно страпянулася Аксана.— І вы паверылі? Брэшуць яны, як сабакі! Яны яшчэ перад святам крычалі пра гэта... А я сама чытала...

Данік азірнуўся на вокны.

Поля тузанула суседку за рукаў:

— Ксана!

Дзядзька Раман хуценька схапіўся за пляшку:

— Вып'ем, браткі, яшчэ па адной. Вып'ем, на злосць...

Забулькала самагонка.

Заскрыпеў кручок на столі, за які была падвешана калыска — Саша гайданула яе мацней, чым звычайна.

Аксана таксама зразумела, што сказала залішне, і схапіла налітую дзядзькам шклянку:

— Вып'ем, мужчынкі! Вып'ем, бабы! Саша! Чаму ты ад нас хаваешся за печ ды за люльку? Хадзі да стала! Сядай побач з мужам, мы паглядзім, якая вы пара. Ці падыходзіце вы адно аднаму?

Астатнія жанчыны, сваячкі і суседкі, падтрымалі яе:

— Праўда, Саша. Што ты яе ўсё калышаш? Спіць дзіця і няхай спіць. А ў печы Поля пагля дзіць. Сядай.

І нават Данік таксама сказаў паважна, сур'ёзна:

— Сядай, сястра.

Аксана падхапілася, абняла яе, прывяла да стала. Ёй далі месца побач з «мужам». Яна села, сцішаная, нясмелая, нязграбная. А ўсе ў вёсцы ведалі яе як самую вяртлявую, дасціпную, вясёлую дзяўчыну. І яе палохала ўласная скаванасць: убачаць іх побач і адразу зразумеюць, што ніякія яны не муж і жонка. Саша, панурыўшыся, глядзела ў шклянку з мутнай вадкасцю, якую ёй нехта падсунуў.

— Саша, падруга ты мая дарагая! Гляджу я на цябе і дзіўлюся: быццам не рада ты, што вярнуўся твой Пеця. Божачка мой! Ды няхай бы мой Іван вярнуўся без нагі, без рукі, я на руках яго насіла б, як дзіця. Але хто ведае, ці вернуцца нашы. Можа, мы даўно ўжо ўдовы і дзеці нашы сіраты.— І Аксана залілася слязамі, а следам за ёй і іншыя жанчыны.

Саша падняла галаву і глянула на Лялькевіча, позіркі іх сустрэліся. У яго запалых вачах блішнулі расінкі слёз. Ён выцер іх пальцамі. Саша кіўнула яму, як блізкаму чалавеку, і працягнула сваю насавую хустачку. Ён узяў яе і выцер вочы. Удзячна ўсміхнуўся ў адказ і падняў шклянку, моўчкі запрашаючы выпіць. Саша паказала позіркам на калыску: нельга, мне карміць дачку.

— Нічога, Сашачка, спаць лепей будзе ваша Ленка,— падтрымала яго запрашэнне цётка Ганна.

Яны выпілі. За гэтай іх нямой размовай пільна сачылі ўсе прысутныя, і яна расчуліла і ўзрадавала гасцей. Значыцца, паміж Сашай і «Пецем» усё як мае быць, і абодва яны вунь як рады, ажно слоў не знаходзяць, каб выказаць сваю радасць. І ўсім стала хораша ад гэтага. Усе весела загаманілі, пачалі выпіваць. Цётка Ганна, відаць, трохі ап'янела. Ёй захацелася пацалаваць «Пецю». Яна цераз стол пацалавала яго худую калючую шчаку. І новая думка асяніла яе.

— Сашачка! Мы ж на тваім вяселлі не былі. Дык няхай жа сустрэча гэтая і будзе вяселлем для нас, бо што ў вас там раней было, мы не ведаем...

У Сашы заняло дух і самлелі рукі ад гэтай новай выдумкі і прапановы. Праўда, дзядзьку Раману не спадабалася.

— Што ты мелеш, жонка! Якое табе яшчэ вяселле!

— А якога ты хацеў цяпер? Сабраліся людзі, радуюцца, што сустрэліся маладыя, можа, іх шчасце вярнулася — вось табе і вяселле!

Аксана, як толькі пачула пра вяселле, выцерла рогам хусткі вочы і разам са слязамі як бы сцерла з твару ўвесь смутак і гора: кінула гарэзлівы позірк на «жаніха» і «нявесту», пляснула ад задавальнення рукамі.

— Праўду кажа цётка Ганна! — Узяла шклянку, прыгубіла і зморшчылася, закруціла галавой.— Ой, горка!

Ганна і суседкі-бабулі адразу падтрымалі яе:

— Горка! Горка!

Саша адчула, як да шчок, да вушэй хлынула кроў, запульсавала ў шыі, у скронях, а ў грудзях стала пуста і халадна. Яна адчувала, што Лялькевіч глядзіць на яе, чакае, і баялася ўзняць вочы. З-за яго спіны Данік моцна штурхануў яе ў бок; брат загадаў: рабі што трэба!

— Божачка мой! — засмяялася Аксана.— Дзіця нарадзіла, а саромеецца, як малая!

Лялькевіч устаў, абапіраючыся на стол. Данік штурхануў сястру другі раз. Тады Саша таксама паднялася, рашуча паклала рукі на яго плечы, але глянуць у вочы не адважвалася. Убачыла, што на гімнасцёрцы ў яго армейскія гузікі з зоркамі, і падумала, што гузікі трэба замяніць на звычайныя, каб

часам які-небудзь п'яны паліцай ці немец не прычапіўся. За гэтай староннняй думкай яна амаль не пачула, як ён пацалаваў — ледзь дакрануўся да яе вуснаў. Але жанчыны весела зашумелі, і Саша, схамянуўшыся, глянула на іх дзёрзка, смела і таксама засмяялася. З гэтага моманту яна пачала іграць ролю жонкі зусім натуральна.

Цётка Ганна заспявала вясельную:

Ой, ляцелі гусачкі цераз сад,
Крыкнулі, гукнулі на ўвесь сад...

Падхапілі жанчыны. Заспяваў Лялькевіч, за ім — Саша.

Не скончылі адну песню, як часта гэта бывае ў бяседзе,— адна з суседак зацягнула другую, працяжную і сумную:

Ляцяць, ляцяць шэрыя гусі цераз сад,
Вядуць, вядуць сіротачку на пасад...

Саша не ведала слоў гэтай старой песні. Лялькевіч успомніў, што песня занадта жаласлівая, што Сашу, якая расла без маці, яна можа засмуціць, а таму, перапыніўшы жанчын, заспяваў іншую:

Як сарву я ружу-кветку
Ды пушчу на ваду...

Магчыма, на нейкі момант людзі забыліся, што недзе лютуюць вайна і смерць. Ім захацелася хоць хвілінку нейкую пабыць там, дзе заўсёды славяць жыццё і маладосць,— на сапраўдным вяселлі. Колькі цудоўных, душэўных песень склаў народ аб гэтай падзеі — сумных, вясёлых, сур'ёзных, смешных! Колькі чароўнай прыгажосці ў вяселлі! Дык як жа не забыцца пра ўсе навалы, убачыўшы перад сабой маладых?

Толькі самы стары і самы юны не паддаліся гэтым чарам — дзядзька Раман і Данік. Яны сядзелі і маўчалі.

І сапраўды, забывацца не варта было: вайна вельмі хутка напомніла пра сябе — не паспелі нават праспяваць да канца песню. Яна з'явілася ў вобразе начальніка паліцэйскага атрада — Якіма Гусева.

Ён вырас на парозе нечакана, без стуку, без шоргату, як прывід, і засланіў сваёй дужай плячыстай постаццю ўвесь дзвярны праём.

Саша ўбачыла яго першая і... анямела. Яна нямала ўжо наслухалася, які гэта хітры, бязлітасны і страшны чалавек. У вёсцы хадзілі чуткі, што ён абрабаваў і забіў не то маці, не то родную сястру і за гэта меў дзесяць год. Немцы вызвалілі яго з турмы і зрабілі забойцу і рабаўніка «панам начальнікам».

Забыўшыся на ўсё іншае, Саша сціснула пад сталом калена Лялькевіча, папярэджваючы аб небяспецы. Ён зразумеў, што яна спалохалася, і пагладзіў яе руку, заклікаючы супакоіцца. Але Сашы не верылася, што з'яўленне гэтага чалавека не прынясе няшчасця. А раптам яму ўсё вядома? Што ім рабіць тады?

— О, ды тут вяселле! — выгукнуў ён сваім глухім, але моцным голасам.— Хлеб-соль!

— Дзякуй, просім да стала,— адразу, па-народнаму проста, натуральна адказала Поля.

— Просім! — падтрымалі яе жанчыны.

— Калі ласка, пан начальнік! — сказаў Данік і першы вылез з-за стала, даючы месца.

Данік адышоў да печы і стаў там. Саша глянула на брата і раптам зразумела, што ён узброены і гатовы да любых нечаканасцей. Гэта неяк адразу супакоіла яе.

Начальнік атрада падышоў да стала:

— Госць?

— Але, пан начальнік, адваяваў,— спакойна кіўнуў Лялькевіч пад стол, на свае ногі.— Вярнуўся да яе.— Ён паклаў на Сашына плячо руку.— Што калеку больш трэба? Дзякуй Богу, што жонка прыняла...

— Ведаю,— перапыніў яго Гусеў.— Чуў. Аднак, брат, служба. Мушу праверыць дакументы.

Камісар спакойна расшпіліў кішэню гімнасцёркі. Саша зноў убачыла гузік з зоркай і зноў адчула халадок пад сэрцам.

Гусеў разглядаў дакументы вельмі ўважліва, нават адну нейкую паперку паглядзеў на святло лямпы. Чытаючы, варушыў губамі і жмурыў адно вока. Вяртаючы дакументы, кінуў Сашы:

— Пашанцавала табе. Калі з галавой — будзеце жыць прыпяваючы.

Лялькевіч хутка наліў шклянку самагонкі:

— Чарку, пан начальнік. За знаёмства.

Гусеў паглядзеў на шклянку, як галодны воўк, ажно іскры ў вачах блiснулі (усе ведалі, што п'е ён страшэнна), ад спакусы лізнуў языком тоўстыя сінія губы, але перадужаў сябе і адмовіўся:

— Служба, брат.

— Не грэбуйце, пан начальнік,— загаманілі адразу бабулі, якія дагэтуль маўчалі, нібы вады ў рот набраўшы, моцна спалоханыя яго прыходам.

Ён адрэзаў катэгарычна, нават злосна:

— Не магу! — І, павярнуўшыся да дзвярэй, літасціва дазволіў:— Газуйце! Можаце гуляць пазней.

Хадзіць па вёсцы дазвалялася да дзевяці вечара.

Але хто мог гуляць пасля яго наведвання? Бяседа адразу разладзілася. Першыя са словамі: «Ой, Божачка, засядзеліся мы, не маючы сораму!» — разбегліся суседкі. За імі Хвядос. Асталіся Раман з Ганнай і Аксана.

— Вып'ем, Пеця, па апошняй,— уздыхнуў стары.— На злосць супастату.— Ён ледзь прыкметна кіўнуў на акно.

— Гад,— з нянавісцю прашаптала Аксана, маючы на ўвазе таго ж, на злосць каму прапаноўваў выпіць Раман.

Калі і гэтыя госці развіталіся, Лялькевіч з дапамогай Даніка перабраўся на ложак і ціха паклікаў Сашу:

— Аляксандра Фёдараўна! А цяпер успомніце сваю прафесію. Цяжкія ў вас абавязкі. Прабачце.

Саша пачала перавязваць яго і жахнулася: натруджаныя за дзень раны адкрыліся, крыватачылі. І адразу ў яе чулым сэрцы з'явіліся жаль і пяшчота да гэтага чалавека. Яна горача прашаптала:

— Родны вы мой! Як жа гэта вы? Яшчэ песні спявалі! Што ж вы раней не сказалі мне?..

Адрываючы бінты, яна ўбачыла, як ён збялеў, якія буйныя кроплі поту выступілі на лбе і скронях, але ён ні разу не застагнаў, не войкнуў, толькі да крыві прыкусіў губу. З дапамогай Полі і Даніка яна прамыла, апрацавала раны, умела і хутка зрабіла перавязку. Калі змазвала ёдам губу, ён схапіў яе руку і прыцiснуў да сваёй гарачай калючай шчакі

і гэтак ляжаў, заплюшчыўшы вочы, без слоў, без рухаў, у парыве ўдзячнасці. Саша з мацярынскай ласкай пагладзіла яго стрыжаную галаву.

VII

На людзях Саша казала Лялькевічу «Пецц» і «ты». А сам-насам яна звярталася гэтак жа, як тады, калі яны працавалі ў Заполлі, яна — фельчарам, ён — настаўнікам. Толькі без ранейшых жартаў, без весялосці, са значна большай павагай: яна забывалася, што ён настаўнік, але заўсёды помніла, што ён — камісар атрада.

Аднойчы Лялькевіч сказаў ёй:

— Аляксандра Фёдараўна, ці не лепш нам увесь час казаць адно аднаму ты? А то не памыліцца б часам пры староніх, не выдаць бы сябе!

Яна нічога не адказала на яго прапанову: адносіны іх аставаліся такімі ж, як у першы дзень, і ён, разумны, далікатны чалавек, больш ніколі не вяртаўся да гэтай тэмы. Ён добра разумеў яе душэўны стан.

Сашы было цяжка. Да таго як прыехаў Лялькевіч, яна ўспаміна мужа, сумавала, зрэдку плакала над калыскай, па-простаму, па-жаночаму пытаючыся: «Дзе наш тата, дачушка мая? Ці жывы ён? — і тут жа суцяшала сябе: — Жывы, жывы, Леначка! Сэрца маё чуе».

Было гора. Але яна штодзень бачыла Аксану і тых жанчын, у каго асталося па двое, па трое і больш дзяцей, і яе гора танула ў акіяне ўсенароднага гора, яе слёзы здаваліся кроплямі ў моры жаночых слёз. У цяжкай працы, у клопатах аб кавалку хлеба для сябе і блізкіх ёй удавалася гадзінамі не думаць пра Пецю. Збіраючыся разам, жанчыны часам жартавалі і смяяліся, расказвалі пра розныя вясёлыя здарэнні — не ўсё ж гаварыць пра вайну і ліць слёзы! — і ў такія хвіліны яны забываліся на тое, што кожная з іх перажыла і перадумала бяссоннымі начамі, і гэтыя паўзы, гэтыя перадышкі аднаўлялі іх сілы, іх мужнасць і цвёрдасць.

Цяпер у Сашы не стала гэтых разрывак. Жанчыны смяяліся, а яна ні на момант не пераставала думаць, што недзе ў хаце ляжыць чалавек, якога ўсе яны лічаць яе мужам. Яна думала пра яго, бачыла Пецю. Заўсёды, уначы і ўдзень, на рабоце і ў часе адпачынку, кожную секунду яны абодва стаялі перад яе вачамі, і за абодвух яна хвалявалася, перажывала. Часам жанчыны пыталіся ў яе з жартаўлівым намёкам:

— Як ён у цябе, Саша, акрыяў хоць трохі? Кармі яго лепей, не скупіся.

Яна любіла і разумела жарты, але гэты жарт вельмі балюча кранаў сэрца.

Неяк Уладзімір Іванавіч у ціхай размове, якую яны часам цяпер вялі ўвечары, сказаў Даніку:

— Слухай, Данік, ці нельга табе наладзіць «дружбу» з паліцаямі, так, як ты ладзіў з Кузьмою? Нам гэта можа спатрэбіцца.

Хлопец пашкроб патыліцу:

— Я, вядома, магу. Але ведаеце, Уладзімір Іванавіч, чаго я баюся? Што я раблю для нашай перамогі — таго вяскоўцы не ведаюць, не бачаць, а «дружбу» з паліцаямі адразу ўсе ўбачаць. Вернуцца нашы, а вас, можа здарыцца, не будзе блізка, атрада таксама, і возьмуць тады мяне за штаны свае ж людзі. Крыўдна гэта будзе вельмі.

Сашу надзвычай уразіў такі погляд брата ў будучыню, у тыя дні, калі, напэўна, кожны павінен будзе даць адказ калі не перад людзьмі, то перад уласным сумленнем, што ён зрабіў для перамогі.

У тую ж ноч, калі пагасілі каганец і кожны лёг на сваё месца, у яе бліснула гэтая страшная думка: вернуцца нашы, прыйдзе Пеця і... раптам ён не зразумее, не захоча зразумець, чаму яна прытуліла Лялькевіча, назвала мужам. Кажуць, раўнасць асляпляе чалавека, робіць неразумным. Яна зноў прыгадала, як Пеця прыраўнаваў да гэтага ж Уладзіміра Іванавіча, калі ўбачыў іх разам на валейбольнай пляцоўцы, як ён сапраўды страціў тады розум і проці ночы пабег немаведама куды і ледзь не трапіў у абдымкі Любы. Што, калі ён зноў не зразумее, не паверыць, што толькі выпадак, выключны выпадак звёў іх разам? Як гэта будзе страшэнна крыўдна і абразліва!

«Не,— пераконвала яна сябе,— тады ён быў малады, неразумны, і нас нішто не звязвала. А цяпер ён сталы, ён сам пройдзе праз вялікія выпрабаванні і пакуты, і цяпер у нас дачка. Як жа ён зможа хоць на хвіліну ўсумніцца ў маёй сумленнасці і адданасці! Нарэшце, яму скажуць Поля, Данік, Уладзімір Іванавіч...»

Потым ёй стала цяжка не ад таго, што гэта можа здарыцца, што Пеця прыраўнуе, а ад таго, што ў яе з'явілася такая думка аб ім, якая нібы кідала цень на светлы вобраз мужа. Выходзіла так, быццам бы яна, Саша, кепска ведае бацьку сваёй дачкі і сумняваецца ў яго розуме, шчырасці, высакародстве. Праз гэта яна доўга пакутавала.

Партызаны перадавалі цераз хлопцаў медыкаменты, рыбін тлушч, і Лялькевіч пры добрым Сашыным і Поліным доглядзе хутка ачуняў, раны яго «гаіліся, як ад жывой вады»,— жартаваў ён сам. Праўда, тлушч ён рэдка піў — аддаваў Ленцы: малой спадабалася прысмака, і шчокі яе за які-небудзь тыдзень прыкметна паружавелі. Увогуле яго адносіны да Ленкі таксама выклікалі ў Сашы незразумелую трывогу і рэўнасць. Вельмі ж ужо ласкавы і чулы быў гэты чужы чалавек да яе дачкі. Саша доўга пазбягала пакідаць Ленку з ім. Але гэта рабілі Поля і Данік, і камісар атрада цудоўна спраўляўся з нялёгкімі абавязкамі нянькі. Вярталася Саша, хапала дачку на рукі, а яна плакала і цягнулася назад, да ложка, на якім сядзеў ці ляжаў Лялькевіч. У Сашы балюча шчымела сэрца. І ў той жа час самую яе нейкая невядомая сіла цягнула да гэтага чалавека. Яна не памылілася, калі падумала, што ён прыйшоў не толькі дзеля таго, каб залячыць свае раны. Ён адразу ўзяў у свае рукі кіраўніцтва іх групай, цяпер уся дзейнасць маладых падпольшчыкаў накіроўвалася ім.

Але, відаць, не толькі іх групай ён кіраваў. Трымаючы шчыльную сувязь з атрадам, ён рабіў нешта значна большае... Недарма ўжо праз некалькі дзён паслаў ён Даніка ў Гомель з нейкім сакрэтным заданнем. Праз яго Саша даведалася нарэшце, хто такі Стары, імя якога хлопцы ўтойвалі нават ад яе, члена арганізацыі.

Увечары перад Калядамі за акном іх хаты пачуўся моцны і прыгожы мужчынскі бас:

Шчадрую, шчадрую,
Каўбасу чую.
Дайце каўбасу —
Дамоў панясу,
Дайце другую —
Яшчэ пашчадрую...

Потым той жа голас выгукнуў на ўсю вуліцу:

— Хлопцы! Вы давайце далей, а я забягу ў гэтую хату. На каўбасу тут надзея малая, але хачу паглядзець, што за чалавек прыйшоў да Хведаравай дачкі. Кажуць, песні ведае. Можа, мы спеліся б з ім!

— Каваль наш. Дзівакаваты чалавек. Сам каваль, і прозвішча Кавалёў,— растлумачыла Саша Лялькевічу, які моўчкі ляжаў на ложку і прыслухоўваўся да шчадровак за акном. Яны толькі двое былі ў хаце. Саша гатавала вячэру. Занятая сваёй справай, яна не бачыла, як усміхнуўся камісар. Ды і цяжка было ўбачыць: хату толькі напалавіну асвятляў чырванаваты дрыготкі водбліск агню, што гарэў на прыпечку; кут за грубкай, дзе стаяў ложак, тануў у змроку.

...Сапраўды, калгасны каваль Аляксей Сафронавіч Кавалёў меў славу дзівака. Некалі ён служыў дыяканам. Але ў годзе трыццатым адмовіўся ад гэтай непрацоўнай прафесіі і пайшоў на завод кавалём. Тлумачыў свой пераход ён заўсёды жартам: «За голас мой і імя — «Аляксей — чалавек Божы» — бацька, паслухаўшыся папа, паслаў мяне вучыцца на «святога айца», спадзяваўся, што я мітрапалітам стану. Але ўратавала мяне ад духоўнага сану маё прозвішча, яно падказвала, што месца маё не ў царкве, а ў кузні».

Голас ён меў сапраўды моцны і прыгожы, акрамя таго, каваль быў добры музыка — граў на гармоніку і скрыпцы. А таму ўсё наваколле ведала яго не горш, як таго папа, бо ён быў госцем амаль на кожным вяселлі, на кожных радзінах і нават на многіх гулянках моладзі. Бывала, выйдзе ўвечары з хаты, пачуе, што недзе на другім канцы вёскі, а то і ў суседнім пасёлку моладзь спявае, паслухае — і да жонкі: «Эх, маці, хораша спяваюць! Збегаю падтрымаю».

Жонка, з якой ён жыў, як казалі, «душа ў душу», ніколі не пярэчыла, і гэты грузны мужчына, якому падбіралася пад пяцьдзесят, са спрытам юнака бег на спеў, каб «адвесці душу». За гэтае дзівацтва некаторыя лічылі, што ў каваля «не ўсе дома». Збівала яго з «нармальнага тропу» яшчэ адна «хвароба», якая, як ён сам тлумачыў, і прывяла яго з горада ў прырэчную вёску,— быў ён надзіва заядлы рыбалоў. За гэта і за вясёлы характар асабліва любілі каваля дзеці, яны заўсёды былі яго лепшымі сябрамі. Здаралася, што ў прыпар ламалася жняярка ці малатарня, прылятаў коннік у кузню, а каваля няма. Але кожны з вяскоўцаў ведаў, дзе і як яго шукаць — каля рэчкі, па галасах дзяцей.

...Каваль адчыніў дзверы ў хату і, замест звычайнага прывітання, грымнуў так, што ажно калыхнулася полымя на прыпечку:

— Раждзя-яство-о тва-ає-о, Хрысце-е, Бо-о-жа на-аш!..

Саша са смехам заціснула вушы; яна любіла гэтага вясёлага чалавека, ведала, які ён жартаўнік.

— Дзядзька Аляксей, дачку разбудзіце.

Ён заціснуў далоняй рот.

— Прабачай, атракавіца. Забыўся. Мір дому сяму.— Зняў шапку, угледзеўся ў паўзмрок.— Кажуць людзі, добрага чалавека ты сабе прыдбала?

— Чалавек як чалавек,— усміхнулася Саша.

— Кажуць, песні ведае?

— Спявае часам. Пеця! — паклікала яна.

Зарыпеў ложак, стукнула мыліца — Лялькевіч выйшаў з-за грубкі на святло.

Каваль варухнуў рудымі калматымі брывамі, якія раней у яго заўсёды былі падпаленыя, а цяпер адраслі, бо працы ў кузні не было, і неяк выпрастаўся, ад чаго здаўся яшчэ больш высокім.

— Вось ён які, твой чалавек! — Пачціва схіліўшы галаву, павітаўся выразна, па-руску: — Здравствуйте. Я тутэйшы каваль. Зайшоў пазнаёміцца.

Лялькевіч з цёплай усмешкай на твары працягнуў руку, як добраму знаёмаму:

— Добры вечар, Аляксей Сафронавіч.

Каваль кінуў на Сашу вясёлы позірк, імкліва схапіў руку камісара, моцна сціснуў, накрыў шырокай, як лапата, далоняй левай рукі і радасна пачаў трэсці.

— Рады, дарагі Уладзімір Іванавіч, што бачу вас паздаравелым. Дзякуй табе, Хведараўна, што выхадзіла чалавека.

Саша ад здзіўлення разявіла рот.

Павітаўшыся, яны адразу схаваліся за грубку, каб не было відаць з вокнаў, хоць заглянуць з вуліцы ў хату ніхто не мог: шыбы пакрыліся тоўстым пластом намаразі. Аднак лішняя асцярожнасць не шкодзіла. Саша ўсё яшчэ нічога не разумела.

Лялькевіч, злавіўшы яе неўразуменны позірк, растлумачыў:

— Гэта той, Аляксандра Фёдараўна, каго хлопцы завуць Старым.

— Мне варта было б пакрыўдзіцца! Які я стары! — пажартаваў Аляксей Сафронавіч і, панізіўшы голас амаль да шэпту, пачаў дакладваць аб справе: — Значыцца, так, Уладзімір Іванавіч, каб не траціць часу... У Гомелі я быў, праўда, на завод не трапіў — немец арганізаваў там рамонт танкаў, паставіў варту... Але [illegible] людзей сяго-таго знайшоў... Мала сапраўдных людзей асталося — заводы эвакуіраваны, рабочы клас выехаў у тыл. Але чалавек трох знайшоў. Надзейныя людзі — дружбакі мае колішнія, з якімі я працаваў некалі. Арганізацыі ў іх пакуль што няма, але цяпер будзе, калі я ўсё ім расказаў... Людзі рвуцца помсціць. Галоўнае — зрабіць пачатак, каб было ядро. За гэтых людзей ручаюся.

— Добра. Няхай арганізуюцца вашы сябры. Будзеце трымаць з імі сувязь... Пасля звяжам іх непасрэдна з атрадам. З такіх груп мы павінны стварыць у горадзе моцную баявую арганізацыю. Такое ўказанне партыі. Добра, Аляксей Сафронавіч. Дзякую за ўсё.

— Няма завошта, Уладзімір Іванавіч. Усе служым працоўнаму народу.

Саша стаяла каля прыпечка, як на варце, падкладала ў агонь трэскі, здымала з варыва пену і слухала іх ціхую размову. У душы яе расло нейкае ўрачыстае захапленне: відаць, ад таго, што разам з імі такі чалавек, як каваль, і, напэўна, яшчэ ад таго, што камісар даверыў ёй тое, што

хлопцы чамусьці хавалі, даверыў нават больш — надзвычай сакрэтныя планы. Увогуле з яго прыходам Саша адразу зразумела, сэрцам адчула, які велізарны размах набывае барацьба супраць ворага, як шырока яна разгортваецца. І гэта, нягледзячы на ўсе яе асабістыя перажыванні, радасна акрыляла, быццам яна паднялася высока-высока і ўбачыла шырокія прасторы, на якіх разгараўся агонь змагання. Мацнела яе вера ў блізкую перамогу. Вера гартавала волю, надавала мужнасці. Цяпер кожны факт, які сведчыў пра разгортванне барацьбы, прыносіў ёй радасць. «Вы хацелі скарыць нас, паставіць на калені, дык вось вам — атрымлівайце!» — з нянавісцю думала яна пра акупантаў. Каваль-падпольшчык чамусьці ўзрадаваў яе.

Ён сядзеў на ляжанцы і, нахіліўшыся да Лялькевіча, які прымасціўся ніжэй, на ўслончыку, глуха бубніў (гаварыць шэптам ён не ўмеў):

— Думалі мы з хлопцамі, як вы раілі, каго яшчэ можна ўцягнуць у арганізацыю. Безумоўна, людзей добрых многа. Але я за асцярогу. Покуль што прапаную двух хлопцаў: Паўліка Катуха і Лёню Давыдзенку. Аляксандра ведае іх,— кіўнуў ён на Сашу.— За гэтых хлопцаў я ручаюся. Рыбаловы!

Лялькевіч прыглушана засмяяўся:

— Рыбалоў — найвышэйшая атэстацыя?

— Рыбаловы — мае лепшыя сябры. А сяброў сваіх я ведаю, Уладзімір Іванавіч.

— Добра. Прымайце. Але дамовімся так: пра тое, што ў арганізацыі Аляксандра Фёдараўна і Даніла, няхай новыя не ведаюць... Пакуль што.

— Данілу схаваць нельга.

— Трэба, пакуль не праверым людзей у баі. А што да Аляксандры Фёдараўны, то пра яе наогул, думаю, не трэба гаварыць усім членам арганізацыі.

— Значыцца, мне наканавана ўвесь час ад сваіх хавацца? — спытала Саша як бы ў жарт, але з прыкметнай ноткай крыўды ў голасе.

— Ад немцаў, Аляксандра,— прагудзеў у адказ каваль.— Ад паліцаяў. А свае будуць ведаць. Не цяпер — пасля даведаюцца. Берагчы цябе мы будзем, як вока... Не забывай, што

ў тваіх руках — не адно тваё жыццё... І без таго ты робіш вялікую справу.

— Што я там раблю!

— Не кажы! Выратаваць, вылечыць, схаваць аднаго радавога савецкага байца — гэта ўжо, брат ты мой, подзвіг. А Уладзімір Іванавіч...

Саша ўбачыла, як Лялькевіч сціснуў калена каваля, і той змоўк.

Яны прыслухаліся да крокаў на вуліцы, да шчадровак.

— Не асуджаеш, Уладзімір Іванавіч, маю выдумку з шчадраваннем? — спытаў каваль пасля хвіліны маўчання і, не чакаючы адказу, растлумачыў: — Хацелася мне хлопцаў разам сабраць так, каб гэтыя ганчакі не западозрылі ні ў чым. Яшчэ тыдзень назад пайшоў я да Гуся, спытаў дазволу, ці можна аднавіць старыя народныя традыцыі. Ты думаеш, пень гэты сам вырашыў? Трасца! Паехаў да гаспадароў сваіх — немцаў... А там, відаць, хітры гад сядзіць: даў загад — аднаўляць і падтрымліваць усё, што звязана з рэлігіяй, з верай. Паліцаі гэта разнеслі па сяле. І ведаеш, які вынік? Вырашылі нашы бабулі адкрыць сваю царкву. А папа няма. Вось і з'явілася ўчора дэлегацыя да мяне — запрашаюць заняць гэтую высокую пасаду. Хо-о-о! — Каваль забыўся і рагатаў — быццам сыпануў бульбу аб падлогу.

Лялькевіч ляпнуў яго па плячы:

— Цішэй вы, гром пятроўскі! Што ж вы адказалі?

— Прыняў дэлегацыю з павагай і... дыпламатычна адмовіўся. Не маю права, кажу, я — расстрыга.

— І цяпер нельга паправіць?

— Што?

— Каб стаць вам папом?

Каваль вытрашчыў на Лялькевіча вочы:

— Чакай! Вы лічыце, што гэта нам патрэбна?

— Думаю, што не зашкодзіла б. Нашым людзям было б лягчэй прыходзіць да папа, а яму — ездзіць у горад, у суседнія вёскі. І наогул сустракацца з рознымі людзьмі, «паладзіць» з уладай. Не карысна хіба?

Каваль ляпнуў сябе далоняй па лбе:

— Ах ты, ліха маё! Як жа гэта я, такі мудрэц і хітрэц, не дадумаўся! Вось праўду кажуць, век жыві — век вучыся.

Пабаяўся, што рыза мая не спадабаецца хлопцам. Яны любяць каваля і рыбалова... Добра, Уладзімір Іванавіч, паспрабую пачаць перагаворы...

Калі абмеркавалі падпольныя справы, каваль раптам прапанаваў:

— Давай спяём, Уладзімір Іванавіч, што-небудзь.

— Што вы! — Камісар нават разгубіўся ад такой нечаканай прапановы.— Пачуюць. Што падумаюць? У такіх умовах. Ды яшчэ перад святам.

— А мы так, каб ніхто не пачуў.— Каваль пасунуўся на ляжанцы да глухой сцяны і, не чакаючы згоды, ціха заспяваў:

За Сибіром сонце сходить...
Хлопці, не зівайте...

Лялькевіч не вытрымаў, падцягнуў:

Ви на мене, Кармелюка,
Всю надію майте!..

Так, напаўголаса, праспявалі куплеты два.

Аляксей Сафронавіч уздыхнуў, пахваліў, як той казак:

— Добра, сынку! Эх, ірвануць бы нам з табой на поўны голас! — І, нахіліўшыся да Лялькевіча, заспяваў яшчэ цішэй, без слоў, «Свяшчэнную вайну».

Сашу быццам ударыла токам — скалануўся, уздрыгнуў кожны нерв.

Гэтую песню яна ўпершыню пачула некалькі дзён назад: тут жа, у гэтым закутку, у такі ж вячэрні час, гэтак жа амаль шэптам Лялькевіч навучаў Даніка спяваць яе. І вось ужо спявае каваль. Не, не адзін ён! Спявае камісар — Саша чуе яго голас. І сама яна таксама спявае, суровая мелодыя гучыць у душы, у галаве, запаўняе ўсю яе істоту. Яна падышла да спевакоў, засланіла іх ад акна. Але песня змоўкла.

Аляксей Сафронавіч гнеўна прашаптаў:

Гнилой фашистской нечисти
Загоним пулю в лоб,—

і саскочыў з ляжанкі.

— Пара мне ісці. Хлопцы чакаюць. Каб яны часам не выбрыкнулі чаго-небудзь без мяне.

— Хлопцаў беражыце, Аляксей Сафронавіч,— з бацькоўскім клопатам папрасіў Лялькевіч.

* * *

Аднойчы Данік і Цішка ўскочылі ў хату вельмі ўзрушаныя. Данік цягнуў сябра амаль сілком. Той асабліва не ўпіраўся, але нагадваў раз'юшанага звярка: маленькі, у расшпіленым кажушку, у вялікіх стаптаных валёнках, ён выглядаў нейкім дзікаватым, натапыраным.

Лялькевіч і Саша насцеражыліся. Хлопцы ніколі гэтак не ўрываліся, яны наогул рэдка хадзілі разам, каб асабліва не выяўляць сваю дружбу, і ставіліся адзін да аднаго гэтак жа, як кожны з іх ставіўся да любога іншага свайго равесніка-аднавяскоўца.

Яны спыніліся ў парозе. Данік, задыханы, расчырванелы, кінуў позіркам, ці няма старонняга ў хаце, і адразу да Лялькевіча:

— Таварыш камісар! Скажыце вы яму... Вось жа дурань!

Цішка стаяў збялелы, пасінелыя губы яго перасмыкаліся як ад болю, а вочы гарэлі такім гневам, што Сашы стала страшна.

— Усё адно я застрэлю гэтага гада! Усё адно я заб'ю яго... Усё адно,— прашаптаў ён, выставіўшы сціснутыя кулакі.

— Не так трэба забіваць! — прыкрыкнуў Даніла.— Падпольшчык!

Лялькевіч зразумеў, што здарылася нешта вельмі сур'ёзнае, і па-камандзірску паказаў рукой у закутак паміж печчу і грубкай, які стаў месцам, дзе вяліся ўсе падпольныя размовы.

Хлопцы зайшлі туды, прытуліліся плячамі да сцяны.

Лялькевіч стаў насупраць іх, тварам у твар, шэптам загадаў:

— Дакладвай, Данік.

— Паліцаі арыштавалі Ганну з Рэпак. Нехта зноў данёс, што ў яе партызан начаваў... Вялі яе, а мы за крамай стаялі,

сачылі. А тут дачка яе, Манька, гадкоў шэсць ёй, бяжыць следам, хапаецца за кажух, крычыць: «Мама! Мамачка...»

Данік змоўк і як бы праглынуў нешта. А ў Цішкі вочы напоўніліся слязамі. Ён сарваў з галавы сваю аўчынную вушанку і закрыў ёю твар.

— Фашыст ён пракляты! Усё адно я яго...

Данік з жарам перабіў Цішку:

— Ты яго! Ты нас праваліў бы, як эсэр які!

— Спакойна! — патрабаваў Лялькевіч.— Па парадку! Што было далей?

— Далей... гад гэты, бандыт Гусеў,— цяпер ужо і Данік ажно скрыгатаў зубамі,— як схопіць малую ды як шыбне ў снег... Быццам гэта не дзіця, не чалавек. Сволач ён! Ну, Цішка і не вытрымаў — за пісталет... Добра, што я ўбачыў... Я не ведаў, што ў яго пісталет... У нас была пастанова: удзень зброі не насіць. Навошта ён носіць, як анархіст які? Добра, што я ўправіўся схапіць яго за руку і вырваць гэтую рэч.— Данік дастаў з кішэні пісталет і працягнуў Лялькевічу.— Добра, што нас ніхто не бачыў, мы адны за крамай стаялі... Самі сябе выдалі б... Разумееш ты?

— Усё адно я заб'ю яго! — з дзіцячай упартасцю цвярдзіў сваё Цішка.

Лялькевіч прысеў на ўслончык.

— Саша, паглядзіце, калі ласка, каб нас ніхто не захапіў знянацку,— папрасіў ён.

Але Саша ўжо стаяла на варце: слухаючы іх размову, не спускала вачэй з акна, праз якое відаць была брамка.

Лялькевіч спытаў Ціхана стрымана, але сурова:

— Што ж гэта ты, герой, загубіць нас усіх захацеў?

— Не мог я, таварыш...— страпянуўся юнак.— Вы стаялі б спакойна, каб пры вас такое?..

— Нервы слабыя? А партызану, падпольшчыку трэба мець моцныя нервы. Вельмі моцныя! Ты ўяўляеш, што мог бы нарабіць твой стрэл? Ты — аднаго Гусева...

— Я ўсіх бы іх, чатырох...

— Дапусцім. А потым?

Ціхан змоўк.

— Ну, а потым? Потым што вы рабілі б?

— Уцяклі б,— няўпэўнена прашаптаў Цішка.

— «Уцяклі»! — перадражніў яго Данік.— Куды б ты ўцёк?

— Сапраўды, куды можна ўцячы па такім снезе? Але дапусцім, што ўцяклі б. Вы маладыя, спрытныя... А мы? Фашысты адразу схапілі б тваю маці, сясцёр, мяне, Сашу. Ты падумаў пра гэта?

Ціхан ніжэй нахіліў галаву.

— Нічога ён не думаў! — дакараў сябра Данік.

— У нашай суровай барацьбе з такім страшным і бязлітасным ворагам самае галоўнае — дысцыпліна. А ты парушыў яе, парушыў пастанову арганізацыі — не насіць зброі. Па сутнасці ты парушыў клятву. Мала таго — у цябе няма вытрымкі. Значыцца, слабая сіла волі. А калі ты трапіш у яшчэ горшыя абставіны? Можам мы, твае сябры, быць упэўненымі, што ты не падвядзеш нас?

— Таварыш камісар!.. Ды я памру, калі трэба!..

— Памерці — самае лёгкае на вайне. Каб мы думалі аб смерці, чаго была б варта наша барацьба! Мы думаем аб жыцці, аб шчаслівай будучыні для сваіх блізкіх, для народа. Зразумейце, гарачыя галовы. Мы не адмаўляемся ад такіх стрэлаў, але цяпер наша асноўная задача — збіраць, згуртоўваць сілы для залпаў, для вялікіх залпаў, якія мы зробім неўзабаве па ворагу. Замест таго каб страляць, калі позна ўжо, трэба было падумаць пра Ганну раней. Чаму мы не ўпільнавалі гэтага дарагога нам чалавека, маці? Чаму мы не папярэдзілі?.. Якія партызаны да яе прыходзілі? З якога атрада? Нам павінна быць соромна, што мы не ведаем. Соромна і балюча...

— Яна не ішла на сувязь,— пачаў апраўдвацца Данік, зразумеўшы, што дакор гэты не аднаму Цішку, але ўсёй арганізацыі.— Мы спрабавалі наладзіць з ёй сувязь яшчэ ўвосень. Сам Стары займаўся. Але яна і яму не паверыла. Яна нікому не верыла. Мы вырашылі, што тады яна выпадкова пякла хлеб партызанам, а потым спалохалася, і больш да яе не падступіцца...

— Слаба, значыцца, мы ведаем, што робіцца ў вёсцы. А мы павінны ведаць усё: чым жыве, што думае кожны чалавек. А ці адна толькі Ганна такая? Перадай, Данік, Старому, каб ён памог схаваць яе дзяцей...

Саша ўздрыгнула, пачуўшы пра дзяцей. Няўжо немцы могуць крануць дзяцей? Так, яны ўсё могуць. Дагэтуль, слухаючы хлопцаў, яна без страху, разважліва думала пра тое, што з арыштам Ганны могуць выплыць на паверхню асеннія здарэнні — уцёкі партызана з калодзежа, смерць Кузьмы. Яна вырашыла сказаць пра сваю асцярогу Уладзіміру Іванавічу, каб ён на ўсякі выпадак меў на ўвазе. Калі ж успомнілі пра дзяцей, яе апанавала тое цяжкае пачуццё, ад якога яна страшэнна пакутавала, бо цяпер ёй здавалася, што толькі адна яна такая баязлівая, а ўсе іншыя страху не ведаюць. Наіўная жанчына! Яна не разумела, што сіла не ў тым, каб зусім не мець гэтага пачуцця (смерці баяцца ўсе), а ў тым, каб умець перамагаць страх і, перамагаючы яго, сумленна выконваць свой абавязак. Яна не хавала свайго пачуцця ад Даніка, Полі, нават ад чырвонаармейцаў і суседзяў, але цяпер — перад Уладзімірам Іванавічам — яна ніколі не выдасць свайго страху. Ніводным словам, ніводным рухам! Таму і пра апаску сваю вырашыла маўчаць. Але сам камісар усё помніў, усё ўлічваў!

— Да здарэння з Кузьмой не дакапаюцца? — спытаўся ён у Даніка.

— Не! — упэўнена адказаў хлопец.— Ніхто ж нічога не ведае. Абы маўчала цётка Хадоска. А яна будзе маўчаць! Яна набожная стала, дзень і ноч моліцца... Хіба толькі Старому можа паспавядацца.

— Асцярожнасць, таварышы, у падпольнай справе — аснова поспеху. Мы павінны ўсё бачыць і ўсё ўлічваць наперад. І берагчы сваіх людзей. А здраднікі... Гусеў гэты і іншыя... нікуды яны ад нас не дзенуцца, не схаваюцца ад народнага суда. Мы пакараем іх...

Ціхан, крыху ўтаймаваны суровасцю і бацькоўскай лагоднасцю Лялькевіча, зноў загарэўся помстай.

— Даручыце мне! Таварыш камісар!

— Ох, рызыкант! Хочаш, каб змянілі п'яных паліцаяў зондэркамандай? Каму ад гэтага стане лягчэй?

— Ніякай рызыкі не будзе! Я падпільную яго дзе-небудзь пад горадам, як ляснічага. Каб і не падумалі на нашу вёску.

— Праўда! — раптам падтрымаў Данік.— Дазвольце нам стукнуць гэтага гада. Няхай ведае, як кідаць дзяцей... піць кроў людскую.

— Як ляснічага, кажаце? А ці шмат гэта дасць цяпер нашай барацьбе? Я хачу, каб вы заўсёды ставілі сабе такое пытанне. І заўсёды помнілі: мы — не забойцы, мы — суддзі. Мы караем ад імя народа. І народ павінен ведаць, хто і завошта пакараны, а галоўнае — ведаць, кім пакараны. Кожны наш стрэл па ворагу павінен узнімаць новых барацьбітоў, папаўняць нашы рады. Я сказаў вам: Гусеву нашай кары не мінуць. Але я катэгарычна забараняю самавольныя анархічныя дзеянні! Я папярэджваю, што надалей буду сурова караць тых, хто парушае дысцыпліну, законы падполля. Майце на ўвазе гэта! Ясна?

— Ясна, Уладзімір Іванавіч,— ціха адказаў Данік.

— Пісталет у цябе, Ціхан, я забіраю, каб ты не нарабіў глупства. І на першы раз папярэджваю.

Юнак цяжка ўздыхнуў: шкада было расставацца з пісталетам, які ён знайшоў яшчэ тады, калі яны з Данікам збіралі зброю на месцы бітвы. Пісталет ужо неаднойчы паслужыў яму як зброя помсты за вялікія крыўды народа.

VIII

Можа, на адну хвіліну заснула Саша ў тую ноч і адразу ўбачыла сон. Бяскрайняе і роўнае-роўнае, без узгорачка, без куста, заснежанае поле. Яна ўзіраецца да болю ў вачах у гэтую белую роўнядзь і... раптам бачыць: па полі ва ўсім белым паўзе чалавек. Яна пазнае Пецю. Ён працягвае да яе рукі, просіць дапамогі, нешта крычыць. Яна хоча закрычаць у адказ і... не можа — няма голасу. Яна бяжыць насустрач, але ўзнімаецца страшэнная віхура. Саша змагаецца з ветрам, выбіваецца з апошніх сіл, але з жудасцю заўважае, што віхура адносіць яе назад, яна не набліжаецца да Пеці, а аддаляецца ад яго. І ён астаецца адзін сярод гэтага страшнага поля.

Саша прачнулася, аблітая халодным потам. Сэрца калацілася так, быццам сапраўды яна толькі што доўга бегла, змагаючыся з віхурай.

За акном шуміць вецер. Таполі ажно звіняць абледзянелым голлем, шоргаюць ім аб страху хаты. На шыбах шархаціць сухі снег.

«Гэта добра, што такая ноч»,— успомніла яна словы Лялькевіча і адразу пачула яго самога: ён піў ваду каля дзвярэй, дзе стаяла вядро. Напіўся і асцярожна, без мыліцы, каб не стукаць, трымаючыся за лаву і за сцяну, пачаў прабірацца да ложка.

«Трэба ставіць яму ваду. Як гэта мы не здагадаліся?» — падумала Саша і шэптам паклікала:

— Уладзімір Іванавіч!

Ён не адказаў, стаіўся недзе на паўдарозе — хацеў схітраваць.

— Уладзімір Іванавіч! Можа, вам нездаровіцца, што вы ўжо двойчы п'яце ваду?

— Не, Саша, я здаровы. Мне проста не спіцца, і я тупаю па хаце.

— А я заснула.

— Вы крычалі ў сне.

— Я сасніла страшны сон. Бачыла Пецю. Ён поўз па полі.

— Вы думалі пра хлопцаў, як будуць яны паўзці да склада, таму вам прыснілася гэта.

Каля стала заскрыпеў услончык — Лялькевіч недзе там сеў.

— А мне, зразумейце, цяжка. Цяжка адчуваць сваю бездапаможнасць. Мне хочацца... мне трэба быць разам з хлопцамі. Яны такія маладыя і нявопытныя!

На ляжанцы ўздыхнула Поля — таксама не спала. Але яна нічога не сказала, таму і яны змоўклі.

...Дні тры назад каваль, які стаў-такі папом, заглянуў да Лялькевіча і сказаў:

— Іванавіч, хлопцы даўно замахваліся на хлебныя склады на станцыі. Немцы да ліха нарабаванага збожжа туды навезлі. Я доўга прыглядаўся і ўсё стрымліваў хлопцаў — небяспечна, не вельмі склады загарацца зімой. А цяпер ёсць магчымасць... Я сёння быў там, на пахаванні стрэлачніка. Магчыма, каб не выстаўляць дадатковы пост, немцы, дурні, падсунулі пад самы склад, на запасную каляю, бензацыстэрну. Адну «хлапушку» пад гэтую цыстэрну — і ўсё да Бога: і

бензін і склад! Дарэчы, падае барометр, гудзяць ногі. Трэба чакаць мяцеліцы. Нам — на руку.

— Вось гэта ўжо будзе залп! Ён будзе далёка чуваць і відаць,— сказаў Лялькевіч.

Дачакаліся дня, калі пайшоў снег, і позна ўвечары хлопцы рушылі на заданне. Пайшло пяць чалавек: Анатоль, Данік, Ціхан, Павел і Лёнік. Але план аперацыі абмяркоўвалі з камісарам толькі Данік і Цішка. Анатоль не прыйшоў з меркаванняў канспірацыі, а новыя члены арганізацыі, як было дамоўлена, нічога не ведалі пра Лялькевіча і Сашу.

Саша ведала ўсе дэталі гэтага плана. І станцыю, якая знаходзілася кіламетраў за дзевяць ад іх вёскі, за лесам, яна добра ведала. Таму яе ўяўленні былі такія яскравыя, быццам раскрыліся сцены хаты, расступіўся лес і яна ўсё бачыць наяве. Вось хлопцы выйшлі з лесу і па глыбокім снезе абходзяць пасёлак. Добра, што ідзе снег і замятае адразу сляды. Вось яны ляглі ў кустах на беразе ручая. Адгэтуль да склада нейкіх метраў трыста. Правяраюць зброю. Далей паўзуць толькі трое — Анатоль, Цішка і Данік, захутаўшыся з галавы да ног у белыя балахоны, пашытыя ёю, Сашай, з тых накрухмаленых, прапахлых нафталінам прасцін, якія набывала яшчэ іх нябожчыца маці ў пасаг дочкам. Каля штабялёў бярвення, што навалены па гэты бок чыгункі, якраз насупраць склада, астаецца Анатоль, узброены нямецкім аўтаматам: у выпадку чаго ён павінен прыкрыць адыход хлопцаў. Далей паўзуць двое — Данік і Цішка. Самае цяжкае — перабрацца цераз пуці. Але яны перабіраюцца. І вось ужо стаіліся за вуглом склада, чакаюць, калі вартавы-немец, які ходзіць вакол склада, наблізіцца да іх. Саша не хоча бачыць, як Данік ударыць яму ў спіну нямецкім кінжальным штыком, а Цішка адразу заткне рот, каб ён не закрычаў. Яна заплюшчвае вочы... і сапраўды прапускае гэты момант. Вось немец ужо ляжыць. Хлопцы падкладваюць пад бензацыстэрну міну і ўжо не паўзуць, а бягуць назад... Тонуць у гурбах снегу, падаюць, зноў падымаюцца... Хутчэй, хлопчыкі! Хутчэй! Каб снег замёў вашы сляды...

Саша разумее, што дарэмна яна ўяўляе ўсё гэта ўжо каторы раз за ноч. Калі ўсё добра, склады даўно гараць, а хлопцы

вяртаюцца назад, падыходзяць дадому. Лепш заснуць, каб так не пераджываць, каб хутчэй дачакацца брата.

І раптам — ціхі стук у шыбу з двара. Гэта — ён, Данік. Але стук такі трывожны, такі нецярплівы, што ў Сашы страшэнна закалацілася сэрца: гора. Яна ўміг саскочыла з печы. Гэтак жа хутка падхапіліся Поля і Лялькевіч.

Данік уваліўся белым прывідам, страшэнна задыханы, быццам ад самай станцыі бег не спыняючыся.

— Што здарылася? — спытаў камісар на парозе, схапіўшы хлопца за рукі.

— Ц-ці-шку р-ран-і-лі,— ледзь прамовіў ён і, задыхаючыся, глытаючы словы, пачаў расказваць: — Мы... як п-па плану... п-пад-п-паўзлі... А вартавога няма... Ляжым — няма... Стаім — нічога не чуваць... Мы падклалі міну — і б-бягом... А ён, відаць, спаў, зараза, у зацішку. Нам н-не трэба было бегчы. Мы — дурні. Ён пачуў, як мы пабеглі... прачнуўся. Убачыў, відаць, сляды — і ракету ўгору... Тут і пачалося: і ад моста, і ад станцыі. З кулямётаў як ударылі... Мы да штабялёў ужо дабеглі, дзе Толя чакаў, і тут Цішка войкнуў і ўпаў... Мы яго ў лес прынеслі. А што нам далей рабіць, Уладзімір Іванавіч? Памрэ Цішка,— зусім па-дзіцячы ўсхліпнуў знясілены юнак.

Лялькевіч ласкава абняў яго за плечы:

— Без панікі, друг мой. Будзем ратаваць Цішку. Зробім усё, каб выратаваць яго.

— А склад гарыць, Уладзімір Іванавіч! — ужо больш бадзёра прамовіў Данік.— Мы толькі за пасёлак зайшлі, а яно як бухне! І як шугане! І цяпер яшчэ гарыць! З прасекі відно было зарава, калі завіруха трохі спала. А потым зноў закруціла...

— Куды яго раніла? — спытала Саша, адразу зразумеўшы, што нікому іншаму, а ёй трэба як мага хутчэй бегчы туды. Гэтак жа, як тады, калі яна працавала фельчарам і калі яе вось так уначы выклікалі да хворага, яна вобмацкам пачала шукаць вопратку, на хаду ўспамінаючы, дзе што ляжыць.

Лялькевіч засвяціў газнічку.

— Але. Захапіце ўсё, што ў нас ёсць,— сказаў ён, убачыўшы, як імкліва яна збіраецца.

Саша камандавала, немнагаслоўна, ціха, але рашуча, патрабавальна, як добры хірург у часе аперацыі:

— Поля! Малако — у бутэльку! І вады! Дастаньце вату, у вас пад матрацам,— гэта Лялькевічу.— Данік! На грубцы шпрыц! Ды варушыцеся вы хутчэй! Божа мой! Якія маруды!

Лялькевіч таксама пачаў апранацца.

— А вы куды? — спытала Саша.

— Я — да Старога. Трэба, каб раніцой ён паехаў на кані... У папа знойдзецца прычына паехаць... Ён забярэ Ціхана і завязе за раку, у Рудню... Туды прыйдзе з атрада ўрач. Зробіць аперацыю.

— Не трэба вам хадзіць! — ціха, але цвёрда сказала Саша.— Няможна!

Лялькевіча і здзівіла і ўзрадавала гэтая ўладнасць яе. Маўклівая ў апошні час і як бы трохі інертная і абыякавая, яна ў напружаную, адказную хвіліну выяўляла ўсю сваю душэўную сілу, мудрасць і асцярожнасць. Ён гэта зразумеў і не стаў пярэчыць. Але хто скажа кавалю? Ён падумаў — яна адказала:

— Мы самі скажам! Усё адно трэба ісці ў абход, па Аднабочцы. Не пойдзем жа мы паўз школу, дзе паліцаі. Данік забяжыць і скажа.

— Добра,— згадзіўся Лялькевіч, скідаючы кажух і звяртаючыся да Даніка: — Скажаш Аляксею Сафронавічу: завезці ў Рудню, да старасты Мірона. Гэта наш чалавек...

Саша была ўжо каля дзвярэй, яна выходзіла імкліва, гэтак жа, як і збіралася, каб не траціць дарэмна ніводнай хвіліны.

Лялькевіч пажадаў:

— Шчасліва вам.

Яна спынілася, быццам штось забыла. Потым гэтак жа імкліва вярнулася назад, ускочыла на ляжанку і пацалавала на печы дачку. Саскочыўшы на падлогу, пагасіла газніцу. На фоне акна Лялькевіч убачыў, як разгубленая, спалоханая Поля хрысціла ўслед брата і сястру.

На двары гуляла завіруха. Толькі адчынілі дзверы — у вочы сыпанула сухім снегам. Вецер звінеў галінамі абмёрзлага клёна, скуголіў і свістаў у шчылінах паркана, у дзіравай страсе хлява. Недзе ў суседа назойліва і непрыемна рыпелі вароты. За шашой глуха стагнаў бор.

З маленства Саша слухала і любіла шум блізкага лесу, у бязлесным Заполлі яна сумавала па ім, але цяпер, у глухую

ваенную ноч, шум гэты здаўся ёй цяжкім стогнам. Недзе там, сярод лесу, ляжыць ранены баец, таварыш па барацьбе. Хутчэй жа да яго!..

Данік схапіў яе за плечы каля брамкі:

— Куды ты?

Яна не разумела.

— Ісці па вуліцы? Што ты! Ты ведаеш, як неспакойна цяпер спяць людзі? Хто-небудзь убачыць. Хадзем гародамі. На,— і ён працягнуў ёй белы настольнік, які невядома калі захапіў з дому,— накрыйся!

Вецер біў у твар, зрываў настольнік, напінаючы яго, як ветразь. Ногі глыбока правальваліся ў снезе, і Саша спатыкалася, падала, перапаўзала гурбы каля агароджаў на карачках, не адчуваючы, як снег набіваецца ў рукавы. Яна задыхалася: сэрца распірала грудзі, і ўдары яго, ліхаманкава частыя, балючыя, адчуваліся ва ўсім целе: у скронях, у шыі, у руках.

Данік спыняўся, чакаў яе і ўмольна прасіў:

— Хутчэй, Саша, хутчэй!

Яна не мела сілы вымавіць слова ў адказ. Яе апаноўваў страх, што не здолее дайсці і памагчы Цішку. Чаму яна такая слабая, знясіленая? Вунь Данік ходзіць усю ноч: ішоў да станцыі, поўз да складоў, нёс па снезе раненага таварыша, бег дадому і цяпер ідзе без натугі, снег і вецер яму не перашкода... Няўжо ён намнога дужэйшы за яе? Не, яна таксама дойдзе! Дапаўзе! Яна павінна ратаваць Цішку. Не трэба думаць пра сваю слабасць! Трэба думаць пра яго, пра Цішку.

«Ці добра зачынены чамаданчык? Каб не адчыніўся, не рассыпаліся медыкаменты! Сказаць Даніку, каб асцярожна нёс.— Яна памацала пад ватоўкай бутэльку з малаком.— Што гэта? Няма ветру?»

Яна падняла галаву і ўбачыла чорную сцяну будыніны.

— Пачакай тут,— сказаў Данік, аддаючы ёй чамаданчык, аб якім яна толькі што турбавалася.— Я сам забягу да Старога.

Саша схавалася ў зацішку, перавяла дыханне. Сэрца пачало біцца раўней, і яна, супакойваючыся, падумала: вельмі дарэчы ім, падпольшчыкам, што немцы і паліцаі знішчылі ў вёсцы ўсіх сабак; да вайны наўрад ці прайшоў бы гарода-

мі гэтак непрыкметна. І яшчэ падумала, што дарэмна Данік захутваў яе ў настольнік: снег падае зверху, узнімаецца ветрам знізу і ў снежнай каламуці не відно суседняй хаты, не толькі чалавека. Вёска спіць. Ніводнага гуку, акрамя свісту ветру і шуму лесу. Цяпер да лесу — рукой падаць; каваль жыве крайні на вуліцы, якая называецца Аднабочкай, хоць даўно ўжо забудавана ў два рады.

Данік хутка вярнуўся. Забіраючы ў Сашы чамаданчык, ён уздыхнуў:

— Эх, Цішка, Цішка! — і папрасіў:— Бяжым, Саша! Не адставай!..

Цяпер яны сапраўды беглі, і гэта было не так цяжка, як ісці па гародах, бо адразу ж ад хаты каваля яны выйшлі на дарогу, па якой вяскоўцы выязджалі на шашу, абмінаючы школу. Перайшоўшы шашу, яны апынуліся ў вялікай пушчы і па ўезджанай дарозе, па якой немцы вывозілі лес, рушылі ўглыб.

Тут, пад стогадовымі соснамі, пад волатамі-дубамі, было зусім зацішна. Толькі вяршаліны дрэў бушавалі: кідаліся адна на адну, біліся, драпаліся голлем, натужліва рыпелі, цяжка стагналі, страсалі на дол шапкі снегу.

Данік час ад часу спыняўся, прыслухоўваўся. Саша не разумела, што ён слухае і што ўвогуле можна пачуць у гэтым бясконцым шуме, ды калі яшчэ да таго ж ад бегу гудзе і стукае ў галаве. Але ні пра што пытацца ёй не хацелася. Яны ішлі моўчкі. Толькі адзін раз брат сказаў:

— Хаця б снег не перастаў... Каб слядоў не было. Раніцой яны могуць пачаць шукаць...

Ускрай вялікай лесасекі, дзе амаль гэтак жа, як у полі, гулялі снежныя смерчы, іх сустрэў вартавы — Павел (самы малады з падпольшчыкаў, Саша нават мала ведала яго).

— Ціха? — спытаў вартавога Данік, а таму, відаць, здалося — «Ціхан», і ён адказаў:

— Дрэнна яму.

Гэта як бы падагнала іх: яны пабеглі цераз заваленую ламаччам лесасеку, спатыкаючыся. Саша не прыкмеціла, калі побач з ёй апынуўся Анатоль. Ён схапіў яе за руку, дрыжачым голасам сказаў:

— Хутчэй, Саша. Сюды,— і павёў за сабой.

У канцы лесасекі, за вялікай кучай ламачча, хлопцы з сасновага галля змайстравалі нешта накшталт маленькага будана. Саша пралезла туды следам за Анатолем. Ён пстрыкнуў запальнічкай, падпаліў сухую трэску, і яна ўбачыла твар раненага: бледны, здрабнелы і ад гэтага зусім дзіцячы, з засмяглымі вуснамі і па-дзявочы доўгімі і белымі ад інею вейкамі. Дыхаў Цішка цяжка, перарывіста, з хрыпам і бульканнем. Мабыць, рэагуючы на святло, на нейкі міг ён расплюшчыў вочы і гучна сказаў:

— Хлопцы... гарыць!..

Анатоль перадаў лучыну Даніку і пачаў памагаць Сашы. Асцярожна расхінуў ватоўкі, якімі Цішка быў накрыты, развязаў бінты — стужкі падранай прасціны, лёгка, як малога, прыпадняў яго на руках.

Куля трапіла ў спіну, прабіла лёгкае. Праз маленькую чорную шчылінку з бульканнем вырывалася паветра, пырскаючы кроплямі крыві. А ўвогуле крыві было мала...

Саша за сваю практыку бачыла нямнога цяжкіх раненняў, аднак адразу зразумела, што гэтая рана — смяротэльная, што толькі неадкладная аперацыя ў добрых клінічных умовах, магчыма, магла б выратаваць жыццё Цішку. Балюча, да млоснасці балюча і крыўдна стала ёй, што яна нічым не здолее памагчы гэтаму хлопчыку і мужнаму герою. Няўпэўненымі рукамі апрацавала яна чорную ранку, з дапамогай Анатоля старанна забінтавала.

Свецячы ім лучынай, Данік спытаў:

— Ну што, Саша?

Яна не адказала — не магла, бо душылі слёзы. Яна зрабіла ўкол, каб падтрымаць яго сэрца, і ўліла ў рот глыток малака, бутэльку з якім грэла каля сваіх грудзей.

Цішка праглынуў малако і ціха папрасіў яшчэ:

— Піць.

Гэтае свядомае кароткае слова ўсцешыла хлопцаў, асабліва Даніка і перапалоханага, маўклівага і непрыкметнага навічка — Лёню. Ім здалося, што Цішка пачуў сябе лепш. Але Саша ведала, што гэта не так. Яна сядзела побач і трымала пад кажушком яго гарачую руку. Што яна магла зрабіць яшчэ? Як памагчы? Асталося толькі адно — сачыць за пульсам. Сэрца яго, маленькае хлапечае сэрца, яшчэ жыло, зма-

галася. Але якія няроўныя яго ўдары! То яно робіць некалькі моцных штуршкоў, то Саша раптам зусім губляе пульс. Але аб тым, што арганізм змагаецца, сведчыць дыханне, гэткае ж няроўнае, з шумным хрыпам. Колькі ён можа гэтак пратрымацца? Каторая цяпер гадзіна? Калі ж нарэшце прыедзе дзядзька Аляксей? Чаму ён не едзе? Трэба спытаць у Даніка. Але гаварыць чамусьці страшна, здаецца, што калі яна загаворыць, то згубіць яго пульс, страціць адчуванне яго жыцця. Побач з ёй нехта сядзеў у будане і моцна дрыжаў; яна не заўважыла, што хлопцы, увогуле апранутыя на заданне лёгка, знялі сваю верхнюю апратку, каб накрыць раненага таварыша. Толькі вартавы быў у ватоўцы. Хлопцы грэліся тут, у будане. Саша чула, як яны вылазілі, шапталіся за буданом.

Нехта зноў спытаў знадворку:

— Як ён, Саша?

Яна зноў не адказала. Што можна адказаць? Як страшна шуміць лес! Здаецца, ніколі ў жыцці яна не чула такога шуму. Як сціскаецца сэрца! Але хіба мае права яна звяртаць увагу на боль свайго сэрца? Боль там — у яго сэрцы, у яго грудзях. Вось ён ірвануўся, застагнаў, пачаў трызніць:

— Хлопцы!.. Хлопцы! Мы ім пакажам... Гісторыю я паўтарыў, Іван Паўлавіч... Нічога яны не ведаюць... Анютка! Згані курэй! Ух, як душна... Хлопцы, пакупаемся... Не, не...— Ён зноў застагнаў, скрыгатнуў зубамі і сказаў злосна: — Усё адно я заб'ю гэтага гада... заб'ю... Фашыст пракляты!..

Саша пяшчотна гладзіла яго руку. Непрыкметна для самой сябе яна пачала супакойваць яго ўголас:

— Супакойся, Цішка, родны мой. Патрывай хвілінку. Зараз прыедзе дзядзька Аляксей. Ён павязе цябе за раку. Партызанскі ўрач зробіць аперацыю, і ты будзеш здаровы. І гэтаму гаду мы адпомсцім. За слёзы Ганніных дзяцей. За нашы слёзы. Ляжы спакойна, любы мой, табе няможна кідацца... Ляжы!..

Яна не думала пра тое, што ў праўду гэтых слоў сама не верыць і што да Цішкі яны не даходзяць. Яна казала іх гэтак жа, як сваёй малой дачцэ, калі насіла яе, хворую, на руках па хаце. Змаўкаў ранены — і яна змаўкала таксама, уважліва,

як належыць медыку, слухала пульс, дыханне, давала піць. Пачынаў ён трызніць — і яна зноў гаварыла ласкавыя, наіўныя словы, ператвараючыся ў жанчыну, у маці, якой вельмі балюча за пакуты дзіцяці (а Цішка ў гэты момант быў у яе ўяўленні дзіцем), несвядома жадаючы словамі прыглушыць свой уласны боль.

Яна не адчувала, колькі прайшло часу, здавалася, што вельмі многа, хоць у сапраўднасці — не больш за гадзіну.

Пасля працяглага супакою Цішка ціха паклікаў:

— Данік!

Саша нахілілася да яго твару:

— Што, Цішка, што, родны? Што ты хочаш сказаць?

Ён як бы прыслухаўся, стаіў дыханне, а потым, быццам вельмі спалохаўшыся, ірвануўся і голасам, які, відаць, ніхто з іх, жывых, ніколі не забудзе, паклікаў на дапамогу:

— Ма-ма! Мама!

І сцішыўся. Саша адчула, як мёртва павісла і адразу пахаладзела яго рука, і зразумела з нейкім дзіўным прафесійным спакоем у гэты момант, што наступіў канец яго пакутам. Яна застыла ў жалобным маўчанні, ні словам, ні рухам не парушаючы святой хвіліны развітання. Потым адкінула апратку, якой ён быў накрыты, павярнула цела на спіну (ён ляжаў на правым баку) і склала яго рукі на грудзях.

Пачуўшы ў цемры, што яна нешта робіць, Данік ледзь чутным шэптам спытаў:

— Што, Саша?

У адказ яна голасна заплакала, слёзы, што падкаціліся да горла пасля таго, як ён паклікаў: «Мама!», вырваліся цяпер, аблягчаючы душу.

Анатоль, зразумеўшы, што здарылася, па-мужчынску ўсхліпнуў і адкінуў сценку будана.

Саша здзівілася, што так светла. Праз слёзы яна ўбачыла твар нябожчыка і нават тое, як на яго чорныя, чамусьці нахмураныя бровы садзяцца сняжынкі.

Яна выцерла хусткай твар, паднялася і стала побач з Анатолем. З другога боку сталі Данік і Лёня. Так яны стаялі хвілін колькі, як у ганаровай варце, маўкліва, пазнаўшыя цяжкае гора страты баявога друга, яшчэ ясней усвядоміўшы, на які суровы шлях яны сталі, але не пакораныя, не

разгубленыя. Наадварот, у сэрцах іх з новай сілай разгараўся агонь нянавісці да ворага.

Анатоль першы зрушыў з месца і, нахіліўшыся, накрыў цела прасцінай, што была за маскхалат.

— Што будзем рабіць, таварышы? — спытаў ён.

Парыў ветру закруціў вакол іх смерч снегу, прадоўжыў паўзу ў гэтай кароткай нарадзе.

— Трэба матцы сказаць,— нясмела прапанаваў Лёня.

— Што ты! — адразу запярэчыў Данік.

— Маці? — Анатоль як бы задумаўся.— Маці не вытрывае такога гора. У вёсцы даведаюцца, што Цішка загінуў... Загінуў у тую ноч, калі на станцыі згарэлі склады. Не, маці нельга казаць! — цвёрда скончыў ён сваё разважанне і дадаў сумна: — Няхай яна даруе нам. Мы пакажам ёй магілу пасля перамогі. А колькі матак ніколі не ўзнаюць, дзе магілы іх сыноў! Будзем хаваць Ціхана тут!

— Дзе? — Мабыць, Лёня па сваёй прастаце хацеў спытаць: «Як будзем хаваць?»

— Тут! У нашым лесе,— адказаў за Анатоля Данік, крыху ўзлаваны наіўнасцю навічка.

— А чым выкапаць магілу? — спытала Саша.

Данік не падумаў пра гэта і цяпер сумеўся.

— Я пайду да лесніка. Скажу, што ад партызан. І папярэджу... Будзе маўчаць. Пасля смерці ляснічага яны навучыліся маўчаць. Не пікне. Глядзіце тут пільна, я мігам злётаю.— І Анатоль, не трацячы часу, пабег.

— Пайду змяню Паўліка,— сказаў Данік, перадаючы Лёню пісталет.— Глядзі з гэтага боку. На світанні яны могуць пусціць па нашых слядах сабак. Майце на ўвазе,— папярэдзіў ён так, быццам перад ім быў вялікі атрад, якім ён камандаваў,— калі што — будзем біцца да апошняга патрона. Да апошняга!

А патронаў гэтых было ў іх не густа, ды і зброі — адзін нямецкі аўтамат і два пісталеты.

— І не здавацца жывымі!

Саша ўздрыгнула ад братавых слоў і мімаволі глянула ў неба: ці падае снег? Няхай бы засыпаў усе сляды! Снег ішоў па-ранейшаму, але вецер сціхаў, і лес шумеў неяк па-новаму, больш спакойна і мірна. Данік, пэўна, злавіў гэты яе рух, бо падышоў і ціха спытаў:

— Можа, табе пайсці?

— Куды?

— Дадому. Пакуль ноч.

— Не. Я астануся з вамі! — рашуча адказала Саша.

Данік пастаяў, падумаў і нічога больш не сказаў. Ідучы на варту, прыпыніўся каля нябожчыка, цяжка ўздыхнуў:

— Эх, Цішка, Цішка!

Саша ў адзіноце села на пень. Прыслухалася — што ў яе душы? Не было ні страху, ні таго вострага болю і жалю, якія яна адчула, убачыўшы маленькую чорную ранку на спіне таго, каго ўжо няма. Цяпер душу запаўняў жалобны смутак. Але гэта быў смутак не па адным Ціхану. Яна падумала: колькі вось такіх маладых, як ён, што толькі пачалі жыццё і яшчэ не ўведалі сапраўднага чалавечага шчасця, ляжаць цяпер на полі вайны, і снег засыпае іх целы. Каля многіх няма нават сяброў. Можа, і Пеця... Не, не, Пеця жывы, сэрца яе чуе, што ён жывы, што ён думае пра яе і сваю маленькую дачушку. «Родны мой, любы мой! Калі мы атрымаем ад цябе вестачку? Калі пачуем твой голас?»

Прыйшоў Павел. Спыніўся перад целам друга, і Саша бачыла, як уздрыгваюць яго плечы ад нямога плачу. Пасля ён сеў побач з ёй і пачаў гаварыць — маўчаць было цяжка:

— На станцыю ішлі — ён такі вясёлы быў. Усё жартаваў. Расказваў, як ён у Бабурыхі яблыкі краў. «Сяджу, кажа, на яблыні, зрываю лепшыя яблыкі, кладу за пазуху, а яна, старая ведзьма, як з-пад зямлі і ўжо з крапівой. «Злазь, кажа, чортаў сын, буду пякучкай хвастаць». А ён, Цішка, у адказ: «Чакай, бабуля, абтрушу ўсю яблыню — тады злезу, каб было за што кару прымаць». І пачынае трусіць. «Не трусі!» — крычыць яна. «Хвастаць не будзеш?» — «Не буду, толькі не трусі».— «Маці не скажаш?» — «Скажу!» — «Ах, скажаш! Дык вось табе!» І на старую — град яблык. «Не скажу, не скажу, толькі злазь хутчэй!» Дамовіліся, што яна адыдзе да хлява, тады ён злезе... Маці ўсё-такі яна сказала, парушыла ўмову. «І маці, кажа, гарачых мне ўсыпала!.. Яна і цяпер яшчэ не саромеецца часам ручніком ці чым іншым нада мной памахаць». Хлопцы смяюцца: «Каб яна, маці твая, ведала, каго б'е. Перад табой усе здраднікі дрыжаць, спаць спакойна не могуць...» — Павел схамянуўся, што

расказвае недарэчы, што ўжо няма паміж іх вясёлага Цішкі, і прыціх.— Які чалавек быў!

— Што мы скажам маці? — уголас падумала Саша. Цяпер гэтая думка выклікала не менш пакутлівы боль. Павел не адказаў. Саша шэптам паўтарыла яго словы: — Які чалавек быў!

Далей сядзелі моўчкі, кожны са сваімі думкамі.

Падышоў Лёня, які з пісталетам абыходзіў лесасеку, сказаў:

— З таго краю дзялянкі і цяпер яшчэ відно зарыва. Здорава гарыць!

— Каб не сціхла завіруха,— устрывожана сказаў Павел і пайшоў на лесасеку.

Вярнуўся Анатоль, прынёс рыдлёўку, лом і сякеру. Пачалі капаць магілу. Дзяўблі ломам, секлі мёрзлую зямлю сякерай. Саша памагала рукамі — выграбала камякі зямлі, ірвала дробныя карэнні, да крыві абдзіраючы пальцы. Але тады яна не адчувала гэтага. Месца трапіла пясчанае, пад снегам і пластом ігліцы грунт прамёрз неглыбока, і да світання магіла была гатова. На дно накідалі сасновых галінак, мяккіх і духмяных. Потым, па прыкладу Анатоля, усе апранулі кажушкі і ватоўкі, завязалі рамяні — у каго быў, прывялі сябе ў належны выгляд і, зняўшы шапкі, сталі ў апошнюю ганаровую варту. Стаялі доўга, ахопленыя адвечным жаданнем жывых — падоўжыць хвіліны апошняга развітання з блізкім чалавекам.

— Світае,— сказаў Анатоль, і ўсе заспяшаліся.

Палажылі Ціхана на прасціну, паднеслі да магілы. Анатоль ускочыў у яму, прыняў лёгкае цела друга на рукі, асцярожна паклаў на вечную пасцелю. Данік падаў Анатолю руку, ён вылез і дрыжачым голасам сказаў:

— Бывай, наш Цішка, наш дарагі таварыш... Ты загінуў як герой, як камсамолец! За тваю смерць мы адпомсцім праклятым фашыстам! Паклянёмся, таварышы, што адпомсцім!

Глытаючы слёзы, яны вымаўлялі адзін за адным:

— Клянуся!

— Клянуся!

— Клянуся табе, Цішка!

— Мы адпомсцім за цябе!

— Адпомсцім!..

Анатоль узяў рыдлёўку і ўпершыню разгубіўся: цяжка, ой як цяжка было сыпануць халодны жвір на адкрыты твар Цішкі, на вочы, што былі такія ясныя, на вусны, якія колькі гадзін назад весела смяяліся. Саша зразумела гэта, падняла лёгкія галінкі і кінула ў магілу, галінкі закрылі нябожчыку твар. Тады хлопцы пачалі засыпаць магілу. Недзе фыркнуў конь. Яны адразу прыселі, Анатоль і Данік выхапілі пісталеты... Але пачуўся ўмоўны свіст вартавога — Лёні.

— Дзядзька Аляксей,— здагадаўся Данік.

Каваль пад'ехаў на кані, саскочыў з саней і, блытаючыся ў доўгай папоўскай расе, рушыў да іх; Лёня не ўправіўся яму нічога сказаць, і ён не ведаў, што Цішкі ўжо няма, ён ехаў з намерам забраць яго, завезці за раку.

Абмінуў кучу галля, убачыў магілу і — застыў на месцы. Нейкую хвіліну няўцямна глядзеў на свежую зямлю, потым сарваў з галавы шапку, упусціў яе на прытаптаны снег, абышоў вакол магілы і, чамусьці моцна тручы далонямі зарослыя шчокі, вымавіў са стогнам:

— Хлопчык мой... Хлопчык мой!..

* * *

Яны чакалі яе і баяліся яе прыходу. І ўсё-такі яна траха не захапіла іх знянацку. Поля ўбачыла жанчыну праз акно тады, калі яна ўжо зайшла ў іх двор. Спалохана папярэдзіла:

— Матыліха!

Данік спаў на печы, ён моцна прастудзіўся, у яго пачалася гарачка. Аднак і ён адразу прахапіўся.

Уладзімір Іванавіч падскочыў да яго, зашаптаў:

— Данік, трымайся! Цішкава маці! Кажы так, як мы дамовіліся.

Саша таксама ледзь трымалася на нагах. Яна нават дрэнна помніла, як дзядзька Аляксей прывёз яе дадому: яны доўга кружылі па лесе, па полі і прыехалі пазней, чым прыйшоў Данік. Цяпер Саша спалохалася больш, чым хто.

Лялькевіч, убачыўшы, як яна збялела, падаў ёй Ленку:

— Схавайцеся за грубку і карміце дзіця. Не паказвайцеся!

Жанчына паважна павіталася і, каб пачаць неяк размову, сказала як бы жартам:

— Мужчыны ў хаце, а сцежку не пачысцяць. Прайсці нельга — так намяло.

— Такія мужчыны! — адказала Поля, бразгаючы ў куце посудам; яна таксама старалася не глядзець на маці, якая нічога не ведала і не павінна была ведаць.

— А мой мужчына некуды знік. Учора ўвечары сказаў, што да Ніны на пасёлак пойдзе, яна прасіла памагчы дроў напілаваць. Сёння Ніна сама прыйшла — не было яго. Ты, Данічак, не ведаеш, дзе ён можа быць?

— В-ведаю.

Лялькевіч, тупнуўшы драўляным пратэзам, які сам зрабіў, хутка падаў жанчыне табурэт:

— Сядайце, калі ласка.— Не спадабалася яму, як заікаецца Данік, і ён імкнуўся крыху адцягнуць увагу жанчыны.— Сядайце, цётка. Гэтыя падшыванцы ўсё знаюць.

— Куды ж ён сышоў, што і матцы не сказаў?

— В-ведаю... Т-толькі, цётка Марына, гэта с-сакрэт... Вы н-нікому не кажыце... С-скажыце, што п-пайшоў Цішка некуды... да с-сваякоў...— Жанчына насцярожана ўстала з табурэта.— А ён... ён пайшоў з партызанамі...

— Ах, Божачка мой! Дзіцё горкае! — У голасе маці былі спалох, здзіўленне і адначасова гонар за сына.— Вось бачыш, Сашачка, росціш, росціш іх, а яны слова маці не скажуць. Надумаў — усё кінуў, пайшоў. Ну, няхай толькі вернецца, я яму пакажу, не пагляджу, што партызан...

Саша заціснула плёнкай рот, каб не застагнаць. Яна зноў чула голас Цішкі, яго апошнія словы: «Ма-ма! Мама!»

Мама! Так вайна забірала тваіх сыноў.

IX

Лялькевіч і Саша ехалі ў горад — везлі бочкі, цэбры, вёдры.

Ачуняўшы, камісар знайшоў сабе занятак, карысны ва ўсіх адносінах: успомніў прафесію бацькі і дзядзькоў сваіх, якія былі бондарамі і сяму-таму некалі навучылі яго. Тут, у

гэтай вёсцы, таксама было нямала бондараў — жылі сярод лесу,— ды амаль усе пайшлі на фронт. Аднак у дварах засталася нарыхтаваная клёпка, і салдаткі ахвотна аддавалі яе Сашынаму Пецю, як усе яны называлі яго, у душы зайздросцячы Сашы: яе чалавек хоць без ступні нагі, але вярнуўся жывы, ды вунь яшчэ майстра які — на ўсе рукі. А ці вернуцца бацькі іх дзяцей?

З дапамогай Даніка Уладзімір Іванавіч узяўся бандарыць. Першыя цэбры выходзілі не надта зграбныя, але хутка справа наладзілася. Партыю бочак Данік завёз на Украіну і выменяў на муку і сала. Гэта адразу палепшыла становішча сям'і, бо ад прапановы атрада «падкідваць» яму прадукты Лялькевіч адмовіўся, баючыся, што гэта можа выкрыць іх. З атрада хлопцы прыносілі толькі самае неабходнае — лістоўкі, міны.

Было прадвесне — сакавік, але дзень выдаўся па-зімоваму халодны, хмурны; лес з раніцы адзеўся ў казачную квецень інею. Як бы зачараванае гэтай прыгажосцю, усё застыла навокал — паветра, дрэвы. Спіна каня таксама пасерабрылася. Ехалі ўзбоч шашы, па высечанай немцамі паласе, бо асфальт ужо амаль ачысціўся ад снегу, ды і ехаць па шашы было рызыкоўна: нямецкія грузавікі часта налятали на фурманкі і забівалі, калечылі людзей.

Сядзелі, як належыць мужу і жонцы, поплеч, у перадку саней. Ззаду былі нагружаны бочкі і цэбры, ад якіх прыемна пахла дубам і асінай. Заўтра, у нядзелю, іх трэба прадаць, едуць нанач. Але Саша добра ведае, што зусім не продаж галоўная мэта іх паездкі.

Ехалі амаль моўчкі. Зрэдку перакідваліся словамі аб надвор'і, аб нямецкіх грузавіках, што праходзілі па шашы, ці яшчэ аб чым-небудзь, што не мела дачынення да іх барацьбы і да іх узаемаадносін.

Саша прыкмеціла, што ў апошні час, калі яны астаюцца сам-насам, Лялькевіч як бы губляецца і не ведае, пра што гаварыць, хоць у прысутнасці другіх ён звычайна гаманкі і вясёлы. Гэта яе забаўляла і абуджала тую дзявочую гарэзлівасць, з якой яна часам размаўляла з ім у той далёкі час, калі яны разам працавалі ў Заполлі. Іскра такой гарэзлівасці ўспыхнула і тут, у дарозе. Яна як бы незнарок разоў коль-

кі дакранулася сваім плячом да яго пляча. Ён кожны раз далікатна адсоўваўся. Саша са смехам падумала, што, калі яна дакранецца яшчэ, ён можаываліцца з саней. А ўвогуле яе крыху прыгнятала гэтая маўклівасць. Ёй хацелася пагаварыць шчыра і сур'ёзна. За тры месяцы яна прывыкла да гэтага чалавека, як да члена сям'і, як да брата, і цяпер ёй здавалася, што магла б даверыць яму, як добраму другу, усе свае думкі, трывогі, сумненні, перажыванні — выказаць усё, што на душы, напэўна, тады ёй стала б лягчэй. Праўда, часам яе палохала, што яна так прывыкае да яго. Неяк Поля пачала вельмі хваліць Уладзіміра Іванавіча, калі ён габляваў пад паветкай клёпкі.

Саша ўзлавалася:

— Ты быццам сватаеш яго мне.

Старэйшая сястра разгубілася. Мабыць, па сваёй сялянскай прастаце Поля сапраўды думала нешта такое. Бо дзе той Пятро, якога ніхто з іх не бачыў у вочы? Што гэта за жаніцьба ў іх была такая, што яны нават бацькам не сказалі, ні яна, ні ён?

Аб чым толькі не перадумае жывы чалавек! Розныя думкі з'яўляліся ў Сашы, нават самыя страшныя. Аднойчы яна падумала, што, калі, не дай божа, з Пецем што здарыцца, Уладзімір Іванавіч, безумоўна, пасватаецца да яе, а Поля і Данік памогуць пераканаць, што толькі з ім яна знойдзе сваё другое шчасце. І ў той міг яна ўзненавідзела яго, ёй здалося, што ён жадае Пецевай смерці. Некалькі дзён Саша глядзела на яго, як на ворага. Потым зразумела, што гэта недарэчна, што брыдка гэтак думаць пра такога чалавека, як Лялькевіч. Яна ўспомніла, як ён разам з імі гараваў па Цішку, як потым хадзіў за хворым Данікам, колькі сутак хвіліны не заснуў, бо Данік хварэў цяжка і ў гарачцы ўсё рваўся забіць начальніка паліцэйскага атрада. Цяпер Данік ачуняў, сунімаўся боль — жыццё, як заўсёды няспыннае і дужае, брала сваё. Саша ахвотна згадзілася ехаць у горад, хоць ведала, што паездка небяспечная. І ўпершыню тут, у дарозе, ёй стала прыемна ад думкі, што чалавек, які сядзіць побач, кахае яе. Яна зноў лёгка штурхнула яго плячом. Ён не адсунуўся, а здзіўлена паглядзеў на яе.

Саша ўсміхнулася:

— Пра што вы думаеце, Уладзімір Іванавіч?

— Я? — Ён на хвіліну сумеўся.— Пра вас.

— Пра мяне?

— Я думаю, што, можа, вам варта пераначаваць дзе-небудзь у іншым месцы.

— Чаму?

— Невядома, што там за канспірацыя. Чаму яны самі змянілі месца нашага начлегу? Сафронавічу гэта не спадабалася.

— Сяліцкі з нашай вёскі, таму яны палічылі, што будзе больш натуральна, калі мы заедзем да яго.

— Усё гэта так, безумоўна. Але навошта рызыкаваць двaім?

— У нас жа пропуск адзін. А раптам правераць у мяне: як прыехала, з кім? З мужам. Дзе ён? Чаму ў розных дамах начуем? — І, не чакаючы ні яго пярэчанняў, ні яго згоды, катэгарычна сказала: — Не, будзем начаваць разам!

Ён паглядзеў на яе з удзячнасцю. Яму хацелася сказаць ёй нейкія асаблівыя, надзвычай цёплыя і сардэчныя словы, але ён не мог дазволіць сабе гэтага. Толькі ў знак удзячнасці пачаў даверліва расказваць аб планах стварэння ў горадзе шырокага партызанскага падполля, ад дзейнасці якога пад нагамі акупантаў гарэла б зямля. Саша адчула гэты вялікі давер: такія планы не кожнаму члену арганізацыі можна расказаць!

Пры ўездзе ў горад іх затрымаў паліцэйскі пост, а праз нейкія пяцьдзесят крокаў, навідавоку ў паліцэйскіх, праверылі немцы. Адзін з іх, пажылы, з дабрадушным тварам, вялікай рукой працоўнага чалавека, на якой, аднак, даўно сышлі мазалі, паляпаў па бочках і цэбрах, відаць, разумеючы ў іх толк:

— Гут, гут. Гаймарбайт. Гандэль.

— Не вераць улады адна адной,— сказаў Лялькевіч, калі ад'ехалі.

Нова-Беліца не зрабіла на Сашу асаблівага ўражання, тут не было прыкметных змен: усё тая ж сумная і доўгая вуліца — ні горад, ні вёска,— якую яна не любіла, калі ёй, сту-

дэнтцы, прыходзілася пехатою хадзіць дадому (да вайны трапіць на машыну было не так лёгка).

Але калі яна ўбачыла ўзарваны, бязлітасна знявечаны мост цераз раку — той мост, на які яны колькі разоў прыходзілі з Пецем,— сэрца яе сціснулася. Яна неяк адразу прыгадала (можа, таму ёй так хацелася ехаць), што гэта — горад, дзе прайшло яе юнацтва, тры самыя цікавыя і шчаслівыя гады, дзе нарадзілася іх з Пецем каханне. Тут ёй усё знаёма да драбніц, на многіх вуліцах — кожная выбоіна на тратуары. І ўсё напамінае яго, Пецю.

Цераз бетонны мост іх не пусцілі. Паехалі па Інтэрнацыянальнай. Саша жахнулася: як не падобны гэты горад на той, які яна ведала. Гэты быў бязлюдны, брудна заснежаны, насцярожаны і знявечаны. Першыя руіны, першыя спаленыя дамы — і кожны з іх раніў яе. Павярнулі на Ветраную вуліцу — і сэрца яе заныла. Гэта была адна з вуліц, з якімі асабліва многа звязана ўспамінаў аб тых шчаслівых днях. Тут жыў на кватэры Пеця, адгэтуль ён бегаў да яе на спатканні, тут пісаў свае доўгія пісьмы, дзённікі. Але як змянілася і яна, знаёмая, родная вуліца! І тут многа будынкаў спалена, разбурана бомбамі.

«Ці цэлы дом, у якім ён жыў? Ці цэлы?» — з прымхлівым страхам думала Саша. Вельмі хацелася, каб гэты дом стаяў цэлы, не пашкоджаны, быццам ад гэтага залежаў лёс Пеці. Дом быў спалены. Яна застагнала.

— Што з вамі, Саша? — шэптам спытаў Лялькевіч, убачыўшы, як яна змянілася з твару. Ёй раптам стала сорамна за тое, што там, за горадам, у яе быў такі ўзнёслы настрой, што яна паводзіла сябе як дзяўчынка, штурхала камісара, быццам заляцалася. Ёй здалося, што гэтым яна абразіла... памяць Пеці.

«Памяць? Чаму памяць?» — схамянулася яна і прашаптала:

— Не, ён жывы! Жывы!

— Супакойцеся, Аляксандра Фёдараўна! — не папрасіў, а загадаў Лялькевіч.

— Тут жыў Пеця... І дом згарэў...

— Многа дамоў згарэла. А людзі жывуць. Не будзьце прымхлівая! Я разумею — успаміны, але не забывайцеся...

Яны выехалі к пераезду цераз чыгунку, і іх зноў затрымалі. Тут Саша ўбачыла, як многа навокал немцаў — салдат, афіцэраў. Усе яны даўжэй, чым гэта звычайна робіцца ў горадзе, спынялі свае позіркі на іх. Адны глядзелі на фурманку ■ бочкамі і цэбрамі і на маладую пару, як на нейкае этнаграфічнае дзіва, другія — насмешліва, трэція — варожа і падазрона. Афіцэр загадаў патрулю праверыць пільна, ці няма чаго ў бочках і пад імі? (Лялькевіч за час хваробы добра «праштудзіраваў» падручнік нямецкай мовы і цяпер многае разумеў.) Саша ніколі не бачыла так многа ворагаў вакол сябе: у вёсцы яны былі наездамі і неяк адразу разбрыдаліся, а ў хату заходзіла самае большае трое. А тут вунь іх колькі, у іх сіла, улада, а яна і Лялькевіч без зброі, бездапаможныя. На момант ёй зрабілася страшна. Але немец прачытаў пасведчанне, пропуск, які ім выдалі ў воласці, і зноў-такі з ухвалай сказаў:

— Гандэль? Гут!

Відаць, тым з іх, якія не ведалі ўсіх таямніц гітлераўскай палітыкі, хацелася, каб жыццё на захопленай зямлі ўвайшло ў нейкую нармальную каляіну, тады, магчыма, і яны адчувалі б сябе спакайней.

У Залінейным раёне разбурэнняў не было відаць і часцей сустракаліся нашы людзі, бледныя з твару, бедна апранутыя, таропкія ў позірках і рухах.

Сашы не спадабаўся дом, дзе ім трэба было заначаваць і сустракацца з людзьмі. Яна, як і большасць даваенных студэнтаў, што выхоўваліся непрымірымымі да ўсялякай прыватнай уласнасці, не любіла гэтых дамоў з садамі і сабакамі, гаспадары якіх вельмі неахвотна пускалі іх, студэнтаў, на кватэру. Такі быў гэты дом: вялікі — тры акны на вуліцу, стары, але па-гаспадарску дагледжаны, з высокім парканам і мноствам садовых дрэў, апранутых у густы іней. Але Саша крыху ведала гаспадара, Рамана Сяліцкага, чалавека з іхняй вёскі, які пераехаў у горад гадоў пятнаццаць назад і ўвесь час працаваў на заводзе металістам. Лепш яна ведала яго дачку, якая на год раней кончыла фельчарскае вучылішча.

Ім доўга не адчынялі, і Саша ўбачыла, як гэта ўстрывожыла камісара. Нарэшце завала грукнула, і ў брамцы з'явілася сама гаспадыня. Яна быццам не пазнала адразу Сашы: доўга прыглядалася, потым пляснула далонямі:

— А Божачка! А ці не дачка Хведара Траянава? Пазнала! Колькі год не бачыла, а пазнала. Вылітая маці... А мы з тваёй маткай у дзеўках разам гулялі, у адзін год замуж выходзілі...

— Цётка Вуля, паначаваць у вас можна?

— А як жа гэта сваім людзям ды нельга пераначаваць? Заязджайце, заязджайце. Калі ласка. Толькі — вой! — у нас цэлую зіму вароты не адчыняліся. Пайду паклічу старога. Раман! — Гаспадыня гаварыла гучна, на ўсю вуліцу, і Лялькевіч адразу павесялеў: іграла яна сваю ролю ўмела, правільна.

— А гэта чалавек твой?

— Чалавек, цётка Вуля.

— Паўчалавека,— пажартаваў Уладзімір Іванавіч, паказваючы на сваю нагу.

— Дзякуй Богу, што жывы... Жывы — заўсёды чалавек.

Выйшаў гаспадар, невысокі, хударлявы, з рудымі вусамі, якія тырчалі пікамі і надавалі яго твару нейкі злосны, натапыраны выгляд. Ён павітаўся без лішніх слоў і пачаў адчыняць вароты.

У хаце, застаўшыся з Сашай, пакуль мужчыны даглядалі каня, гаспадыня цяжка ўздыхнула і, употайкі выціраючы слёзы, сумна сказала:

— А маіх няма, Сашачка. Ваня машыністам ездзіў недзе на Поўначы, там і астаўся. І сям'я там. Дзе цяпер ездзіць — хто ведае. Ліду ў армію забралі ў першыя ж дні... А Коля — дзіця горкае, шаснаццаць гадкоў — у апалчэнне запісаўся і адступіў з нашымі. Усе — на вайне. І мы, бачыш, са старым ваюем, як умеем...

Яна як бы спалохалася, што сказала лішняе, хутка ўзяла ад Сашы сала, бутэльку самагонкі, якую яны захапілі «для гасцінца», і пачала адразу ж збіраць на стол.

Гаспадар і Лялькевіч чамусьці бавіліся на двары. Змяркалася. У дамах насупраць шчыльна зачынялі аканіцы. Саша сядзела каля акна і разглядала сямейны

фотаальбом — шчаслівую гісторыю рабочай сям'і: маладыя гаспадары, вясёлыя дзеці, хрэсьбіны, вяселле старэйшага сына, першы ўнук... Ніводнай фотакарткі, якая б сведчыла аб горы ці смутку. Альбом нагадваў яе ўласнае нядаўняе шчасце, і яна, задумаўшыся, не пачула, як у дом прыйшлі людзі. Пачула чужы бас:

— А мы ідзём, бачым — след саней. Хадзем, кажу, браток, можа, самагоначкі з вёскі прывезлі. Пачастуюць.

Саша ўстрывожылася: выпадкова зайшлі чужыя людзі і могуць перашкодзіць сустрэчы. Але ўбачыла чалавека, што першы ўвайшоў у пакой, і супакоілася, бо адразу пазнала яго, хоць ні разу ў жыцці не бачыла; пазнала па яго словах каваля: шырокі закураны твар з дзіўна белымі брывамі, са шрамам на носе (некалі адскочыў кавалак гарачай падковы), доўгія рукі з вузлаватымі чорнымі пальцамі. Кіраўнік падпольнай групы завода, дзе немцы рамантавалі танкі, Дрозд (Саша не ведала, ці гэта клічка, ці сапраўднае прозвішча) — таксама каваль, стары друг Аляксея Сафронавіча. Ён моўчкі і асцярожна, быццам вельмі кволую рэч, паціснуў Сашыну руку. З-за яго спіны выглянуў хлопец з круглым тварам, задзірыста-кірпаносы, з вожыкам бялявых валасоў. Ён, наадварот, паціснуў руку Сашы моцна, весела падміргнуў і так, як, відаць, заўсёды, калі знаёміўся з дзяўчатамі, назваў сябе:

— Цімафей.

Саша адразу вызначыла, што гэта адзін з тых вясёлых хлопцаў, якія маюць зайздросную прывабную здольнасць вельмі лёгка знаёміцца з людзьмі, асабліва з дзяўчатамі, і хутка заваёўваць агульную павагу і любоў. Ён, відаць, не ведаў ці не надта верыў, што Саша — жонка «адказнага сувязнога», бо пазней, за сталом, сеўшы з ёй побач, спытаў шэптам: «Вы з атрада?» — «Не, з вёскі. У мяне — грудное дзіця»,— адказала яна, як бы апраўдваючыся, чаму не ў атрадзе. Гэта яго расчаравала крыху.

Дрозд убачыў сала на стале, асцярожна двума пальцамі ўзяў скрылёк, пачціва паглядзеў, удыхнуў пах, не падносячы блізка да твару, і гэтак жа асцярожна паклаў назад на талерку.

— Эх, даўно я сала не еў. Забыўся, як і пахне,— і звярнуўся да Лялькевіча: — Галадае народ, таварыш Пятро. Аб-

рабавалі людзей, паразіты. Эшалон за эшалонам гоняць у Нямеччыну.

— Вы пагутарце, а я аканіцы зачыню,— сказаў гаспадар і выйшаў.

Дрозд і Лялькевіч селі на канапцы, каля грубкі. Цімафей падсеў бліжэй да Сашы. Мабыць, стары падпольшчык кіўнуў на яе (Саша не прыкмеціла гэтага, аддаючы больш увагі вясёламу хлопцу), бо Лялькевіч сказаў:

— Саша — наш таварыш, наша сувязная.

Стары адкашляўся, як перад доўгім выступленнем, і пачаў дакладваць прыглушаным голасам, амаль шэптам:

— Значыцца, так, таварыш Пятро, такія справы... Аб нашай рабоце. Група патроху расце. Дзевяць чалавек маем ужо... На танках, якія праходзяць праз нашы рукі, немец не навоюе доўга — да першага бою. Устанавілі сувязь з другімі групамі. З мясакамбінатам. З друкарняй. Цімох вось адтуль. Хлопцы ў яго там хоць куды. Малайцы. Баявыя. Вось бланачкі якія штампуюць! — Ён дастаў з запазухі пачак папер і перадаў Лялькевічу.— І вось той падаруначак таксама ад іх. Намацалі чалавека ў картачным бюро. Стары настаўнік нямецкай мовы, але чалавек савецкі. Наш. Правяраем. Вельмі ж нам трэба хлебныя карткі. Уладзілі пару дзяўчат у шпіталь. Дэпо на сувязь не ідзе, хоць людзі там нашы ёсць, адчуваем, нават ведаем некаторых. Вельмі ж лютая чыгуначная ахова, вока не спускае, на кожным рагу — гітлераўскі пёс. На кожнай стрэлцы — па сабаку. Кажуць, у Оршы нашы моцна падкузьмілі іх. Ды і на другіх вузлах, чуваць, не спяць хлопцы. Адным словам, сувязь з чыгуначнікамі мы наладзім. Так і перадайце. Ужо маем за каго зачапіцца. Цяпер такая справа, таварыш Пятро. У горадзе з'явіўся партызанскі прадстаўнік. Вядома вам пра гэта?

— Не, невядома. Але сувязныя заўсёды могуць быць. Атрадаў вакол горада многа, і кожны можа мець сувязь са сваімі людзьмі, з той ці іншай групай.

— Правільна. Атрадаў многа. І сувязныя бываюць. Гэта мы ведаем. Але я так разумею, што кіраваць усёй работай у горадзе павінны з нейкага аднаго месца.

— Кіруе і будзе кіраваць гарком партыі. Мы, наш атрад, маем заданне гаркома па сувязі з горадам.

— Вось таму і паведамляем вам. Чалавек гэты наладжвае сувязі з многімі групамі. Імкнецца кіраваць усімі. Хацеў сабраць нас разам. Я не пайшоў на гэтую сустрэчу і Цімоха адгаварыў. Чалавек, канешне, правільны — мы праверылі. Наш. Але малады і залішне гарачы. Дзейнічае ў горадзе, як у лесе. Праваліць ён людзей. Прашу вас: перадайце там, каб даведаліся, хто яго пасылаў, і каб замянілі больш вопытным, асцярожным. Бачыш, клічка ў яго Баявы! Сябе выдае!

— Добра, Сцяпанавіч. Хто такі гэты прадстаўнік, хто яго прыслаў, даведаемся. На сувязь з ім не ідзіце! Заўсёды помніце, што гестапа — вопытныя майстры ў галіне правакацый. За падарункі — дзякуй. Перадайце, таварыш Цімох,— звярнуўся Лялькевіч да маладога падпольшчыка,— партызанскую падзяку групе. Усё гэта нам вельмі дарэчы.

Хлопец пачырванеў ад задавальнення, кінуў позірк на Сашу, кіўнуў галавой:

— Перадам.

— Цяпер аб галоўным... Набліжаецца вясна. Трэба думаць, што гітлераўскі штаб захоча ўзяць рэванш за сваё зімовае паражэнне пад Масквой. Мы ўжо маем даныя, што колькасць эшалонаў, якія ідуць да фронту, расце з кожным днём. Вось чаму чыгунка павінна стаць галоўным аб'ектам нашым. Удары па чыгунцы — найлепшая дапамога фронту! Першае, што нам трэба,— гэта агентурныя даныя аб праходжанні цераз вузел эшалонаў. Колькі? З чым? Калі часці, то якія? Даныя такія вельмі патрэбны савецкаму камандаванню. Думаю, вы разумееце...

— Зразумець проста, зрабіць цяжэй,— уздыхнуў Дрозд.— Каб мы служылі на чыгунцы!

— Партызанскі штаб устанавіў сувязь з адным служачым. Дыспетчар. Баляслаў Шлім.

— Немец?

— Паляк. Камуніст. Ён будзе перадаваць патрэбныя нам звесткі. Але іх трэба забіраць у яго. Даручаем гэта вам, таварыш Цімох.

— Мне? — У хлопца загарэліся вочы.

— Падумаем, як лепш вам сустрэцца з ім. Даныя будзеце перадаваць Сцяпанавічу. Ну, а далей — вядома... Часцей за ўсё, як і раней, будзе на сувязі поп.

Цімох засмяяўся і зноў падміргнуў Сашы:

— Люблю такіх папоў!

На каго іншага Саша ўзлавалася б за гэтае недарэчнае падміргванне. Але на гэтага хлопца злавацца было немагчыма: кожны жэст яго быў надзіва натуральны і вясёлы. Лялькевіч таксама назіраў за ім з цікавасцю.

— Другая задача — усё тая ж... Абавязкова патрэбна моцная група ў дэпо і ўвогуле на чыгунцы.

— Будзем мець такую групу, таварыш Пятро! — запэўніў Дрозд.— Я ж кажу: ужо маем за каго зачапіцца.

— Нарэшце, трэцяя, таксама звязана з чыгункай. Найбольшую колькасць дыверсій партызаны будуць рабіць на чыгунках у напрамку на Бранск і Бахмач. Натуральна, што пасля гэтага на вузле будуць «пробкі». Кожную такую «пробку» будзе выбіваць наша авіяцыя.

— Здорава! — з захапленнем выгукнуў Цімох.

— Але сокалам нашым трэба памагаць. Паказваць цэль. І каб менш бомб падала туды, дзе жывуць савецкія людзі. Патрэбна група энергічных, смелых хлопцаў.

— О, гэта лёгка! — зноў не ўтрымаўся Цімох.— Такую работу хлопцы любяць!

— Гэта нялёгка, таварыш... Гэта вельмі небяспечна. Больш, чым што іншае. Але трэба!

— Я арганізую такую групу! Дазвольце мне...

Лялькевіч паглядзеў на Дразда, позіркам спытаўшы: ці не замнога бярэ на сябе гэты юнак? Стары кіўнуў галавой: можна даручыць!

— Добра. Арганізацыя групы за вамі. Але майце на ўвазе, пакуль вы на сувязі з Шлімам, ісці з ракетніцай не павінны!

Цімох глянуў на Сашу і красамоўна зморшчыўся: вось табе на, ад самага цікавага яго адхіляюць.

Гэта ўбачыў Лялькевіч, і голас яго адразу стаў суровы, загадны:

— Пасля кожнай ракеты будзе аблава. Мы не можам рызыкаваць. Арыштуюць вас — праваліце Шліма. Кіраваць падачай сігналаў павінен нехта іншы!

Хлопец адчуў гэты загадны тон і падняўся з табурэта, сур'ёзна, амаль па-вайсковаму сказаў:

— Слухаюся, таварыш... Пятро! Кіраваць будзе іншы!

Гаспадар прасунуў у дзверы галаву:

— Бульбачка зварылася. Можа, з'ямо гарачанькую?

— Ого! Яшчэ як з'ямо! — весела адгукнуўся Дрозд.

Пакуль гаспадыня падавала на стол гарачую бульбу і гуркі, Лялькевіч і Цімох на колькі хвілін выйшлі ў суседні пакой...

За сталом — ніводнага слова аб справе. Гутарылі так, як маглі б гутарыць людзі, якія сапраўды сустрэліся выпадкова: адны прыехалі з вёскі і заначавалі ў знаёмага, другія зайшлі, убачыўшы след, каб выпіць «вясковай самагоначкі». Выпілі. Нават Саша ўпершыню паспытала. Цімох, відаць, таксама піў першы раз, бо, выпіўшы, скрывіўся так, што Саша ледзь не зарагатала, і «пахваліў» пачастунак:

— Ну і дрэнь.

— Братка ты мой, гэта ты не разабраўся,— адказаў Дрозд, які выпіў сваю порцыю павольна, са смакам і ў заключэнне задаволена крэкнуў.

Праўда, да канца канспірацыі не вытрымалі. Парушыла гаспадыня: папрасіла расказаць, што робіцца на фронце і «там», «у нашых». І Лялькевіч мусіў пераказваць апошнія зводкі Саўінфармбюро, якія тыдзень назад Анатоль прынёс з атрада.

Калі вячэра скончылася і госці пайшлі, гаспадыня павяла Сашу і Лялькевіча ў спальню і паказала на адзіны, заслаunion ложак.

— Вы лажыцеся тут, а мы са старым на печы ляжам.— І, ведаючы, што госці заўсёды пярэчаць, адмаўляюцца, хутка выйшла, пакінуўшы іх адных.

Сашы зноў зрабілася весела. Яна ўбачыла, як разгубіўся гэты чалавек, які звычайна знаходзіў выйсце з самых цяжкіх абставін, і ледзь стрымлівалася, каб не засмяяцца.

Лялькевіч, унікаючы яе позірку, вымушана кашляў і глядзеў на дзверы, як на ратунак.

— Лажыцеся,— сказала яму Саша.

— А вы?

— А я... Я лягу на падлозе.

— Ну што вы! Як можна! Я ніколі не дазволю сабе... Я ўсё-такі мужчына.

— Калі вы ўсё-такі мужчына,— засмяялася прыглушана Саша,— то лажыцеся на падлозе.

Яна скінула буркі і ў плацці і Данікавых ватных штанах залезла пад коўдру.

Лялькевіч выйшаў са спальні.

Саша, упэўненая, што ён ляжа ў суседнім пакоі на канапцы, зморааная за дзень, хутка заснула. Але калі прачнулася раніцой, то ўбачыла, што ён сапраўды ляжыць у куце за шафай, на падлозе, накрыўшыся сваім кажушком. Ёй стала сорамна за свой эгаізм і наогул за ўчарашнія паводзіны. Чаму яна весялілася, як ніколі за месяцы акупацыі? Чаму потым так спалохалася, убачыўшы, што дом, дзе жыў Пеця, згарэў? Хіба мала цяпер гарыць дамоў?

Адначасова з'явілася злосць на Лялькевіча. «Што ён іграе перада мной пакутніка! Лепшага месца не знайшоў, дзе легчы. Камісар! Спалохаўся, што гаспадары не павераць, што я — жонка. А якое гэта мае значэнне для іх? Усё адно, раз яны сталі на гэты шлях, ім наканавана маўчаць. Маўчаць перад катаваннямі, перад тварам смерці. Так, як маўчаў Цішка, як маўчаць Поля, Данік, Анатоль... Усе мы павінны маўчаць. І я таксама... Чаму гэта мне захацелася раскрыць душу перад ім? З якой рады?» І яна зноў замкнулася. Але на гэты раз ненадоўга.

Рынак зрабіў на Сашу дзіўнае ўражанне. Нельга сказаць, што ён быў малалюдны. Не, людзей было нямала. І — на першы погляд — шмат што прадавалася, асабліва з апраткі. Але купляць... купляць гэтым людзям не было чаго, бо не было ні кароў, ні свіней, як у даваенны час, ні мукі, ні сала, ні мяса, ні бульбы, ні цыбулі. Нічога не было з таго, што патрэбна чалавеку ў першую чаргу. Саша з болем падумала: як жа жывуць гарадскія людзі? «Галадае народ»,— успомніліся словы Дразда. У вёсцы хоць бульбіна якая-небудзь ды капуста ёсць.

І яшчэ адно ўразіла яе: вялікая колькасць людзей, неяк па-старамоднаму апранутых. Адкуль яны ўзяліся? Да вайны рэдка калі сустракаўся чалавек у такім адзенні. А тут быццам усе яны выйшлі з фільмаў аб дарэвалюцыйным жыцці: у чорных шалях, доўгіх спадніцах, у паліто з аксамітавымі каўнерыкамі і вузкіх штоніках. І ўсе гэтыя людзі нешта прадавалі, шпарка бегаючы з канца ў канец, прытанцоўваючы на марозе. Сашы здалося, што ад іх саміх і ад рэчаў, якія яны

прадаюць, вельмі пахне нафталінам. Пакупнікоў на бочкі, як і на ўсё гэтае рыззё, было нямнога. Але бочкі, прынамсі, выклікалі цікавасць. Каля іх тоўпіліся, мацалі клёпкі, лягалі па звонкім дрэве, нюхалі яго прыемны пах. Ды і саміх прадаўцоў — Лялькевіча і Сашу — разглядалі з цікавасцю: што за людзі, што прывезлі такі нязвыклы для гэтага часу тавар? Уладзіміру Іванавічу не падабалася такая цікавасць да яго асобы: ён баяўся, што раптам знойдзецца хто-небудзь знаёмы і пазнае яго. Не так далёка ад горада да раёна, дзе ён настаўнічаў. Таму ён вельмі ўзрадаваўся, калі нейкі камерсант, відаць, гандляр мясам ці, можа, іншым чым, запрапанаваў купіць усе яго бочкі, цэбры, вёдры оптам.

— Даю пуд солі.

Соль! Каб гэта было што іншае, любое, самае каштоўнае, Лялькевіч, напэўна, аддаў бы за тое, што прапанавалі,— абы хутчэй з плеч. Але соль... Значыцца, у гэтага прайдзісвета ёсць даволі солі, без якой яны ядуць страву ўжо каторы месяц, якой так просяць да бульбы дзеці тых салдатак, якія аддалі яму, Лялькевічу, клёпку. Таму ён пачаў таргавацца — запрасіў тры пуды. Гандляр махнуў рукой і адышоў, але хутка вярнуўся і самаўпэўнена сказаў:

— Падумаў? — Ён добра ведаў цану сваёй солі.

— Два пуды.

— Не будзь дурнем. На тваё калецтва надбаўляю.— І перайшоў з пудоў на кілаграмы.— Дваццаць кілё.

Дваццаць кілаграмаў солі. Сашы здавалася гэта цэлым багаццем, яна ледзь стрымлівала сябе, каб не сказаць на правах жонкі: «Аддавай, Пеця». Але Лялькевіч зразумеў, што тыпу гэтаму бочкі вельмі патрэбны, і ўпарта змагаўся за кожны кілаграм.

— Дваццаць пяць,— узлавана абвясціў гандляр, чырванеючы ад гневу.

— Дваццаць восем.

— Я скажу паліцыі, каб канфіскавала твае бочкі. Не забывай, што лес цяпер належыць нямецкай дзяржаве. А ты накраў...

Сярод цікаўных, якія акружылі іх, пачуліся нясмелыя галасы абурэння: таргуйся сумленна, не палохай! Але Лялькевіча цяжка было запалохаць. Ён пачціва адказаў:

— Ваша справа, пан. Але няхай шаноўны пан зразумее, колькі мне, калеку, прыйшлося пастаяць на адной назе, каб вось так выгабляваць кожную клёпачку.— Ён стукаў кулаком па самай большай, дубовай, бочцы, і яна гудзела на ўвесь рынак.

Нарэшце сышліся на дваццаці шасці кілаграмах...

— Нам яўна пашанцавала,— сказаў Лялькевіч, калі яны, пасля шматлікіх праверак, выехалі з горада і дабраліся да лесу, дзе адчулі сябе бяспечна і ўтульна. Уладзімір Іванавіч быў задаволены, вясёлы. Яму хацелася гаварыць, магчыма, гэтак жа, як учора ёй.— Чаму вы такая панурая, Саша? Вас усхваляваў гэты дом? Далібог жа, забабоны! Выкіньце з галавы! Больш таго, я хачу, каб вы зразумелі... Мы вядзём бязлітасную барацьбу са страшным ворагам... У такіх умовах нельга даваць волю сваім пачуццям. Трэба ўмець імі валодаць. Трэба, кажучы груба, зацiснуць іх вось так.— Ён паказаў кулак.— Інакш мы пачнём забываць пра галоўнае.

Саша маўчала. Яна думала, як, аднак, змяніўся гэты чалавек, некалі малады, вясёлы настаўнік, вялікі аматар валейбола і лыжных прагулак. Цяпер толькі адно яго радуе — поспех у барацьбе, бо толькі змаганнем ён жыве, гарыць. Ён прылёг на бок, паклаўшы галаву на клунак з соллю, і нешта ціха насвістваў. Ён адпачываў пасля двух нялёгкіх дзён. Але ў той час бяда магла напаткаць там, дзе яе зусім не чакаеш. Саша першая ўбачыла, як з лесу выйшлі двое ў цывільным адзенні і спыніліся на дарозе; не магло быць сумнення, што яны чакалі іх. Яе здзівіла, чаму так збялеў Лялькевіч, убачыўшы гэтых людзей. Праехаў горад, дзе, можа, дзесяць патрулёў і пастоў праверыла, і ён паводзіў сябе зусім спакойна. А тут як бы спалохаўся.

— Слухайце, Саша... Калі што якое, я буду біцца з імі... Кулакамі... А вы ганіце каня... Ганіце што ёсць сілы. Я не дам ім страляць, калі іх толькі двое.

Саша не разумела: чаму, навошта?

— Пад намі, у дошцы, друкарскі шрыфт і ў хамуце сёетое... Ганіце! — Ён перадаў ёй лейцы і пугу.

У тых дваіх зброі не было відаць. Але адзін з іх, малодшы, даволі энергічна спыніў каня.

— Зноў праверка? — спытаў Лялькевіч.

— Конь нам твой патрэбен,— лагодна адказаў другі, з маладымі вачамі, але густой чорнай барадой.

Лялькевіч спрытна скочыў з саней, закульгаў.

— Браток, родненькі, пашкадуй. Ад каго забіраеш? Паглядзі, якая ў мяне нага. Дзеці галадаюць. Конік гэты на сем двароў, і збруя чужая. Што мне людзі скажуць? Скажуць: каня прадаў.

— Не скажуць.

— Не дам. Мёртвы лягу, а не дам! Жонка, прасі! Галасі, Саша! Як дзецям крупы панясём? — Пра соль ён пабаяўся сказаць.

Але Сашы было цяжка галасіць.

Барадаты стукнуў сябе кулаком у грудзі.

— Зразумей! Вось як,— ён правёў далоняй па шыі,— нам конь патрэбен. Не для забаўкі забіраем.

У гэты час малады пачаў энергічна распрагаць. Убачыўшы, што яны маюць намер забраць аднаго каня, без саней, Лялькевіч супакоіўся, але прытворна залямантаваў. (Пасля Саша напамінала яму гэтае галашэнне, і яны разам смяяліся.)

— Ой, людцы, ратуйце! Рабуюць! Саша, родная, гінем! На чым бочкі вазіць будзем? Дзеці з голаду памруць! Не дам! Мёртвым лягу.— Схапіўся ён за аброць.

— Мёртвым не ляжаш, а па спіне атрымаеш,— спакойна адказаў той, што распрагаў.— Адыдзі!

— Хамут! Хамут хоць аддайце! Чужы!

— Аддай ты яму хамут, гэтай бабе! Жанчына маўчыць, а ён скуголіць, як сабака. Брыдка слухаць. Можа, сам сабе нагу скалечыў, каб на фронт не ісці.

Малодшы зняў і шыбануў яму пад ногі хамут.

— На! Не хамут, а чорт ведае што! Пуд важыць. Каня мог скалечыць. Гаспадар!

Без лішніх слоў яны хутка пайшлі па няўезджанай лясной дарозе, у бок ракі, і зніклі за дрэвамі. Камісар доўга глядзеў ім услед. Ціха засмяяўшыся, з захапленнем сказаў:

— Нашы, чэрці. А сказаць нельга. Вось жа недарэчная гісторыя. Навошта ім так пільна конь спатрэбіўся?

— Можа, таварыш дзе ранены ляжыць.

— Але... Магчыма. Магло здарыцца, што свайго каня загналі. У партызанскай справе ўсё бывае. Вось якія пара-

доксы здараюцца. Сваё ў свайго забралі — і маўчы. Ах, чэрці! «Мёртвы, кажа, не ляжаш, а па спіне атрымаеш...» Гуманісты! Што ж, Аляксандра Фёдараўна. Прыйдзецца нам і за каня паслужыць. Дацягнем да пасёлка, а там, можа, добрая душа злітуецца — дасць каня.

Саша ўзялася за адну аглоблю, ён — за другую. Сані зрушыліся лёгка, але ўжо метраў праз сто Саша зразумела, што гэта пакутліва цяжка, асабліва для камісара з яго самаробным пратэзам. Дарога была няроўная, слізкая, з ухабамі, сані кідала з боку на бок. Яна ўбачыла, як на лбе ў Лялькевіча выступілі буйныя кроплі поту, і ведала, што гэта не ад натугі, а ад болю.

— Вам цяжка, Уладзімір Іванавіч? — спытала яна.

— Не, нічога.

— Давайце пачакаем. Можа, ехаць хто будзе.

— Не, не будзем чакаць. К чорту! А то і сані могуць забраць. А ў санях у нас скарб.

Міма прайшла машына з немцамі. Салдаты паказалі пальцамі на іх і весела зарагаталі.

Лялькевіч спыніўся, цяжка дыхаючы.

— Гэта страшна. З каго яны смяюцца? З інваліда...

Лялькевіч знясілена сеў на сані. У гэты момант Саша адчула нейкую асаблівую душэўную блізкасць да гэтага чалавека. Знікла ўсё асабістае — злосць, раздражненне, здаліся дробнымі, нікчэмнымі ўсе ўласныя сумненні і ўчарашнія жарты, з'явіліся нейкія зусім новыя пачуцці, бо ў аснове іх было тое вялікае, галоўнае, што радніла, збліжала іх у барацьбе.

— Змарыўся? — ласкава і ўпершыню на ты сказала яна і сама хусткай выцерла пот з яго лба. Ён апусціў вочы, бо ў іх бліснулі слёзы.

Потым ім зноў пашанцавала: іх дагнаў начальнік атрада паліцыі — Гусеў. Ён ехаў у распісаным паводле рускага ўзору вазку на пары добрых стаеннікаў у суправаджэнні двух паліцаяў.

— Што здарылася, салдат?

— Ды вось выйшлі нейкія з лесу і каня забралі.

— Партызаны? — спалохана азірнуўся начальнік.

— А чорт іх ведае, хто яны такія!

— Партызаны, вядома. Бачыш, якія яны бандыты. Ты павінен усім расказаць пра гэты факт.

— Ды ўжо ж! Я ім ніколі не дарую!

— Правільна! Ну, чапляйся хутчэй. Давязу.

Калі стаеннікі ўскач ірванулі з месца, Лялькевіч тузануў Сашу за руку і прашаптаў:

— Вось бачыце. Не бывае ліха без дабра.

X

Шумела бурная вясна. Рэчка разлілася так шырока, як не разлівалася ўжо многа год, вада падышла пад самыя хаты, а школа апынулася на выспе. У другі канец вёскі і ў лес ездзілі на лодках.

Данік прывёз першы гладышык бярозавага соку. Саша, даўшы пакаштаваць соку Ленцы, панесла рэшту Лялькевічу, які бандарнічаў пад паветкай. У двары яе асляпіла сонца — мора сонца. І зачараваў гоман шпакоў. Уладзімір Іванавіч і Данік нарабілі шпакоўняў, і цяпер здавалася, што шпакі з усяго наваколля пасяліліся на іх сядзібе. Па-вясноваму вясёлыя, клапатлівыя, закаханыя адно ў аднаго пары птушак завіхаліся кожная каля сваёй хаткі, ладзячы гнёзды і пільнуючы (адзін адлятае — другі застаецца), каб які-небудзь агрэсар не захапіў шпакоўні.

Саша доўга назірала за імі. Шчаслівыя шпакі! Ім невядома, што ў свеце лютуе вайна, што кожную гадзіну гінуць тысячы людзей і разбураецца шчасце. А навакол усё ажывае ў прыродзе, цягнецца да святла, радуецца цеплыні. Сашы здаецца, што яна чуе, як малады клён, што расце пад акном, п'е сок зямлі. Струменіць сок і ў яблынях і ў кусце бэзу. Вось такі, жывы, празрысты, пахучы, што іскрыцца ў гладышку... І ў яе самой пачынае хутчэй струменіць кроў, мацней біцца сэрца... Што яна хацела зрабіць? Нешта добрае. Ага, напаіць гэтага працавітага чалавека, які, здаецца, ніколі не адпачывае. Яна пайшла пад паветку.

— Бярозавік. Хочаце?

Лялькевіч кінуў гэблю і ўзяў гладышык.

— Дзякую, Саша.

Ён выцер рукавом пот і, закінуўшы галаву, пачаў піць, павольна, смакуючы кожны глыток. З ласкавай, амаль мацярынскай усмешкай Саша сачыла, як ён п'е. Струменьчыкі пацяклі па барадзе, закапалі на гімнасцёрку, якую яна многа разоў мыла і кожны раз намервалася адрэзаць гузікі з зорачкамі, каб не прыдраўся які-небудзь фашыст, але так і не адрэзала — пашкадавала. Кропля ад соку трапіла на адзін з такіх гузікаў, і зорка загарэлася, заіскрылася, прыкаваўшы яе позірк.

Ён адняў гладышык ад рота, прычмокнуў.

— Змарыўся? — ласкава спытала Саша, гэтак жа, як паўмесяца назад, калі яны цягнулі сані.

Ён паглядзеў на яе неяк дзіўна, паставіў гладышык на вярстак і раптам... абняў яе. Пачаў цалаваць.

— Саша... слаўная... Я люблю... люблю... люблю...

Інстынктыўна, у нейкім парыве яна на момант сашчапіла свае рукі ў яго на шыі, але тут жа схамянулася і моцна адштурхнула яго; ён ледзь утрымаўся на нагах. У яе гнеўна раздзьмуліся ноздры, на шчоках з'явіліся пунсовыя плямы.

— Уладзімір Іванавіч! — сказала яна так гучна, што ён спалохана азірнуўся — не пачулі б суседзі — і замахаў рукой. Але яна забылася на асцярожнасць.— У мяне дачка... і муж. Я кахаю свайго мужа... Я чакаю яго. І вы выкіньце з галавы! Ні на што не спадзявайцеся... Чуеце? Уладзімір Іванавіч!..

— Чую, Аляксандра Фёдараўна. Даруйце...

А навакол шумела вясна. Радавалася ўсё жывое. Толькі людзі не маглі радавацца. Людзі ваявалі.

1957